Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

4 ВЕРАСНЯ 2014 г. ЧАЦВЕР № 167 (27777) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Беларускія хвоі ў калмыцкай паэзіі

СТАР. 7

Сямейная газета

Ганна Харланчук-Южакова — актрыса і шматдзетная маці

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір АМАРЫН, першы намеснік міністра фінансаў:

«Павышэнне стаўкі падаходнага падатку з 12% да 13% прадугледжана ў праекце закона аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Падатковы кодэкс Беларусі. Законапраект таксама прадугледжвае павелічэнне стаўкі акцызаў на ўсе групы падакцызных тавараў. У прыватнасці, на алкаголь, у тым ліку на моцны, — на 10%, на тытунёвыя вырабы — на 15-30% з захаваннем трох цэнавых сегментаў, што дазволіць павялічыць падатковую нагрузку на больш дарагія цыгарэты. Акцызы на аўтамабільнае паліва прапануецца падняць у сярэднім на 10% з дыферэнцыяцыяй ставак у залежнасці ад экалагічнага класа. Плануецца павялічыць стаўку падатку на прыбытак для банкаў і страхавых арганізацый з 18% да 25%, падняць стаўкі зямельнага падатку і падатку на нерухомасць у дачыненні да дзяржаўнай маёмасці, якая неэфектыўна выкарыстоўваецца. Гэтыя і іншыя меры ў галіне падатковай палітыкі ў 2015 годзе накіраваны на забеспячэнне стабільнасці падатковай сістэмы і павышэнне ўстойлівасці бюджэту».

ISSN 1990 - 763X

Разам у Гару,

або Незвычайнае жыццё ў незвычайнай вёсцы

Вёска Гара Віцебскага раёна — гэта ўнікальнае паселішча, якое адраджаюць гарадскія жыхары. Яны з задавальненнем пераязджаюць у глуш, дзе няма крамы, пошты і клуба, каб жыць не так, як жыве пераважная большасць з нас. Сёння ў Гары ўжо больш за 10 сямей, у якіх выхоўваюцца 9 дзяцей дашкольнага ўзросту. Самы малы «горац» нарадзіўся вясной.

СТАР. 6

Музыкант Аляксандр і Наталля.

■ Падарунак да свята

ПА-СКАРЫНАЎСКУ!

Беларусы першымі ў свеце стварылі кнігу па старажытных тэхналогіях

Сёлета да Дня беларускага пісьменства і друку мы маем вельмі арыгінальны, прыемны падарунак. Пад кіраўніцтвам і па ідэі калекцыянера, гісторыка Уладзіміра ЛІХАДЗЕДАВА надрукавана старажытным спосабам і будзе прадстаўлена шырокай грамадскасці першая кніга Бібліі Францыска Скарыны.

Падкрэслім, што гэта не факсімільнае перавыданне, а арыгінальная, хоць і новастворaная кніга. Уладзімір Ліхадзедаў расказаў, што хацелася зрабіць штосьці незвычайнае да свята пісьменства і друку — так і з'явілася ідэя аднаўлення першай кнігі першадрукара. Каб увасобіць задуму ў жыццё, даследчык стаў вывучаць гісторыю друкарскай справы. «Хадзіць па слядах Скарыны», — як ён сам адзначыў. Ліхадзедаў наведаў музеі друкарскай справы ў Базылі, Лейпцыгу, глядзеў, якім быў калісьці друкарскі варштат, высвятляў, з чаго рабілі паперу.

Фота БЕЛТА.

Толькі сабраўшы дастатковую навуковую базу, прыступілі да працы. Друкарскі станок аднавілі па гравюры XVI стагоддзя. Станок атрымаўся цалкам сапраўдным — падобных яму ў свеце ўсяго некалькі. Паперу таксама зрабілі самастойна — з ільну, метадам чарпання, як і ў старажытнасці. Такім чынам было надрукавана сем экзэмпляраў першай кнігі Бібліі — Быцця — якія адпавядаюць гістарычным аналагам.

Стваральнікі кнігі вагаліся наконт афармлення вокладкі. Спачатку спрабавалі зрабіць скураны пераплёт. Аднак знешні выгляд атрымліваўся занадта сучасным. Да таго ж пераплётам вокладкі ў старажытнасці часта займаліся майстры, якія не мелі дачынення да самога друкавання. Таму ў выніку пошукаў спыніліся на мяккім пераплёце кнігі — такі Ліхадзедаў бачыў у музеі ў Базылі. Таксама было вырашана расфарбаваць вокладкі кніг. Гэта даручылі зрабіць мастаку Барысу Цітовічу: тыя малюнкі, якія былі ўнутры выданняў Скарыны, перанеслі на вокладку.

СТАР. 2

ДАРОЖНАЯ КАРТА

Будаўніцтва другой кальцавой вакол сталіцы павінна быць завершана да пачатку 2017 года

Адпаведнае даручэнне Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка даў учора падчас наведвання ў Мінскім раёне будаўнічай пляцоўкі другой кальцавой аўтадарогі, паведамляе БЕЛТА.

Кіраўніку дзяржавы далажылі аб ходзе будаўніцтва, пры якім выкарыстоўваецца сучасная тэхналогія кладкі цэментна-бетоннага пакрыцця. Будаўніцтва вядзецца ў некалькі этапаў, і кальцо будзе ўключаць у сябе як дзеючыя ўчасткі аўтатрас, так і новыя, а таксама рэканструяваныя да параметраў I катэгорыі. Цяпер работы ідуць на ўчастку першага этапу будаўніцтва ад аўтадарогі М-3 Мінск—Віцебск да М-6/Е 28 Мінск—Гродна—мяжа Рэспублікі Польшча. Працягласць гэтага ўчастка складае больш за 46 км, і ён падзелены на некалькі чэргаў. «У будучым годзе да гродзенскага напрамку ўся дарога павінна быць пабудавана, — сказаў Прэзідэнт. — І затым на ўчастак да перасячэння з маскоўскай дарогай у вас застанецца яшчэ год — максімум паўтара».

Асобна Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу на неабходнасці разумнага падыходу пры праектаванні дарожнага будаўніцтва і недапушчэння празмернасцяў, неабгрунтаваных трат фінансавых рэсурсаў. У гэтым жа ключы было дадзена даручэнне і кантралюючым органам, якія павінны правяраць рэальны кошт работ ужо на этапе будаўніцтва.

Прэзідэнт таксама запатрабаваў надаць максімум увагі будаўніцтву і рэканструкцыі транзітных аўтатрас краіны. Як адзначыў кіраўнік дзяржавы, з прычыны падзей, якія адбываюцца ва Украіне, яшчэ больш узрасла значнасць Беларусі ў якасці транспартнага калідора, які будзе звязваць Захад і Усход. «Калі мы прапануем добрую дарогу ў трох-чатырох напрамках, адбою не будзе, і мы будзем мець добрыя грошы за транзіт. Нам акупяцца ўсе ўкладанні. Чым хутчэй мы гэта зробім, тым лепш», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў свой час ён ставіў падобную задачу ў сферы развіцця аграпрамысловага комплексу, каб забяспечыць харчаваннем не толькі насельніцтва Беларусі, але і мець магчымасць пастаўляць значныя аб'ёмы на экспарт. У выніку, у тым ліку з улікам цяперашняй сітуацыі ў рэгіёне, гэтае рашэнне апраўдала сябе.

Кіраўніку дзяржавы далажылі аб планах па рэканструкцыі і ўзвядзенні рэспубліканскіх дарог у перыяд 2015-2019 гадоў. Агульная працягласць рэканструкцыі і ўзвядзення такіх дарог складзе больш за 400 км, з іх па параметрах першай катэгорыі — звыш 330 км. У прыватнасці, абмяркоўвалася завяршэнне рэканструкцыі аўтадарогі ад Мінска да Гомеля на ўчастку Бабруйск—Жлобін, будаўніцтва сучаснай аўтатрасы на Гродна і рэканструкцыя іншых участкаў дарог. Асабліва Прэзідэнт указаў на важнасць у якасці транзітнага напрамку аўтадарогі на Палессі, якая злучае Гомель і Брэст.

МКАД-2

Будаўніцтва другой кальцавой аўтадарогі вакол Мінска плануецца ажыццявіць у два этапы:



ПА-СКАРЫНАЎСКУ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Фота БЕЛТА.

Фота БЕЛТА.

Па словах **Уладзіміра ЛІХАДЗЕДАВА,** дагэтуль ў свеце па старажытных тэхналогіях перавыдаваліся толькі асобныя старонкі. А тое, што цэлая кніга выдадзена аўтэнтычным спосабам, — гэта прэцэдэнт. Мы аказаліся першымі.

Кніга займела высокую ацэнку экспертаў з Санкт-Пецярбурга, Масквы, а таксама прадстаўніка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алеся Сушы. Яны з жартам заўважылі, што ў кнігі толькі адзін «недахоп»: яна новая!

Госці свята беларускага пісьменства ў суботу 6 верасня змогуць не толькі ўбачыць гэтыя перавыдадзеныя кнігі Скарыны, дакрануцца да іх, адчуць водар ільняной паперы — увесь тэхналагічны працэс будзе прадстаўлены ў спецыяльным павільёне ў Заслаўі. Кожны ахвотны зможа сам аддрукаваць старонку па скарынаўскай тэхналогіі. Таксама можна будзе назіраць, як ствараецца папера метадам чарпання.

На прэс-канферэнцыі, дзе журналістам прэзентавалі новую кнігу Бібліі, **намеснік міністра інфармацыі Уладзімір МАТУСЕВІЧ** акцэнтаваў увагу на тым, што на гэтыя выхадныя варта паехаць у Заслаўе:

— За час свайго правядзення свята беларускага пісьменства набыло сапраўды агульнанацыянальны характар і стала асяродкам беларускай духоўнасці, культуры і друкаванага слова. Прайшоўшы праз усю Беларусь, сёлета, ужо ў другі раз яно завітала ў старажытнае Заслаўе. Гэта горад з даўняй гісторыя, у якім яскрава адчуваецца подых часу. Сёлета ўпершыню свята паўнавартасна будзе праходзіць на працягу двух дзён — 6 і 7 верасня. Урачыстае адкрыццё адбудзецца ў суботу ў 20.30. Фестываль кнігі, прэзентацыя сродкаў масавай інфармацыі, выдавецтваў, адкрыццё помніка князю Ізяславу, адкрыццё парку культуры і адпачынку, сустрэчы з пісьменнікамі — гэта далёка не поўны пералік запланаваных падзей. 7 верасня на галоўнай сцэне Заслаўя пройдзе ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў Рэспубліканскага конкурсу на лепшы літаратурны твор 2013 года.

Паралельна з Заслаўем у суботу ў Мінску ў 10.00 у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі пройдзе міжнародны «круглы стол» на тэму «Сугучча. Літаратура як люстэрка эпохі». Спецыяльна для ўдзелу ў ім у беларускую сталіцу з'едуцца пісьменнікі з Сербіі, Азербайджана, Малдовы, Расіі і іншых краін. Дарэчы, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь Карлюкевіч будзе мадэратарам гэтай міжнароднай сустрэчы літаратараў.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

■ Шлях бласлаўёны

Дабрадатны агонь ад Труны Гасподняй да Заслаўя давядзе

Беларускае слова «асвета» — цудоўнае. Глыбокае і напоўненае — столькі сэнсаў укладзена. Асвета праз веды — гэта як святло, якое носіць чалавек у сабе і дзеліцца з ім іншымі.

Так у нас было стагоддзямі: усе беларускія вялікія (і невядомыя, якія пэўна ж былі) асветнікі, атрымаўшы іскрынку ведаў пра жыццё, неслі яе ў свет і распальвалі вялікае святло адукаванай і напоўненай душэўным святлом зямлі. Неслі веды пра наш зямны свет і тое, з якой ласкі ён устроены і заселены рознымі істотамі, а вянцом гэтага свету з'яўляецца чалавек. А яму ўласціва імкненне не блукаць у цемры — як рэальнай, так і духоўнай.

Беларусь XXI стагоддзя працягвае шлях, пачаты асветнікамі. А святло рэальнае (дзеля духоўнага) вось ужо 21 год нам дадзена ад Труны Гасподняй праз Дабрадатны агонь, які праносяць па краіне. Дзеля гэтага наладжана экспедыцыя «Дарога да Святыняў», якая адбываецца ў першы тыдзень месяца, напярэдадні вяршыні свят нашай асветы — Дня беларускага пісьменства.

Дваццаць першая навукова-асветніцкая экспедыцыя «Дарога да Святыняў» стартавала ўчора ў Мінску ад Свята-Духава кафедральнага сабора і завершыцца 7 верасня ў Заслаўі. Сёлета маршрут пройдзе праз Мінскую, Брэсцкую, Гродзенскую вобласці. Дабрадатны агонь прынясуць у некаторыя манастыры, вялікія і маленькія храмы і цэркаўкі. Напрыклад, каля вёскі Загор'е Баранавіцкага раёна ў 1983 годзе быў яўлены цудатворны абраз Пакрова Прасвятой Багародзіцы (Сталавіцкі), які з'яўляецца шляхаводным для экспедыцыі. Падчас экспедыцыі адбываюцца малебны і набажэнствы — напрыклад, сёлета — каля Крыжа Памяці і Каменя Пакаяння. Але сам агонь ад Труны Гасподняй, які дастаўляецца з Іерусаліма, можа запаліцца ў кожнай хаце: па яго можна прыйсці са свечкамі і панесці з сабой.

Сёлета ён напоўніць асаблівым святлом храм Святой Тройцы у вёсцы Вялікая Сваротва Баранавіцкага раёна, храм Аляксандра Неўскага у вёсцы Загор'е-Сененскае Навагрудскага раёна. У самім Навагрудку экспедыцыю з агнём ад Труны Гасподняй сустрэнуць у саборы Міколы Цудатворца і храме Кірылы і Мяфодзія. Яго чакаюць у Свята-Елісееўскім Лаўрышаўскім мужчынскім манастыры. А ў вёсцы Вялічкі Лідскага раёна Дабрадатны агонь асвеціць падвор'е Свята-Благавешчанскага жаночага манастыра. На Валожыншчыне экспедыцыя завітае ў храм роўнаапостальных Канстанціна і Алены, на Маладзечаншчыне — у храм прарока Ільі ў Радашковічах.

У Мінскай вобласці экспедыцыю з Дабрадатным агнём сустрэнуць у пасёлках Калодзішчы і Ждановічы. У Заслаўі святло агню асабліва чакаюць прыхаджане храма Сабора беларускіх святых і храма Праабражэння Гасподняга. Але яго там наогул асабліва чакаюць — кожны чалавек (не толькі вернікі) у гэтыя дні можа разважаць пра тое, што ёсць святло ў яго жыцці і адкуль яно прыходзіць. Таму што насамрэч падчас экспедыцыі Дабрадатны агонь прыносяць у школы, бальніцы, сацыяльныя ўстановы. Людзі, якія ў складзе экспедыцыі (а гэта пісьменнікі, артысты, навукоўцы, святары) распавядаюць пра святло асветы, іскрынка якога, можа быць, у гэтыя дні запаліцца ў нечых сэрцах, каб потым гарэць на радасць іншым. І вось жа — блаславенне на гэты шлях!..

Ларыса ЦІМОШЫК

Фота БЕЛТА.

■ Кніжны свет

НАША ПАЛІЦА

Кнігі Выдавецкага дома «Звязда» прадстаўлены на міжнароднай выставе ў Маскве

Міністэрства інфармацыі Беларусі прадставіла нацыянальны стэнд на 27-й Маскоўскай міжнароднай кніжнай выставе-кірмашы. Яго прэзентацыя адбылася ўчора адразу ж пасля афіцыйнага адкрыцця кніжнага форуму, паведамляе БЕЛТА.

Як адзначыў на цырымоніі адкрыцця стэнда саветнік-пасланнік Пасольства Беларусі ў Расіі Павел Лёгкі, Беларусь традыцыйна прадстаўляе ў Маскве дасягненні айчыннага кнігавыдання. Вось і на гэты раз беларуская дэлегацыя прывезла ў Маскву больш за 600 найменняў кніг, выпушчаных выдавецтвамі «Беларусь», «Выдавецкі дом «Беларуская навука», «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі», «Вышэйшая школа», «Мастацкая літаратура», «Народная асвета», «Выдавецкі дом «Звязда», «Пачатковая школа», «Адукацыя і выхаванне», Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, РУП «Белкартаграфія», а таксама ААТ «Паліграфкамбінат імя Якуба Коласа».

У гэтым годзе арганізатары беларускага стэнда зрабілі акцэнты на трох тэмах. Перш за ўсё гэта 70-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Акрамя таго, на стэндзе вылучаны выстава Уладзіміра Ліхадзедава «У пошуках страчанага», прысвечаная Першай сусветнай вайне, і выдавецкія праекты Саюзнай дзяржавы.

На маскоўскім кірмашы Беларусь прадставіла кніжныя навінкі шырокага спектру розных тэматычных кірункаў: вучэбная, вучэбна-метадычная, навуковая, навукова-папулярная, даведачная, энцыклапедычная, дзелавая літаратура, літаратурна-мастацкія і дзіцячыя выданні. Акрамя таго, беларускія кнігі прадстаўлены таксама ў рамках арганізаванага Асацыяцыяй кнігавыдаўцоў Расіі Славянскага кніжнага свята.

■ Чытачы — пра пісьменства

НАША МОВА — ЯК ПЕСНЯ

Мяне вельмі хвалюе, чаму некаторым людзям здаецца, што замежная мова — гэта «крута», а вось свая, беларуская, — і вясковая, і непрэстыжная, і дужа простая...
Але ж вы толькі прыслухайцеся: яна ж гучыць, як песня: «Ой, рэчанька, рэчанька, чаму ж ты няпоўная?..», альбо «Сёння ў нашай хаце свята, калі ласка, у нашу хату!..» Вось гэтае «рэчанька», вось гэтае «калі ласка» — яно ж як бальзам на душу, яно ж не вымаўляецца — пяецца.

Я разумею: валодаць замежнымі мовамі трэба. Гэта прыкмета адукаванасці, культуры. Але ж, калі ідзеш па горадзе і бачыш шыльды на розных іншых мовах, але толькі не на сваёй, робіцца не па сабе. Міжволі думаеш: нам што, каб назваць нейкую краму ці фірму, не хапае сваіх слоў?

Не менш балючае пытанне пра песні. Няўжо іх, нашых, беларускіх, таксама бракуе? Думаю, не. Тады чаму артысты выконваюць замежныя? І дзеткі следам за імі. Яны хоць разумеюць, пра што спяваюць?

Я лічу, трэба паважаць сваю мову, свае песні, бо нашы ніколечкі не горшыя! Бо яны — родныя. Памятаю, неяк раз глядзела музычную праграму, і там маленькі хлопчык спяваў: «Чуб у мяне русы-русы, тата з мамай беларусы!»... Думаю, вось з гэтага і трэба пачынаць выхоўваць чалавека, каб ён ганарыўся сваёй нацыяй і ўсім сваім, а не чужым.

Лідзія ЛУК'ЯНАВА,
в. Швабы, Лагойскі р-н.

«СВОЙ ХРАМ МЫ БУДАВАЛІ СТАГОДДЗЯМІ...»

У прыродзе кожная жывая істота гаманіць на сваёй мове — такая воля Усявышняга.
Сваёю мовай і самабытнай культурай адметны і слаўны кожны народ. Не існуе кепскіх моў! Ёсць гультаяватыя, чэрствыя і абыякавыя іх носьбіты.

Беларуская народная мова ўвабрала ў сябе сокі і соль зямлі; шум зялёных дуброў і журчанне жыватворных крыніц; шапаценне лістоты і пяшчоту дзіцячага лепятання; навальнічныя сполахі і грымотныя стрэлы... У ёй людская мудрасць, горкі досвед жыцця, нястомная праца і глыбокая любоў шматлікіх пакаленняў простага люду і волатаў Слова — самаахвярных пісьменнікаў.

Святыя Кірыла і Мяфодзій прабудзілі славянскія народы — далі ім літары і азбуку. Асветнік Скарына — палымяны патрыёт роднай зямлі — стаў беларускім першадрукаром. Багушэвіч, Купала, Колас і іх паплечнікі загаварылі са сваім народам на літаратурнай мове.

Беларуская мова даспадобы прадстаўнікам шмат якіх народаў. Але зручней за ўсё на ёй гаварыць з Богам.

Свой храм — мову — беларусы будавалі стагоддзямі, часам на ўласнай крыві.

Валоданне замежнымі мовамі разумова ўзбагачае чалавека. Веданне роднай — узвышае духоўна.

Я трымчу перад веліччу і ўсемагутнасцю Бога. Я нямею перад таямніцай і неабдымнасцю Сусвету. Я трымчу і нямею, калі разважаю над незайздросным лёсам і цудадзейнай сілай роднай мовы.

Мова — ахоўная грамата Бога, дадзеная беларусам. Мова — святы абярэг кожнага, хто жыве на гэтай зямлі. Усе народы, не тоячыся, пастаянна гавораць аб прыгажосці сваіх моў, дэманструюць іх, і толькі беларусы ўсё яшчэ ціха спрачаюцца аб патрэбе яе вывучэння...

Алесь МАКОЎСКІ,
пісьменнік

ДЛЯ ЗВАРОТАЎ ZVAROT@ZVYAZDA.MINSK.BY

ГАРАДОК МОЖА СТАЦЬ СПАДАРОЖНІКАМ

Будучая сталіца рэспубліканскіх «Дажынак», якія пройдуць на Віцебшчыне, — Гарадок — можа стаць горадам-спадарожнікам абласнога цэнтра. Гэтую ідэю ў Гарадку агучыў старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр КОСІНЕЦ.

Ён браў удзел у святкаванні Дня ведаў у гарадоцкай сярэдняй школе №1. Тут атрымліваюць веды на працягу больш чым 35 гадоў. Капітальны рамонт школы, як і камп'ютарны клас і інтэрактыўная дошка (прэзент аблвыканкама), сталі добрымі падарункамі для дзяцей і іх бацькоў.

Згаданая вышэй навучальная ўстанова — толькі адзін з аб'ектаў сацыяльнага прызначэння Гарадка, які атрымаў другое жыццё напярэдадні «Дажынак».

Свята працаўнікоў вёскі Прыдзвінскага краю тут пройдзе 26-28 верасня.

У райцэнтры пасля рамонту і мадэрнізацыі плануецца адкрыццё кінатэатра, Дома культуры, музея, дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы, крам і кавярняў. Рамантуюцца і ўцяпляюцца жылыя дамы. Што тычыцца спартыўных збудаванняў, з часам у Гарадку з'явяцца крытая хакейная пляцоўка, басейн. А ўнікальная лыжароллерная траса стане спартыўнай візітнай карткай не толькі Віцебшчыны. Кліматычныя ўмовы дазволяць праводзіць на будучай трасе трэніроўкі і спаборніцтвы тады, калі на аналагічных беларускіх трасах ужо няма снегу.

Кіраўніцтва аблвыканкама паставіла задачу — стварыць у Гарадку філіялы і прадстаўніцтвы віцебскіх прадпрыемстваў. У тым ліку і камерцыйных. Калі будзе дастойная праца і добры заробак, навошта імкнуцца працаваць у абласным цэнтры ці суседняй Расіі? Каб працэс пераўтварэння райцэнтра ў спадарожнік не зацягваўся, кіраўнікам віцебскіх прадпрыемстваў і арганізацый даручана праводзіць у Гарадку адпаведную работу.

Аналагічным чынам змогуць развівацца і атрымаць новы статус і іншыя гарады — напрыклад, Лёзна, Шуміліна, якія знаходзяцца на адлегласці каля 40 кіламетраў ад Віцебска.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Фота Аляксея СМІРНОВА.

СЛУЖБА ПАЧЫНАЕЦЦА З ПРЫСЯГІ

Для школьнікаў і студэнтаў навучальны год пачынаецца з Дня ведаў, але вось для курсантаў пачаткам навучання з'яўляецца прыняцце прысягі. Хваляванне і гонар будучых вайскоўцаў, якія рыхтаваліся да аднаго з найважнейшых дзён у іх прафесійнай кар'еры, здавалася, было адчувальна фізічна. Прымалі прысягу курсанты першага курса Ваеннай акадэміі Беларусі і ваенных факультэтаў іншых ВНУ. Такім чынам, толькі «першакурснікаў» на пляцы было больш за 650.

У час прысягі курсант павінен выглядаць ідэальна, «з іголачкі», таму дапамагалі маладым ваенным іх старэйшыя калегі. Старшакурснікі пільна сачылі за тым, каб знакі, шаўроны і пагоны былі прышыты роўна, а абутак блішчаў. Камусьці папраўлялі каўнерык, падказвалі, як правільна трымаць зброю. Часам прыходзілася рабіць заўвагі курсантам, якія не прывыклі яшчэ да ваеннай дысцыпліны.

Шырокімі крокамі да прысягі.

Зачытваць прысягу трэба гучна і з гонарам.

Усе жадалі пакінуць у памяці гэты момант.

Курсанты, здаецца, нават не дыхалі падчас выступлення афіцэраў.

Квінтэсэнцыяй мерапрыемства былі, безумоўна, прысяга і ўрачыстая клятва «Служу Рэспубліцы Беларусь!». Каля пляца стаялі бацькі і родныя курсантаў. Як толькі ўсе традыцыі і абавязкі былі выкананы, ім дазволілі павіншаваць будучых ваенных. Такімі сваіх дзяцей яны, напэўна, яшчэ не бачылі.

Сяргей НІКАНОВІЧ. Фота аўтара.

■ На дыпламатычнай хвалі

МОСТ ДАЎЖЫНЁЙ 7 ТЫСЯЧ КІЛАМЕТРАЎ

Як карэйцы называюць наш БелАЗ і што ў нас з імі агульнага

Беларускае пасольства ў Сеуле называе сябе своеасаблівым мостам паміж геаграфічна далёкімі Беларуссю і Карэяй. Аднак Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол нашай краіны ў Карэі Наталля ЖЫЛЕВІЧ лічыць, што адлегласць не такая вялікая, як можа падацца. Аб гэтым яна распавяла ў гутарцы з карэспандэнтам «Звязды».

— Наталля Іванаўна, складана працаваць у мясцінах, дзе сонца ўзыходзіць, калі на радзіме яшчэ толькі кладуцца спаць?

— Да розніцы ў часе прывыкаеш хутка. Ужо праз некалькі дзён звыкла падлічваеш, у які час зручней звязацца з калегамі ў Мінску.

Нягледзячы на значную геаграфічную аддаленасць, Беларусь і Карэя, на мой погляд, маюць шмат агульнага ў культуры і гісторыі, што прадвызначае нашу падобнасць. Знаходзячыся ў Карэі, не адчуеш сябе чужым.

З карэйскімі партнёрамі, як і ўсюды, добра працаваць, калі ёсць узаемная зацікаўленасць. Дарэчы, з моманту ўсталявання дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Карэя ў 1992 годзе мы дасягнулі добрага ўзроўню ўзаемадзеяння. Паміж нашымі краінамі падпісаны асноўныя міжурадавыя дагаворы ў сферы эканомікі, навукі і тэхналогій, абароны інвестыцый, культуры. Практычнае супрацоўніцтва нашых ведамстваў грунтуецца на трох дзясятках міжведамасных дагавораў у самых розных абласцях — ад СМІ, адукацыі, фізічнай культуры і спорту да ліквідацыі наступстваў надзвычайных сітуацый. Дзейнічае двухбаковы Сумесны камітэт па эканамічным, гандлёвым і тэхнічным супрацоўніцтве. Ужо 7 гадоў працуе Пасольства Рэспублікі Карэя ў Мінску, пачало працу прадстаўніцтва Карэйскага агенцтва садзейнічання гандлю і інвестыцыям у Беларусі.

Толькі адна Дар'я Домрачава падчас сваёй фенаменальнай перамогі ў Сочы за тры дні сабрала звыш ста публікацый у СМІ Карэі.

— Як часта вы прыязджаеце ў Беларусь?

— Як правіла, дома бываю адзін раз у год, калі праводзяцца нарады і семінары з удзелам кіраўнікоў замежных устаноў Беларусі.

Сучасныя сродкі сувязі дазваляюць падтрымліваць пастаянны кантакт як з калегамі па працы, так з роднымі і блізкімі. У Карэі сёння лепшыя ў свеце сродкі камунікацыі, якія дапамагаюць нам працаваць.

— Аб чым больш за ўсё сумуеце за 7 тысяч кіламетраў ад дому?

— Сумую больш за ўсё па галоўным мужчыну майго жыцця — маім чатырохгадовым унуку...

— Якое галоўнае адрозненне Сеула ад іншых гарадоў свету?

— Калі прыязджаеш у Сеул, першае, што кідаецца ў вочы, — гэта арганічны сплаў традыцыйнай архітэктуры і самых новых тэхналогій.

А ў астатнім гэта адзін з самых сучасных гарадоў свету, дзе бурліць жыццё — таксама, як і ў Мінску. Асабліва адзначу высокую арганізацыю паўсядзённага жыцця шматмільённага мегаполіса. Дакладна і непрыкметна працуюць камунальныя службы. Нягледзячы на высокую шчыльнасць насельніцтва ў Сеуле, дыскамфорту ад знаходжання ў ім не адчуваеш. На дарогах горада велізарная колькасць аўтамабіляў, але працяглых заторaў няма, што сведчыць пра эфектыўнасць сістэмы кіравання транспартнымі патокамі, ужо даўно ўведзенай у Сеуле. І тут у нас добрая перспектыва для сумеснай працы.

З задавальненнем падкрэслю, што паміж Мінскам і Сеулам існуе дагавор аб супрацоўніцтве дзвюх сталіц. Мінгарвыканкам падтрымлівае стабільныя кантакты з сеульскай мэрыяй, у тым ліку і ў частцы абмену вопытам арганізацыі жыцця сталіцы.

— У чым самае істотнае адрозненне менталітэту карэйцаў?

— Наўрад ці змагу адказаць на гэтае пытанне адназначна. Даўно ўжо пераканалася ў тым, што людзі ўсюды падобныя адно да аднаго. Іх хвалююць і турбуюць аднолькавыя праблемы. Яны цэняць адны і тыя ж рэчы: сям'ю, дзяцей, здароўе, мір, стабільнасць. Гэта ж магу сказаць і пра карэйцаў.

Мабыць, вылучае іх толькі адно. Не стамляюся дзівіцца іх выхаванасці, ветлівасці, зацятасці, працавітасці. Мае карэйскія знаёмыя часта жартуюць: маўляў, вы, еўрапейцы, працуеце з дзевяці раніцы да пяці вечара, а мы, карэйцы, з пяці раніцы да дзевяці вечара. Гэта так і ёсць. Суседняя будоўля пачынае шумець ужо на досвітку. А карэйскіх службоўцаў пры неабходнасці заўсёды знаходзім на працоўным месцы і пасля афіцыйнага заканчэння працоўнага дня.

Толькі дзякуючы працы і зацятасці ўсёй нацыі Карэя пры жыцці аднаго пакалення з беднай аграрнай краіны ператварылася ў адну з самых багатых індустрыяльных дзяржаў свету і ўвайшла ў «вялікую дваццатку» найбольш развітых эканомік планеты. Заўважу пры гэтым, што карэйскі парламент далёка не з першага разу прыняў закон, які не дазваляе карэйцам працаваць больш за 52 гадзіны ў тыдзень.

І тут мы, па сутнасці, таксама падобныя. Беларусы ўмеюць і любяць добра працаваць. Карэйцы, якія пабывалі ў нас, з захапленнем распавядаюць пра тое, што яны ўбачылі. А гэта ўсё створана працавітымі беларускімі рукамі.

— Як часта на тым краі кантынента прыходзіцца тлумачыць, дзе знаходзіцца Беларусь?

— Бывае, што тлумачу, але мне не раз даводзілася гэта рабіць і ў еўрапейскіх краінах. Гэта залежыць не столькі ад ведання геаграфіі, колькі ад агульнай культуры.

Многае ў нашай краіне для карэйцаў аказваецца нечаканым. Самае вялікае ўражанне на наведвальнікаў выстаў, у якіх удзельнічае наша пасольства, робіць плакат са здымкам легкавога аўтамабіля на фоне шматтоннага «БелАЗа». Мне асабліва падабаюцца шчырае здзіўленне на тварах і пытанні, якія пры гэтым задаюць: «Гэта шматпавярховы дом на колах?» А пасля нашага тлумачэння — абавязковае фота на памяць побач з выявай «БелАЗа».

У цэлым жа дзякуючы супрацоўніцтву са сродкамі масавай інфармацыі дзвюх краін наш цяперашні ўзровень узаемадзеяння ўжо перасягнуў «планку» агульнага сюжэта пра тое, дзе знаходзіцца Беларусь. Размова ідзе пра больш канкрэтныя пытанні двухбаковага супрацоўніцтва.

Мы імкнёмся максімальна выкарыстоўваць усе формы зносін з карэйскімі грамадзянамі, у тым ліку і праз сацыяльныя сеткі. Інтэрнэт-адрас пасольства добра вядомы, і на нашым сайце заўсёды шмат наведвальнікаў — праз Twitter, Facebook, Youtube. Асаблівай папулярнасцю карыстаюцца відэавіншаванні на карэйскай мове, якія рыхтуюць беларускія дзеці для нашых карэйскіх сяброў у сувязі з мясцовымі святамі. Дзякуючы таленту і абаянню нашых маленькіх артыстаў кола сяброў Беларусі прыкметна павялічылася.

— Што пішуць карэйскія СМІ пра Беларусь?

— З асаблівым задавальненнем і гонарам кажу вялікае дзякуй і нізка кланяюся беларускім спартсменам, якія з'яўляюцца галоўнымі беларускімі «зоркамі» карэйскіх СМІ. Толькі «KOTFA» праводзіцца штогод. Сёлета нашаму ўдзелу ў ёй папярэднічала карпатлівая падрыхтоўчая праца пасольства сумесна з Міністэрствам спорту і турызму Беларусі, Замкавым комплексам «Мір» і кампаніяй «Топ-тур».

— Беларусь жа яшчэ рэгулярна ўдзельнічае ў Сеульскім фестывалі дружбы...

— Гэта самае папулярнае ў Карэі культурнае свята з удзелам замежных калектываў. Яно называецца «Прывітанне, Сеул». Сапраўды, карэйцам і гасцям фестывалю вельмі спадабаўся ансамбль «Купалінка» і палюбіўся смак беларускіх дранікаў. Выступленні беларускіх артыстаў не раз называлі найбольш яркімі.

— У якой сферы стасункі з Сеулам развіваюцца найбольш паспяхова?

— Асноўныя кірункі развіцця двухбаковых адносін сканцэнтраваны там, дзе нашы краіны могуць эфектыўна дапаўняць адна адну, рэалізаваць патэнцыял узаемнай зацікаўленасці.

Я ўжо казала пра кіраванне транспартна-лагістычнымі патокамі, транспартнымі сістэмамі. Яшчэ адна вельмі перспектыўная сфера для супрацоўніцтва — электронны ўрад, у развіцці якога Карэя з'яўляецца сусветным лідарам. Карэйская бізнес- супольнасць бачыць у нашай краіне нядрэнныя інвестыцыйныя перспектывы, чаму асабліва спрыяюць інтэграцыйныя працэсы.

На турыстычнай выставе ў горадзе Пусан

Аснову нашага экспарту ў Карэю складаюць калійныя ўгнаенні, шкловалакно, вугляродныя матэрыялы. Асабліва месца займае і паўправаднікавая прадукцыя ААТ «Інтэграл». Беларускія мікрасхемы пастаўляюцца для выкарыстання ў розных электронных прыладах, якія вырабляе шырокі спектр паўднёвакарэйскіх кампаній, уключаючы найбольш вядомыя ў свеце брэнды.

Улічваючы тое, што Карэя з'яўляецца сусветным лідарам у сферы інфарматызацыі, мы актыўна развіваем супрацоўніцтва ў вобласці інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій. Тут мы прапрацоўваем інвестыцыйныя праекты з буйным бізнесам Карэі.

Добра развіваецца супрацоўніцтва па лініі навукі і тэхналогій. Чакаем вынікаў першых беларуска-карэйскіх праектаў у сферы прыкладных даследаванняў, зацверджаных Сумесным камітэтам па эканамічным, гандлёвым і тэхнічным супрацоўніцтве.

Упэўнена, што беларускі інтэлект у спалучэнні з карэйскім вопытам камерцыялізацыі навуковых распрацовак прынясе плён абедзвюм краінам. У Мінску функцыянуе Беларуска-карэйскі цэнтр па супрацоўніцтве ў вобласці адукацыі, навукі і тэхналогій. Штогод да 100 карэйскіх студэнтаў праходзяць стажыроўкі ў беларускіх універсітэтах.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА

■ Супрацоўніцтва

ПРАЕКТЫ ЗА АКІЯНАМ

«Беларуснафта» будзе шукаць «чорнае золата» ў сельве Амазонкі

У бліжэйшыя два месяцы «Беларуснафта» атрымае новы кантракт у Эквадоры. Як паведамляе прэс-служба прадпрыемства, пасля некалькіх раўндаў перамоў у канцы мінулага месяца ў Кіта было падпісана «Пагадненне аб тэхніка-эканамічных умовах геалагаразведкі і распрацоўкі блока №28». Апошняе было дасягнута паміж прадстаўнікамі альянсу «Беларуснафта» — Petroamazonas — ENAP з аднаго боку і сакратарыятам па вуглевадародах Міністэрства па неаднаўляльных прыродных рэсурсах Эквадора з другога.

Падпісанае пагадненне стала апошнім крокам на шляху да заключэння кантракта па геалагаразведцы і распрацоўцы блока №28. У бліжэйшыя два месяцы будуць разгледжаны ўсе яго аспекты: ад юрыдычнага складніка да дэталёвых тэхнічных і эканамічных дадаткаў.

Праект па геалагаразведцы і распрацоўцы блока №28 аб'яднанне «Беларуснафта» рэалізуе разам з эквадорскай кампаніяй Petroamazonas і чылійскай ENAP. Альянс быў створаны ў ліпені мінулага года. Праз некалькі месяцаў, у лістападзе, ён прыняў удзел у адзінаццатым раўндзе дзяржаўнага тэндара Эквадора на атрыманне ліцэнзіі на распрацоўку нафтавага радовішча. Тады на таргі былі выстаўлены чатыры нафтаздабываючыя блокі. Беларуска-эквадорска-чылійскі саюз аформіў заяўку на распрацоўку аднаго з іх — блока №28. Гэтая тэрыторыя прылягае да горнага ланцугу Анд. Агульная плошча блока — 1879 кв.км. Структуры, выяўленыя на яго тэрыторыі, уяўляюць вялікую цікавасць для геолагаў. Аднак праца тут ускладнена тым, што блок №28 размешчаны ў цяжкадаступных умовах сельвы Амазонкі.

Згодна з тэндарам, кампанія-пераможца атрымлівае кантракт, які дае права на геалагаразведку нетраў на працягу чатырох гадоў. Па выніках адкрыцця камерцыйных запасаў нафты кантракт аўтаматычна прадугледжвае дваццацігадовы перыяд распрацоўкі і эксплуатацыі радовішча.

У многім узаемадзеянне ў галіне разведкі і здабычы нафты паміж Беларуссю і Эквадорам пабудавана на вопыце супрацоўніцтва нашай краіны з Венесуэлай. Буйная нафтавая прамысловасць — аснова эканомікі Эквадора. Па запасах і аб'ёме здабычы «чорнага золата» дзяржава займае 4-е месца ў Лацінскай Амерыцы пасля Венесуэлы, Мексікі і Аргенціны. Эквадорскі ўрад заахвочвае праекты па распрацоўцы новых радовішчаў, а таксама па стварэнні сучаснай інфраструктуры і сродкаў транспарціроўкі нафты і нафтапрадуктаў. Для гэтага актыўна прыцягваюцца сродкі і тэхналогіі прыватных інвестараў.

Надзея ЮШКЕВІЧ

■ Год гасціннасці: рэаліі і перспектывы

ПЕРАХОДЗІМ НА АЎТАДАМЫ?

У краіне будуць развіваць сферу бюджэтнага размяшчэння турыстаў

Якія кірункі турызму будуць запатрабаваны ў найбліжэйшай будучыні? Чым прывабліве турыстаў Беларусь? Што падабаецца беларускім вандроўнікам на радзіме? На гэтыя і іншыя пытанні адказвалі дырэктар дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Вадзім КАРМАЗІН і старшыня праўлення БГА «Адпачынак у вёсцы» Валерыя КЛІЦУНОВА падчас анлайн-канферэнцыі на сайце БЕЛТА.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

АМАЛЬ 2 МЛН НАВЕДВАЛЬНІКАЎ

«Турыстычны сезон праходзіць паспяхова, — лічыць Вадзім Кармазін. — Запатрабаваны беларускія здраўніцы, аграэкасядзібы, адпачынак на прыродзе, экскурсійныя праграмы па значных аб'ектах гісторыка-культурнай спадчыны краіны. Паводле звестак Дзяржпагранкамітэта, за першыя шэсць месяцаў года мяжу Беларусі на ўезд з турыстычнымі, службовымі і прыватнымі візітамі перасеклі 1,9 млн чалавек. Транзітам праехалі праз нашу краіну 550 тысяч. Паводле аператыўных звестак, колькасць арганізаваных замежных турыстаў склала каля 90 тысяч, што на 25% больш, чым летась». У першым паўгоддзі 2014-га экспарт турыстычных паслуг склаў 113,1% да такога ж перыяду мінулага года, або 120,4 млн долараў, што на 13,9 млн больш, чым за аналагічны перыяд 2013 года.

Дарэчы, сітуацыя ва Украіне ўнесла свае карэктывы ў выязныя турыстычныя патокі. За першае паўгоддзе выездаў у вышэйзгаданым напрамку беларускіх грамадзян зменшылася больш чым у два разы. Разам з тым, узрасла колькасць турыстаў, што вырашылі наведаць Грэцыю, Турцыю, Балгарыю, Егіпет, Туніс, курорты Краснадарскага краю.

ГІДАЎ ШМАТ, АЛЕ НЕМАЛАДЫХ

Сёлета, паводле слоў Вадзіма Кармазіна, будзе зацверджана Генеральная схема развіцця аб'ектаў турысцкай інфраструктуры, курортаў і зон адпачынку ў Беларусі да 2030 года. Нагадаем, што кіраўніком дзяржавы 2014-ы абвешчаны Годам гасціннасці. Рэалізуецца план мерапрыемстваў па яго правядзенні.

Чакаецца, што экспарт турыстычных паслуг будзе развівацца праз засваенне новых рынкаў. Перспектыўнымі сёння з'яўляюцца рынкі Еўропы і Паўднёва-Усходняй Азіі. Для гэтага Мінспорту запланавана правядзенне азнаямленчых тураў па Беларусі для прадстаўнікоў турбізнесу і сродкаў масавай інфармацыі краін-суседзяў, рэгіёнаў Заходняй Еўропы, Паўднёва-Усходняй Азіі і Блізкага Усходу.

Да 2017 года плануецца стварэнне трансгранічнага праекта «Стварэнне парку сярэднявечнай культуры» (Украіна/Беларусь). Праект накіраваны на стварэнне прывабнага іміджу рэгіёна з прыцягненнем буйнога патоку турыстаў з дапамогай Парку сярэднявечнай культуры на базе Лідскага замка.

Між іншым не мае краіна праблем і з гідамі. Усяго атэставана больш за 1,4 тыс. экскурсаводаў і гідаў-перакладчыкаў, што ў поўнай меры забяспечвае патрэбы ў гэтых спецыялістах. Задача якраз у тым, каб прыцягнуць у гэтую сферу маладых. Часта кваліфікаваныя экскурсаводы — гэта людзі паважанага ўзросту.

ПОПЫТАМ КАРЫСТАЕЦЦА ЭКАЛАГІЧНЫ ТУРЫЗМ

У 2005 годзе Беларусь уступіла ў Сусветную турыстычную арганізацыю і тым самым пацвердзіла, што збіраецца ўжываць тыя падыходы да развіцця турызму, якія гэта арганізацыя практыкуе. Па словах Вадзіма Кармазіна, ідзе праца над канцэпцыяй дзяржаўнай праграмы развіцця турызму на 2016-2020 гады. Адзін з прыярытэтных кірункаў — далейшае развіццё экспарту турыстычных паслуг. Што тычыцца сусветных тэндэнцый, то адбываецца пераход ад пляжнага турызму да сузіральнага. Такім чынам, становяцца больш запатрабаванымі экскурсійныя маршруты. У цэлым будуць рабіць упор на выкарыстанне прынцыпаў «зялёнай эканомікі», якія сёння прапагандуе Сусветная турыстычная арганізацыя. У тым ліку будзе дарэчы зрабіць ухіл у бок экалагізацыі турызму. Ён сёння развіваецца ў сусветным маштабе вялікімі тэмпамі. Штогод яго доля прырастае прыкладна на 20%. Не менш перспектыўны кірунак — развіццё ў Беларусі агратурызму.

«Мы бачым, што з'яўляюцца пяцізоркавыя атэлі. Пры гэтым у краіне недастаткова аб'ектаў, якія прапануюць бюджэтны сямейны адпачынак (у кемпінгах, каравanінгах і г.д.). Таму мы будзем звяртаць увагу на развіццё бюджэтных сродкаў размяшчэння турыстаў. Ужо сёння распачата праца па хостэлах, набірае абароты кемпінгавы рух», — заявіў Вадзім Кармазін.

А наступнай вясной у Беларусі будзе арганізаваны міжнародны форум па экалагічным турызме. Валерыя Кліцунова паведаміла, што на мерапрыемства прыедзе мноства экспертаў, у ім будуць прымаць удзел беларускія спецыялісты. «Думаю, што будучыня турыстычнай сферы — за рэгіянальным турызмам. І нам ёсць што паказаць гасцям у плане развіцця турызму ў рэгіёнах».

БЕЛАРУСЫ ЛЮБЯЦЬ АДПАЧЫВАЦЬ ДОМА

Цікава, што колькасць беларусаў, якія плануюць адпачыць на радзіме, расце. Гэта відаць і па вандраваннях нашых грамадзян на экскурсійных маршрутах, і па наведваннях музеяў. Вадзім Кармазін сцвярджае, што за апошнія тры гады колькасць наведванняў музеяў павялічылася амаль у два разы — было прададзена больш за 6 млн білетаў. Характэрным прыкладам можа быць агратурызм, дзе большасць адпачывальнікаў (практычна 82%) — гэта нашы грамадзяне. Застаюцца запатрабаванымі і санаторна-курортныя ўстановы, павышаецца попыт адпачынку на прыродзе — каля вадаёмаў, рэк. «Сёлета мы надалі ўвагу каравanінгу, праведзена некалькі міжнародных турыстычных злётаў. І мы бачым, што ў нашых грамадзян зарэгістравана каля 600 прычэпаў і 40 аўтадамоў. Гэта значыць, яны набываюць гэтую тэхніку для падарожжаў як унутры краіны, так і за мяжой».

Але ж усё роўна многія едуць на адпачынак за мяжу. Прычына простая: людзі любяць адпачываць на моры. «У нас асацыяцыі аздараўлення, сямейнага адпачынку звязаны менавіта з наведваннем марскога ўзбярэжжа. Мы бачым, што дзесьці 70% выезду — гэта адпачынак на моры. Пажадана, каб лічбы былі прыкладна такімі: на чатырох, якія вандруюць унутры краіны, прыходзіўся толькі адзін, які выязджае», — лічыць спецыяліст.

Падрыхтаваў Уладзіслаў КУЛЕЦКІ

■

• ДАРЭЧЫ

ЯК ВЫРАШЫЦЬ СПРЭЧКУ З ТУРАГЕНЦТВАМ?

Гэтым летам абанкруціліся адразу некалькі расійскіх тураператараў. Гэтая сітуацыя адбілася і на адпачынку беларусаў. Таму Міністэрства спорту і турызму звяртае ўвагу грамадзян на тое, што да турыстычных паслуг прад'яўляюцца патрабаванні якасці і бяспекі. Кожная турыстычная кампанія павінна прадастаўляць неабходную і дакладную інфармацыю аб туры, пра тураператара, іншую інфармацыю, прадугледжаную заканадаўствам аб абароне правоў спажыўцоў, аб турызме. Мінспорту рэкамендуе грамадзянам заўсёды старанна і ўзважана падыходзіць да выбару тура, сабраўшы найбольш поўную і дакладную інфармацыю аб турыстычнай кампаніі, якая прапануе паслугу, а таксама ўважліва вывучыўшы дагавор аказання турыстычных паслуг. У выпадку нядобрасумленнага выканання ўмоў дагавора для вырашэння спрэчкі турыст мае права прад'явіць адпаведныя патрабаванні турыстычнай кампаніі. Калі не дасягнута згода бакоў, абарону правоў і законных інтарэсаў спажыўца ажыццяўляюць упаўнаважаныя дзяржаўныя органы (Міністэрства гандлю, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы) і грамадскія аб'яднанні. Акрамя гэтага, турысты маюць права звярнуцца па кансультацыю да спецыялістаў Дэпартамента па турызме Мінспорту.

■ Што пасадзім...

ПА ГЕКТАРЫ — НА КОЖНАГА

Беларусы будуць вырошчваць лес з уласнага пасадачнага матэрыялу

У рамках праграмы развіцця лясных гадавальніцкіх гаспадарак, якая дзейнічае з 2010-га па 2015 год, распрацаваны перспектыўныя кірункі па лесаразвядзенні і лесаўзнаўленні.

«Зараз мы працуем над пытаннем замяшчэння імпарту пасадачнага матэрыялу айчынным, — адзначыў першы намеснік міністра лясной гаспадаркі Аляксандр КУЛІК. — Гэта звязана з тым, што сеянцы з Польшчы і Галандыі, якія мы закупляем, настолькі апрацаваны хіміяй, што пры высейванні ў глебу прымаюцца нямногія з іх». Мэта, якую паставілі перад сабой у Міністэрстве лясной гаспадаркі, — забеспячэнне беларускіх гадавальніцкіх гаспадарак якасным пасадачным матэрыялам палепшанай якасці. Для гэтага ў краіне ствараюцца пастаянныя цэнтры — напрыклад, у Шчомысліцах, Рэчыцы, Глыбокім, Горках: там вядзецца нарыхтоўка насення, а яго банк насення захоўваецца ў Інстытуце лесу.

На перыяд да 2020 года запланавана вырошчванне пасадачнага матэрыялу з закрытай каранёвай сістэмай — ён больш устойлівы, добра прыжываецца. Дарэчы, штогод у Беларусі вырошчваецца 300 млн штук стандартнага пасадачнага матэрыялу. Хапае яго і на экспарт — у асноўным у Расію і Швецыю.

У цэнтры ўвагі Мінлясгаса — пашырэнне відаразнастайнасці парод. Плануецца адрадзіць пасадкі карэльскай бярозы, якая амаль перастала расці на беларускіх землях.

Акрамя гэтага, актыўна пашыраецца асартымент для зялёнага будаўніцтва — ужо вывучана і засвоена тэхналогія вырошчвання дэкаратыўнага пасадачнага матэрыялу.

Як адзначыў першы намеснік міністра, новыя гадавальніцкія гаспадаркі з'явяцца ў 16 лясгасах краіны, асобныя будуць рэканструявацца. У бліжэйшых планах — абавязковае развіццё інфраструктуры і стварэнне камфортных умоў для рабочых. Што датычыцца тэхнікі — усе гаспадаркі забяспечаны інвентаром з Данii. Паступова з'яўляюцца айчынныя вытворцы тэхнікі, напрыклад, брэсцкая фірма «Стымул».

Што датычыцца стратэгіі лесааднаўлення, Аляксандр Кулік прывёў наступныя лічбы. Прыкладна 30 гектараў лесу высякаецца штогод. Зараз запланавана фарміраванне лясоў на малапрадуктыўных землях, пясках. Тым не менш у Беларусі на кожнага жыхара прыходзіцца амаль па гектары лесу, а працэнт лясістасці краіны складае 39% і мае тэндэнцыю да павелічэння.

Да пачатку пажаранебяспечнага сезона налета плануецца забяспечыць відэакамерамі ўсе назіральныя вышкі. Мяркуецца, што новаўвядзенне прадухіліць многія пажары. У спёку галоўнай мерай для аховы лесу застаецца арашэнне, таму спецыяльныя сістэмы будуць уведзены ва ўсіх гадавальніках. Яшчэ нямала клопатаў дастаўляе падтапленне лесу ў Брэсцкай вобласці (у Кобрыне, Івацэвічах, Пружанах) з-за чаго здараецца ўсыханне лясоў.

Кацярына РАДЗЮК

■



Разам у Гару...


Анатоль з Кіева і Ірына з Мінска.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Прыкладна год таму «Звязда» ўжо расказвала, як новыя жыхары ствараюць у вымяраючай вёсцы пасяленне радавых маёнткаў. «Горцы» (так яны самі сабе называюць. — **Аўт.**) не ядуць мяса, рыбу, некаторыя малочныя прадукты, жывуць натуральнай гаспадаркай. Пры гэтым самае галоўнае — стараюцца існаваць у гармоніі з прыродай, нікому не навязваюць свой светапогляд. Прымаюць яны і турыстаў. Але ж апошнія таксама за здаровы лад жыцця, вегетарыянцы.

«ДОБРЫЯ Ў МЯНЕ СУСЕДЗІ!»

Калі б не пасяленцы, Гара магла б знікнуць з карты.

У вёсцы адзіная карэнная жыхарка баба Маня, якой ужо за 80 гадоў. Суседзямі задаволена.

— Вёска заўсёды была невялікай па колькасці двароў, але ж цяпер я адна тут з карэнных. У панядзелак і ў сераду прыязджае аўталаўка, сацыяльны работнік наведваецца на мапедзе. Наконт суседзяў скажу: не п'юць і не кураць, не лаюцца, адно аднаму дапамагаюць, ды і мне па дробязях. Кожны вечар танцуюць, але не п'юць! Маладому піць нельга, а старому можна (жартуе. — **Аўт.**). Калі пасяліліся, схадзіла я да іх на паляну. У іх там альтанка ёсць, арэлі для дзятвы. Мне яны адразу спадабаліся, — расказвае бабуля.

Яна спачатку катэгарычна адмаўлялася сфатаграфавацца. Маўляў, я ж не «зорка» нейкая, а вось суседзі яе — «зоркі». Бабуля вельмі ганарыцца тым, што яе новыя землякі і ў Віцебску на галоўнай плошчы выступаюць, і ў Маскву на фестывалі ездзяць.

Старажыл «горцаў» Ала Мішурная прапанавала мне зайсці ў госці да новаспечаных пасяленцаў.

З МІЛЫМ РАЙ У ШАЛАШЫ, АБО ЭВАЛЮЦЫЯ... «ФІФЫ»

Адразу кінуўся ў вочы ўкраінскі нумар мікрааўтобуса. Высветлілася, што ён належыць былому жыхару Кіева. Закахаўшыся, ён пераехаў жыць у Гару.

Уладзімір і Кацярына.

— Я з Кіева, прадпрымальнік. Цяпер ужо можна канстатаваць, амаль што былы. У мяне свае мабільныя кавярні — на базе аўто. У гэтым кірунку бізнес ва Украіне быў першапраходцам. Стартаваў разам з кампаньёнамі з нуля, і справы пайшлі ўгору. Родам я з Адэскай вобласці. Добра ведаю ўкраінскую мову. Цяпер хачу беларускую вывучыць. З Ірынай пазнаёміўся на сайце, што аб'ядноўвае людзей, якія шукаюць каханне сярод тых, хто за здаровы лад жыцця. На звычайных сайтах не было сэнсу шукаць сабе «палавінку». Спрабаваў стварыць сям'ю, але ў мяне нічога не атрымлівалася. Праблематычна ў наш час у горадзе сустрэць дзяўчыну, якая не піла б і не курыла, а замест таго, каб хадзіць з сяброўкамі па начных клубах, надавала б увагу мужу і дзецям, і для якой лад у сям'і меў бы больш сэнсу, чым грошы, футры і брыльянты. Нецікава мне было пачынаць стасункі з «гулякамі». На той момант я быў ужо даўно разведзены. Зараз сыну 18 гадоў... У 40 гадоў я пажадаў жыць па-іншаму. Зразумеў, што не хачу бліжэй да пенсіі «склеіць ласты» дзе-небудзь у «бетоннай клетцы» — звычайнай кватэры... Хачу стварыць прастору, у якой шчаслива дажыву да старасці. І каб былі свае саджалка, пчальнік, сад, агарод, — разважае Анатоль.

Ірына ж кажа, што была сталічнай «фіфай».

— У Гару з Мінска пераехала. І ўявіць сабе не магла раней, што пагаджуся кінуць сталіцу. У мяне ж там была памочніца па гаспадарцы, сакратар. Дарагія адзенне, футры, абутак, аўто — усё ў мяне было. Як і ўвага мужчын. Але ж надакучыла раптам усё. Сюды ўпершыню прыехала, калі прачытала пра пасяленне радавых маёнткаў «Звон-Гара». Зразумела, што хачу тут застацца назаўсёды. Але трэба было дом пабудаваць. Пачала больш актыўна шукаць сабе мужчыну, які стаў бы аднадумцам і каханым адначасова. І знайшла, — прызналася Ірына.

Яны паказалі мне месца, дзе часова жывуць. Насамрэч, рай у «шалашы»: у палатцы спяць, побач — імправізаваная кухня. Жыць будуць у... лазні, пакуль дом не пабудуюць.

— Я прыехаў сюды да Ірыны, каб дапамагчы ёй зрабіць фундамент для дома. Хутка прабегла

Аляксандр і Алёна.

«іскра», вырашылі жыць разам. Зразумелі, што дом, калі з'явяцца дзеткі, малы будзе. Дык цяпер дабудоўваем, — растлумачыў Анатоль.

Яны кажуць, што ў Гары знайшлі сваё шчасце. Побач жывуць аднадумцы, якія заўсёды дапамогуць, з якімі прыемна і карагоды вадзіць каля вогнішча пад баян, і дом будаваць. Рабіць усё разам, талакой, як нашы продкі. І яшчэ таму менавіта Гара — ідэальнае месца для выхавання дзяцей. Яны могуць прыйсці ў любы дом, як у свой, і не пачуюць там мат, не ўбачаць нецвярозых ці курцоў. Суседзі ім заўсёды нададуць дастаткова ўвагі. Дзеці будуць бачыць, што гаспадар бярэ сваю жонку, а жанчына паважае мужчыну.

Іх новы сусед Жэня, якому пад 30 гадоў, — мінчанін, інжынер-канструктар на дзяржаўным прадпрыемстве радыёэлектронікі. Размаўляе са мной на беларускай мове.

— Летась прыехаў сюды на фестываль у пошуках «палавінкі». Яшчэ раней вырашыў, што хачу на сваёй зямлі жыць, дом пабудаваць. У Гары пазнаёміўся з дзяўчынай, вырашылі тут застацца. Пачалі будаваць дом і сеяць агарод — «прыціраліся» адно да аднаго. Не атрымалася... З'ехала яна, а я застаўся. Мне тут падабаецца. Жыву, шукаю каханую, — гаворыць малады мужчына.

Зайздросны халасцяк, дарэчы, сказаў, што быў у іншым паселішчы радавых маёнткаў — «Росы», што ў Мінскай вобласці. Ды яму не спадабалася: адчуў, што там людзі «самі па сабе». Можа, таму, што іх параўнальна многа?

ЯКІЯ Ж ЯНЫ СЕКТАНТЫ?

Калі б «горцы» былі сектантамі, гэта не засталося б без увагі мясцовай улады. Пасля публікацыі ў «Звяздзе» пра іх пісалі раённая і віцебская гарадская газеты, расказвала тэлебачанне. Разумею калег: міжвольна напрошваецца захад пра «нешта сектанцкае». Напрыклад, у царкву не ходзяць. Начыталіся нейкіх кніг пра духоўнасць і цяпер жывуць асобна... У сельскага Савета

Сям'я старажылаў пасёлка Мішурных.

Баба Маня.

прэтэнзій да «горцаў» няма. Уладу яны дарма не турбуюць. Адзіная праблема — з вадой. У старым калодзежы яна дрэннай якасці. Прыходзіцца або яе ачышчаць, або прывозіць пітную ваду. Для мыцця выкарыстоўваецца і дажджавая. Колькі ні спрабавалі пры дапамозе спецыялістаў уладкаваць калодзежы, не атрымліваецца. Ні ў адным з пяці выкапаных калодзежаў вады летам не было.

А ўсё таму, што насамрэч мясцовасць тут «горная»: узгорак, нізіна і зноў перапад вышыні. Старшыня сельвыканкама ў курсе праблемы. Калі «падключыць» вёску да цэнтралізаванага водазабеспячэння, трэба трубу пракласці даўжынёй прыкладна 2 кіламетры. Разам думаюць, што рабіць.

А яшчэ яна займаецца шыццём і вышыўкай на продаж, зарабляе з мужам на прыёме турыстаў, праводзіць майстар-класы, у тым ліку і па здаровым харчаванні, вырабе страў на пары.

«Горцаў» шмат разоў запрашалі выступаць на розных мерапрыемствах. Летам, напрыклад, яны бралі ўдзел у фестывалі льну — на галоўнай плошчы Перамогі ў Віцебску. Танцавалі, вадзілі карагоды. Публіка апладзіравала ад душы.

Вельмі паспяхова выступалі ў Маскве на фестывалі «Кедр, які звініць», дзе была прадстаўлена творчасць такіх ж аматараў здаровага ладу жыцця з Расіі, Украіны, Беларусі і іншых краін былога СССР.

— Сёлета таксама ў Маскве, у музейным комплексе на этнічным фестывалі, мы прэзентавалі мадэлі адзення, няшкоднага для здароўя. А жылі ў юрце... Раней у Аўстраліі прайшоў модны паказ нашага адзення. А наш праект — фестываль рамёстваў, які летась адбыўся ў Віцебску і Мінску, удастоены гранда — паездкі ў Галандыю, — расказвае Алёна. Яна па адукацыі мастак, стварае габелены, займаецца вышыўкай. Навучыла гэтаму іншых жанчын з Гары, а турыстаў вучыць падчас майстар-класаў.

— Якія мы сектанты? Нікому не перашкаджаем, жывём так, як лічым патрэбным. Пры гэтым адкрытыя для стасункаў з, як вы кажаце, нармальнымі людзьмі. Я і да Гары не курыў, з алкаголем не сябраваў. Ну, напэўна ж, «сектант», — смяецца яе муж Аляксандр.

Пазнаёміўся я з яшчэ адным Аляксандрам і яго жонкай Наталляй. Што дзіўна, яны таксама жывуць пакуль што ў лазні.

— Я ў Оршы працую, таму сюды прыязджаю на выхадныя, а жонка тут пастаянна. Выкладаю музыку, баян. З Наташай пазнаёміліся ў Мінску на канферэнцыі, прысвечанай радавым маёнткам. Яна прыехала да мяне ў госці зімой. Снегу намяло па пояс, да дома падысці цяжка. Іншая, можа, і не пажадала б тут застацца назаўсёды, а яна сказала, што знайшла і каханне, і дом, — успамінае Аляксандр.

Наталля, выкладчыца замежных моў, расказала, што ў вёсцы існуе традыцыя — абменьвацца тым, што вырасла на агародзе, мёдам. Саша частуе урбечам — карысным для здароўя прадуктам, які прывозіць з Сярэдняй Азіі.

НЕЗВЫЧАЙНЫЯ АГАРОДЫ, САМАРОБНЫ ХЛЕБ

Ёсць сярод «горцаў» і прафесійны селекцыянер. Па саджанцы да яго прыязджаюць здалёк.

— Я пераехаў у Гару з Мінскага раёна. Малодшым навуковым супрацоўнікам працаваў. У Гары займаюся арганічным земляробствам. Салома і пілавінне, лісце, сена — калі гэта ўсё перагнівае, добры ўраджай атрымліваецца. Тыя ж саджанцы выдатна растуць. Іх рэалізацыя, плюс продаж лішкаў ураджаю — мой асноўны заробак. Таксама дапамагаю людзям будавацца, вырабы з лазы раблю, — расказвае Уладзімір.

Ён жыве тут разам з жонкай Кацярынай, разам выхоўваюць дзіця.

Ала і Уладзіслаў Мішурныя, якія запрасілі мяне ў Гару, паказалі свой радавы маёнтак, на якім сярод іншых расце елка міру, радавыя дрэвы, высаджаныя ў гонар нараджэння іх траіх дзяцей. Улад паказаў борці, дзе жывуць пчолы. Падрабязна расказаў пра перавагі борцяў над вуллямі, пра пладаносныя расліны, якіх высадзілі шмат. Цікава, што іх дом, шасцівугольны, як пчаліныя соты. Дарэчы, у Гары ёсць і круглы дом, які нагадвае шапіто, а іншы будуецца на фундаменце з... шын.

На агародзе расце батат — аналаг бульбы, але гэта больш салодкі плод. Унутры ён бывае жоўтага, ружовага, фіялетавага колераў. Адпаведна, і на смак розны: арэхавы, сунічны...

— Клімат у нас пачаў набліжацца да трапічнага. Вінаград, абрыкосы, персікі, хурму высаджваем, фінік — восенню. Кавуны і дыні думаем у наступным годзе высадзіць. А вось побач капуста і памідоры... Тут — агурочная трава, да верасня яна яшчэ будзе квітнець, — расказвае гаспадар.

І на іх участку таксама выкарыстоўваецца арганічны спосаб вырошчвання. Плады пастаўляюць у маскоўскія экакрамы, дзе рэалізуецца садавіна і агародніна без нітратаў. Ала, якая раней працавала ў кампаніі мабільнай сувязі, прызналася, што вяртацца пасля дэкрэту на працу не хоча, нягледзячы на высокі заробак. Праўда, і цяпер падпрацоўвае ў сферы маркетынгу. А яшчэ яна займаецца шыццём і вышыўкай на продаж, зарабляе з мужам на прыёме турыстаў, праводзіць майстар-класы, у тым ліку і па здаровым харчаванні, вырабе страў на пары. Хлеб і булкі выпякае сама, а цукеркі і пірагі робіць такія, што пальчыкі абліжаш. Муж кладзе эканамічныя печы, падрабляе на будаўніцтве.

Ідэю адраджэння роду падтрымлівае і мама Улада, якая ўдзельнічае ў добраўпарадкаванні маёнтка, робіць закаткі без выкарыстання воцату — на яблычным і парэчкавым соку і марской солі. Майстар-класы на гэтую тэму таксама запатрабаваныя. Людміла Іванаўна дапамагае выхоўваць унукаў і ўдзельнічае ў розных мерапрыемствах.

— З многіх краін да нас прыязджалі. Адзін немец нават пажадаў пасяліцца ў Гары. Ён быў у нас на свяце, а мы святкуем і аналаг «Дажынак» — «Багач», а таксама зімняе свята, фэсты праводзім. Сустрэчы для тых, хто хоча знайсці каханне, арганізуем. Жыў той немец, як і іншыя госці, у палатцы. І застаўся задаволеным. Сказаў, што аналагі радавых маёнткаў ёсць і ў Германіі, але там зямля дорага каштуе. Марыць ажаніцца з беларускай і стаць «горцам», — расказвае Ала.

А калі нехта з іншым светапоглядам захоча стаць суседам?

— Наўрад ці такое здарыцца. Людзям, якія не супраць дрэнных звычак і мяса, жыць разам з намі будзе няўтульна, — у адзін голас гаварылі «горцы».

Калі шчыра, цалкам іх я так і не зразумеў (а можа, не «дарос» яшчэ да такой жыццёвай філасофіі). Напрыканцы маёй экскурсіі па вёсцы, горцы падзяліліся планамі: хочуць пабудаваць клуб, які адначасова можа стаць школай. У бліжэйшых планах будаўніцтва новых дамоў у Гары: яшчэ 6 сямей хочуць там пасяліцца. Будзе нагода для чарговага рэпартажу.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Вёска Гара, Віцебскі раён — Віцебск.

Фота аўтара і з архіва жыхароў вёскі.

Сямейная газета

Выпуск № 12 (16)

АДКУЛЬ ШТО БЯРЭЦЦА?

Раніцай каля ганкаў школ і дзіцячых садкоў гармідар: такое адчуванне, што за час летніх канікулаў на правілы дарожнага руху і наогул элементарныя правілы добрага тону забыліся не толькі дзеці, але і многія дарослыя. Вось пад'ехала пад самыя вароты маладая жанчына, не пакінуўшы паміж веснічкамі і тратуарам і 50 сантыметраў. Маме з каляскай, якая падыходзіць да воротаў з другога боку, цяпер ніяк не прайсці. На заўвагу ў адрас аўтаўладальніцы: «Няўжо нельга было прыпаркаваць машыну хоць на метр далей?» — тая раздражнёна кідае: «Я дзіця прывезла!». Ага… А ўсе астатнія бацькі з дзецьмі тут проста так гуляюць. Час ад часу садкоўскі вартаўнік дзядзька Міша выходзіць да асабліва нахабных вадзіцеляў, каб трохі прыструніць іх, і пры гэтым абяцае выклікаць ДАІ, але дапамагае гэта ненадоўга — праз пару дзён сітуацыя паўтараецца.

…А якая «песня» на гэты конт у грамадскім транспарце! Вось у тралейбус убягае юнак і, спяшаючыся заняць месца, плюхаецца на крэслы «для састарэлых, пасажыраў з дзецьмі і цяжарных жанчын» — акурат пад ветлівы напамін з дынамікаў, што менавіта гэтым катэгорыям варта саступаць месца. Абвешаныя, як вінаградзінкамі, малымі, матулі заходзяць значна пазней і размяркоўваюцца хто як паспявае. Юнак нібыта не заўважае, што некаторыя з іх стаяць побач. Разруліць сітуацыю дапамагаюць… самі дзеці.

«Мам,— звонкім галаском пытаецца дзяўчо на выгляд гадоў трох-чатырох — гэты дзядзька цяжарны?» Твар маладога чалавека набывае колер маладых буракоў, а яго самога нябачнай спружынай падкідвае да выхаду.

Але такі мірны вынік, хутчэй, выключэнне, чым правіла. У паўсядзённасці ж многія дарослыя ў прысутнасці дзяцей абражаюць іншых, павышаюць голас на выхавацеляў і настаўнікаў, скандаляць у чэргах у паліклініцы, нарэшце, сварацца на саміх малых… І пры гэтым большасць гэтых жа бацькоў расказвае дзецям па кніжках, што такое добра і што такое дрэнна, вучыць вітацца і прасіць прабачэння, патрабуе ад іх быць ветлівымі і ласкавымі. Малыя бачаць усё гэта і адчуваюць, як модна цяпер гаварыць, кагнітыўны дысананс. Калі хлусіць нельга, але бацька хлусіць выхавальніцы, што не зможа дапамагчы ў рамонце шаф, бо заняты на працы,— значыць, часам падманваць можна? Калі мама вучыць саступаць месца старэйшым, але кожны раз пры ўваходзе ў транспарт кажа: «Ідзі, сядай», а сама стаіць — значыць, дарослыя проста прыкідваюцца стомленымі? Словы і справы супярэчаць адно аднаму, маленькі чалавек губляецца. А потым — робіць так, як бацькі.

Грубасць, няўважлівасць, брыдкаслоўе і нават адкрытае хамства — вы сапраўды верыце, што нашы дзеткі-кветкі прыносяць гэта аднекуль з вуліцы, што іншыя, «дрэнныя» дзеці паказалі ім заразлівы дрэнны прыклад? Але ж псіхолагі і педагогі сцвярджаюць, што на 90% характар чалавека закладваецца ў сям'і. І перш чым рабіць заўвагу нашчадкам за дрэнныя паводзіны і непаважлівыя размовы, перш чым чытаць маралі кшталту «Вось я ў тваім узросце…», трэба шчыра адказаць самому сабе на пытанне: «А вы — не такі?»

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

■ На свае вочы

ЧЫМ ХАТА БАГАТА

ДНЯМІ ГЭТА ВЫЗНАЧАЛІ Ў КРУПКАХ

…З раніцы Крупскі раённы Дом культуры поўніўся музыкай і дзіцячымі галасамі. Менавіта тут напрыканцы жніўня праходзіў абласны этап Рэспубліканскага конкурсу «Сям'я года». Хоць і на першы, і на другі погляд было незразумела: як, па якіх крытэрыях і прыкметах выбраць з такіх розных, але аднолькава моцных, дружных, творчых, спартыўных, актыўных сем'яў усяго адну — найлепшую?

— Спачатку праходзіў завочны адборачны тур,— тлумачыць **намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва Мінгарвыканкама Тамара ТРУБЧЫК.**— Аргкамітэт прагледзеў фільмы-прэзентацыі больш як 20 сем'яў і выбраў тыя, якія, на наш погляд, могуць паслужыць узорам для іншых.

…Пакуль госці дзівіліся на выставу дэкаратыўна-прыкладнога майстэрства, якую зладзілі таленавітыя шматдзетныя бацькі Крупскага раёна, і займалі месцы ў глядзельнай зале, канкурсанты, ледзь пераадольваючы хваляванне, заверашалі апошнія прыгатаванні.

Удзельнікі любанскага ансамбля «Верабейкі» прыехалі падтрымаць сям'ю Выскварка.

АФІЦЫЙНА

Рэспубліканскі конкурс «Сям'я года» праводзіцца ў Беларусі ў адпаведнасці з Нацыянальнай праграмай дэмаграфічнай бяспекі на 2011–2015 гады ўжо ў другі раз і мае на мэце ўмацаванне духоўна-маральных асноў сям'і, адраджэнне і прапаганду сямейных каштоўнасцяў і традыцый, павышэнне ролі і прэстыжу сям'і ў жыцці грамадства. Да ўдзелу ў ім на добраахвотнай аснове запрашаюцца поўныя сем'і, якія выхоўваюць дваіх і больш дзяцей.

Сёлета фінал конкурсу адбудзецца 24 кастрычніка. Яго пераможца атрымае ганаровае званне «Сям'я года-2014», дыплом I ступені і грашовую прэмію памерам да 100 базавых велічынь. Сем'ям, якія акажуцца на 2-м і 3-м месцы, таксама будуць уручаны дыпломы і грашовыя прэміі памерам да 75 і 50 базавых велічынь адпаведна.

— Каб мы ведалі, што наступны тур будзе звязаны з прэзентацыяй сябе на сцэне, то, напэўна, не згадзіліся б,— дзвюма рукамі адмахваецца **Сяргей Выскварка.** Насамрэч ён сціпла ўмоўчвае, што да публічных выступленняў сям'я **з Любанскага раёна** прывычная. Сяргей Георгіевіч — вядомы этнахарэограф, кіраўнік фальклорнага ансамбля «Верабейкі». У гэтым жа ансамблі, лічы, з дзіцячага садка займаюцца танцамі цяперашні 11-класнік Арцём і 4-класніца Арына. Толькі сёлета тата разам з дачушкай пабывалі на трох фестывалях і адусюль прывезлі прэміі. Нават мама Валянціна Мікалаеўна, па прафесіі ад мастацтва далёкая (яна настаўніца матэматыкі), дзеля конкурсу развучыла з сынам фігуры некалькіх народных танцаў. Таму і з прадстаўленнем сацыяльна значнага праекта сям'я вырашыла не мудрыць — выбралі тое, чым займаюцца па жыцці: адраджэнне традыцыйнай народнай культуры. Падтрымаць свайго кіраўніка прыехала частка ансамбля. Але, мяркуючы па тым, як прытупвалі гледачы пад іх «Нарэчаньку» і «Месяц», можна зрабіць выснову, што сапраўдныя энтузіясты сваёй справы нават малымі сіламі здольны абудзіць у іншых цікавасць да спадчыны, да вытокаў…

Не навічкі ў спаборніцтве і сям'я **з Нясвіжскага раёна: Вера і Уладзімір Мацавіла,** а таксама чацвёра іх дзяцей неаднаразова ўдзельнічалі ў раённых і абласных конкурсах шматдзетных сем'яў і перамагалі. Адкуль узяць на ўсё сілы і час, выхоўваючы чацвярых дзяцей? Танюткая, зграбная, бы дзяўчына, Вера Ігнатаўна мае свой рэцэпт на гэты конт: «Ад іх, ад сваіх любімых дзетак, і наталяемся энергіяй!» А яшчэ, мабыць, даюць сілу карані. Гісторыю ўласнага роду па абедзвюх галінах бацькі прасачылі да XVIII стагоддзя.

Таксама мае ў актыве перамогу на фестывалі сямейнай творчасці і **сям'я Талстыка з Вілейскага раёна:** педагог-арганізатар Казімір Талстыка і сам апантаны музыкай, і дачушкам Ангеліне і Валерыі здолеў перадаць гэтую любоў і вакальны талент.

А вось бацька **сям'і Дабрыніных з Маладзечанскага раёна** жартуе, што на конкурс яны ўчацвярых прыехалі дзеля старэйшага сына. Яраслаў — хлопец таленавіты ў розных сферах і апантаны творчасцю: ён і ў алімпіядах па грамадазнаўстве дэманструе выдатныя вынікі, і вершы складае, і музыку піша, і кіно захапляецца, і нават… вышывае бісерныя карціны. Так што малодшай дачцэ Лізе ёсць з каго браць прыклад. А падрыхтоўку да конкурсу хлопец паспяхова спалучыў з паступленнем на юрыдычны факультэт.

Вядомы акцёр і рэжысёр **Павел Харланчук-Южакоў,** вялікая сям'я якога прадстаўляла **Мінскі раён,** з-за шчыльнага графіку здымак не змог прыехаць на конкурс. Але жонку Ганну і чацвярых дзяцей (нават пяцярых, улічваючы, што сям'я неўзабаве чакае нараджэння яшчэ адной дачушкі) гэты факт, здаецца, нікольі не засмуціў. А гледачы, не стрымліваючы слёз замілавання, захапляліся беларускамоўнымі імпрэзамі, у якіх маленькія артысты прадстаўлялі сцэнкі з жыцця Радзівілаў, чыталі вершы, ігралі на гітары, спявалі…

Сярод суддзяў разгарнуліся сапраўдныя баталіі: як назваць кагосьці першым, калі ўсе — лепшыя? Таму ўзнагароды атрымалі ўсе, кожны ў сваёй намінацыі. Сям'я Талстыка была названа «Самай творчай», сям'я Выскварка — «Самай артыстычнай». «Самай знаходлівай» стала сям'я Дабрыніных, а званні «Самай дружнай» і «Самай працавітай» дасталіся сям'і Мацавіла. Дарэчы, прадстаўнікі 16 сем'яў, якія ўдзельнічалі ў адборачным туры, таксама былі запрошаны на свята і атрымалі дыпломы і падарункі ад арганізатараў. А прыз глядацкіх сімпатый і тытул пераможцы дасталіся сям'і Харланчук-Южаковых, якія напрыканцы кастрычніка прадставяць Міншчыну ў фінале рэспубліканскага конкурсу.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК. Фота аўтара.
Крупкі — Мінск.

Інтэрв'ю з пераможцамі чытайце на 3-й старонцы «СГ».

ПРОСТАЯ МОВА

— Несумненна, падобныя конкурсы вельмі важныя і для вобласці, і для краіны, і найперш для саміх сем'яў, а таксама для моладзі, якая яшчэ толькі збіраецца стварыць сям'ю,— адзначае намеснік старшыні Мінаблвыканкама Аляксандр ЮШКЕВІЧ.

Дарэчы, цяпер у вобласці назіраецца станоўчая дэмаграфічная тэндэнцыя: сёлета нарадзілася на 134 дзіцяці больш, чым летась, і гэта вельмі прыемны факт. У Мінскай вобласці ёсць такая грамадская ініцыятыва — тут прыступілі да стварэння рэгіянальнай Акадэміі сям'і, у якой бярэ актыўны ўдзел Беларускі саюз жанчын, Праваслаўная царква, шэраг грамадскіх арганізацый. У межах праекта ёсць пэўныя напрацоўкі для таго, каб дапамагчы маладым людзям будаваць сямейныя ўзаемаадносіны.

«ЗВЯЗДА» + АНТ

■ У вас будзе дзіця

Трэці год на тэлеканале АНТ выходзіць рубрыка «У вас будзе дзіця». Дзякуючы праграме новыя сем'і знайшлі амаль 50 дзяцей. Да праекта далучылася і наша газета.

Ваня

Трохгадовы Ваня жыве ў Пінскім доме дзіцяці. Хлопчык, як адзначаюць педагогі, вельмі актыўны і мэтанакіраваны.

«Ваня рухавы, шустры, вельмі любіць заняткі ў гульнявой форме,— расказвае выхавацель Вольга Кахнюк,— прычым на заняткі ходзіць з задавальненнем, паслухмяна і ўседліва выконвае ўсе заданні. Як і ўсе малыя ў яго ўзросце, любіць катацца з горкі, а таксама на машынках і на веласіпедзе, гуляць у мяч. Але асабліва яго вабяць гульні з пяском — у пясочніцы Ваня можа сядзець гадзінамі. І бацькі яму патрэбны такія ж добрыя, спагадлівыя і ласкавыя, а таксама цярплівыя, якія здолеюць разгледзець у хлопчыку асобу і дапамогуць яму раскрыцца, накіруюць у патрэбнае рэчышча».

Каб даведацца пра Ваню больш, пазваніце па нумары (017) 284–71–51. Гэта нумар Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Міністэрства адукацыі. Для тых, хто жадае ўсынавіць дзіця, на сайце videopassport.ru змешчаны відэакурсы, падрыхтаваныя сумесна НЦУ і творчай групай праекта «Пакуль усе дома».

■ Свае людзі

У ЧЫМ СІЛА, БРАТ?

Барцы, футбалісты, хакеісты, тэнісісты, гандбалісты і нават фрыстайлісты… Часта браты і сёстры дасягаюць значных вынікаў у спорце. Мы склалі топ самых паспяховых спартыўна-сямейных тандэмаў.

ФУТБОЛ

АЛЯКСЕЙ І ДЗМІТРЫЙ БАГІ

Яшчэ ў 1990-я за бабруйскую «Белшыну» гулялі мясцовыя знакамітасці — Ігар і Эдуард Градабоевы. На пачатку нулявых за БАТЭ, а пасля і за жодзінскі «Тарпеда», выступалі Дзмітрый і Павел Платонавы. Галоўным трэнерам гродзенскага «Нёмана» з'яўляецца Сяргей Саладоўнікаў, а дапамагае яму ў працы родны брат Валерый. Усе чулі пра Аляксандра і Вячаслава Глебаў. Упэўнены, што тытул самых вясёлых братоў адназначна атрымалі б Міхаіл і Уладзімір Макоўскія — былыя футбалісты кіеўскага «Дынама» і зборнай Беларусі. Што казаць, калі нават фота на пашпарт яны спачатку зрабілі адно на дваіх. А аднойчы Міхаіл нават «таямніча» гуляў замест Уладзіміра, памяняўшыся ў перапынку майкамі.

Самыя паспяховыя футбольныя браты сёння, відаць, Аляксей і Дзмітрый Багі. Абодва яны працуюць у БАТЭ. Аляксей, старэйшы, — памочнік галоўнага трэнера, а Дзмітрый выступае за асноўны склад, за 7 гадоў прафесійнай кар'еры заваяваў з камандай 5 чэмпіёнскіх тытулаў, гуляе за зборную Беларусі па футболе. Зразумела, захапленне маленькага Дзімы гульнёй пачыналася таксама з наведванняў матчаў старэйшага брата.

Дзмітрый Бага: «Мы часта хадзілі з татам на мінскія матчы БАТЭ. Як зараз помню гульню з «Міланам»! Дзіва што. За італьянцаў гулялі Шаўчэнка і Мальдзіні — мае куміры, а супраць іх — мой брат. Я, безумоўна, ганарыўся ім. Памятаю, прыйдзе дадому стомлены, адпачне, а пасля ўжо пачынаў яго распытваць».

ГАНДБОЛ

СЯРГЕЙ І ДЗЯНІС РУТЭНКІ

Імя Сяргея Рутэнкі — культавае для сучаснага гандбола Беларусі. Самы паспяховы беларускі гулец зараз выступае за славутую «Барселону». І калі пра поспехі Сяргея ведалі многія, пра дасягненні яго малодшага брата Дзяніса чулі далёка не ўсе. А яны ў яго таксама ёсць! Малодшы Рутэнка станавіўся чэмпіёнам Беларусі ў складзе мінскага «Дынама» і БГК імя Мяшкова з Брэста, пастаянна гуляе за нацыянальную зборную. У ёй браты якраз і сустракаюцца. Пагуляць у адной камандзе ў іх пакуль не атрымліваецца.

Дзяніс Рутэнка: «Мяне заўжды параўноўвалі з братам, але мне гэта не падабаецца. Так, мы браты, але людзі розныя. У дзяцінстве ён замяняў мне многіх людзей. Заўсёды можа даць добрую параду. Можна нават сказаць, што брат мне як бацька — заўжды дапаможа».

НАСТОЛЬНЫ ТЭНІС

ВІКТОРЫЯ І ВЕРАНІКА ПАЎЛОВІЧ

Калі ў малым тэнісе ў мужчын бясспрэчны аўтарытэт — гэта Уладзімір Самсонаў, сярод дзяўчат вялікую пашану заслужылі сёстры-блізняты Вікторыя і Вераніка Паўловіч. Вікторыя двойчы станавілася чэмпіёнкай Еўропы, Вераніка таксама адзначылася добрым вынікам — паўдзельнічала ў трох Алімпіядах. Цікава, што за сваю кар'еру дзяўчаты толькі аднойчы гулялі разам у парным разрадзе. Справа ў тым, што Вікторыя аддае перавагу абарончаму стылю, а Вераніка — атакуючаму. Лічыцца, што пры такім несупадзенні ў пары лепш не гуляць.

Вікторыя Паўловіч: «Хлопчыкі нас з Верачкай не блыталі. Яны ніколі не памыляліся. Усе ведалі, да каго трэба падыходзіць. І ў школе адна за адну мы нічога не здавалі: баяліся, што пасля пра гэта даведаюцца, будзе дрэнна. А вось фатографы нас пастаянна блытаюць. Часта прыходзіцца бачыць свае фотаздымкі з подпісам «Вераніка Паўловіч».

БАРАЦЬБА

ЗАЛІНА, МАДЗІНА І ФАЦІМА СІДАКОВЫ

У другой палове 1990-х у Асеціі было горача. Усё актыўней да Уладзікаўказа даносіліся адгалоскі другой чачэнскай вайны. Каб ратаваць сям'ю Чармен Сідакоў быў вымушаны пакінуць радзіму і пераехаць у беларускі горад Бабруйск. На новым месцы ў яго ўсё атрымалася, а дочкі пачалі займацца вольнай барацьбой, прывозіць дадому медалі са спаборніцтваў.



Фота komkur.info.

Заліна, старэйшая з сясцёр, сярэбраны прызёр чэмпіянату свету, перамагала ў турніры на прызы трохразовага алімпійскага чэмпіёна Аляксандра Мядзведзя. Мадзіна, сярэдняя, ужо заваёўвала «бронзу» чэмпіянату краіны, таксама выступала за зборную Беларусі. А Фаціма, малодшая, адзначалася медалямі на міжнародных спаборніцтвах сярод юніёраў.

Мадзіна Сідакова: «Мы пастаянна змагаемся на трэніроўках. Аднак аднойчы сапернічалі з Залінай у фінале турніру «Медзведзяня», які праходзіў у Мінску. Ведаеце, мы не маглі змагацца, нязручна адчувалі сябе. Проста стаялі, нічога не рабілі, пакуль нас не паклікаў суддзя са словамі: «Калі вы зараз не пачняце змагацца, я вас здыму са спаборніцтваў! Не атрымаеце ні першага, ні другога месца!» А мы неяк да ўсяго гэтага як сёстры паставіліся. Мы як рабілі? Аддавалі адна адной па раўндзе, а ў апошнім дзейнічалі ўжо да перамогі».

ХАКЕЙ

ЛІДЗІЯ, АЛЯКСАНДР І СЯРГЕЙ МАЛЯЎКІ

Ці ведалі вы, што ў Беларусі ёсць жаночы хакей? Пэўны час наша каманда «Пантэра» паказвала нядрэнныя вынікі і нават перамагла ў адкрытым чэмпіянаце Латвіі. Але доўга каманда не праіснавала і была расфарміравана. Адной з самых актыўных «пантэр» была Лідзія Маляўка, якая мае хакейную генеалогію. Ліда пайшла па слядах братоў, якія цяпер выступаюць за гродзенскі «Нёман», і таксама абрала шлях прафесійнага хакеіста. Дзяўчына гуляе ў Расіі. Нядаўна нават планавала памяняць грамадзянства, каб мець магчымасць выступаць за зборную.

Лідзія Маляўка: «Я заўжды глядзела на братоў і думала: «Хакей — гэта так цудоўна! А я нейкай гімнастыкай займаюся» Я ўжо ў тры ці чатыры гады на каньках стаяла».

ФРЫСТАЙЛ

АСОЛЬ І ЦІМАФЕЙ СЛІЎЦЫ

На жаль, яшчэ адзін прыклад спартсменаў, якія вырашаюць пакінуць радзіму і выступаць за іншую краіну. І калі Лідзія Маляўка збіралася адна прымаць расійскае грамадзянства, вядомыя айчынныя фрыстайлісты Асоль і Цімафей Слiўцы зрабілі гэта ўдваіх. Лепшае сямейнае дасягненне ў фрыстайле — сярэбраны медаль Асоль на чэмпіянаце 2007 года ў акрабатыцы.

Асоль Слівец: «Мы з самага дзяцінства прызвычайваліся да свабоды, да самастойнасці. Але і вучыліся адказваць за свае правіны. Калі мне было тры гады, бацькі давяралі як старэйшай дачцэ аднагадовага Цімафея. У шасцігадовым узросце замест ціхага часу ў садку я хадзіла на трэніроўкі. І выхавальніцы адпускалі мяне без праблем. Добра, што комплекс «Працоўныя рэзервы», дзе я спасцігала асновы спартыўнай гімнастыкі, знаходзіўся непадалёк».

ВЕСЛАВАННЕ НА БАЙДАРКАХ І КАНОЭ

АЛЯКСАНДР І АНДРЭЙ БАГДАНОВІЧЫ

Гэтымі хлопцамі мусіць ганарыцца ўся краіна. У 2008 годзе яны заваявалі «золата» Алімпіяды ў Пекіне, а праз чатыры гады — «серабро» ў Лондане. Чатыры гады таму «Белпошта» нават выпусціла спецыяльную марку з фотаздымкам братоў-чэмпіёнаў, і цяпер гэтыя мініяцюры назаўжды пасяліліся ў альбомах філатэлістаў. Вось такі невялічкі «помнік» атрымалі браты яшчэ пры жыцці. Цікава, што ў Бабруйску, дзе браты рабілі першыя крокі ў веславанні, падрастае яшчэ адзін сямейны дуэт — Іван і Аляксей Заброцкія. Дарэчы, таленавітых хлопцаў ужо ахрысцілі другімі Багдановічамі.

Аляксандр Багдановіч: «Мы валодаем аднолькавымі функцыянальнымі магчымасцямі. А яшчэ агульныя гены дапамагаюць неяк падладжвацца, прыстасоўвацца. Мы добра адчуваем адзін аднаго па ходзе дыстанцыі і можам дадаць на фінішы. Амаль ідэальны дуэт, калі не ўлічваць тое, што мы пастаянна сварымся. Але ўсё гэта ад напругі і жадання зрабіць сваю працу як мага лепш».

Тарас ШЧЫРЫ

■ Парады псіхолага

ДОЎГІ ШЛЯХ ДА РАЗУМЕННЯ БЛІЗКІХ

На пытанні чытачоў адказвае старшы выкладчык кафедры псіхалогіі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, псіхолаг-кансультант Алена ОСІПАВА.

ЦІ МОЖА КЛОПАТ... ДАКУЧАЦЬ?

«Хачу папрасіць вашай парады, як адвучыць мужа ставіць мяне на людзях у нявёмкае становішча. Справа ў тым, што мы працуем у суседніх будынках, і ён часта забягае да мяне — на абед разам схадзіць або перадаць што-небудзь з дома. І амаль кожны раз робіць заўвагі ў мой адрас: то апранута не па надвор'і, вельмі лёгка або занадта цёпла, то страўнік сабе псую перакусам усухамятку, то яго званок прапусціла. Словам, «чаму без шапкі». Як з дзіцем, шчыра кажучы (з нашым пяцігадовым сынам ён размаўляе прыкладна гэтак жа). Калегі, з якімі я сяджу ў кабінеце, спачувальна ўсміхаюцца, а мне непрыемна. Шмат разоў казала пра гэта мужу, прасіла ўсе пытанні і прэтэнзіі абмяркоўваць дома, але ён сцвярджае, што проста клапоціцца пра мяне, а меркаванне навакольных яму абыякавае. Як яшчэ растлумачыць, што я ад такога «клопату» пастаянна злуюся і нервуюся?

З павагай,

Вераніка, г.Гомель».

Вераніка, «перарабляць» другога чалавека — занятак няўдзячны. Наўрад ці ваш муж гатовы сёння мяняцца, а ў няёмкім становішчы аказваецеся вы, а не ён. Я прапаную вам на пэўны час самой змяніць стаўленне да праяў клопату мужа пра вас у прысутнасці калег (калі меркаваць па лісце, менавіта гэта непакоіць вас перш за ўсё!). Мяркую, што калегі «спачувальна ўсміхаюцца» таму, што назіраюць вашу рэакцыю на паводзіны мужа. А калі вы будзеце рэагаваць на гэта з усмешкай, называць мужа ў жарт «таткам» або як-небудзь яшчэ, цалкам магчыма, хтосьці з іх вам нават пазайздросціць!

Паводзіны вашага мужа — гэта тыповая схема паводзін, якія склаліся ў вашай пары. Напэўна, вы дазваляеце мужу ставіцца да вас як да дзіцяці альбо самі часта «ўключаеце дзіця» дома, бо злавацца і нервавацца ў адказ на праяўленне клопату — гэта тыповыя паводзіны для падлеткавага ўзросту. А калі вы жадаеце, каб ваш муж на працы ставіўся да вас як да дарослай жанчыны, вам і трэба быць дарослай, прычым не толькі на працы.

«Клапатлівыя» паводзіны мужа таксама могуць быць своеасаблівай праявай рэўнасці, жаданнем прадэманстраваць вашым калегам існуючую паміж вамі блізкасць.

ВЫПІСКА З РАДДОМА: ФЕЕРЫЯ АБО ЦІХАЯ РАДАСЦЬ?

ЗАБІРАЦЬ ЖОНКУ З РАДЗІЛЬНІ МІНЧАНІН ПРЫЕХАЎ НА БЕЛЫМ КАНІ…

Уладзімір ГРЫГОР'ЕЎ, эканаміст:

Мне больш падабаецца сустракаць жонку традыцыйна: забраць яе з радзільнага дома з кветкамі, а ўжо дома з блізкімі роднымі адсвяткаваць нараджэнне дзіцяці. Звычайна ў гэты своеасаблівы час у сям'і і так шмат мітусні. Дома патрэбна ўсё падрыхтаваць да прыезду немаўляці — а гэта, як правіла, паходы ў крамы і шмат пакупак...

Нават сёння памятаю, як жонка з радзільнага дома перадала спіс таго, што мне патрэбна набыць да раніцы наступнага дня. А гэта не проста прыйшоў і купіў: неабходна знайсці менавіта тую рэч і той маркі, якая названа ў спісе... Потым прывезці ўсё набытае жонцы, забраць бруднае і атрымаць новы спіс... і так чатыры дні. А яшчэ клопаты ў доме: памыць і прыбраць (як умею). А прыехаўшы з радзільнага дома, праз гадзіну ўжо патрэбна блізкіх сустракаць... Але так было з першым сынам.

Нядаўна ў нашай сям'і адбылося чарговае папаўненне. Канешне, усе тыя ж мітуслівыя чатыры дні, праца, дзіцячы садок, крамы, радзільны дом, спіс... Мне здавалася, што я быў больш падрыхтаваны і ўсё прадугледзеў. Чацвёрты дзень я як мага лепш распланаваў, каб не было лішняй мітусні: прывёз бацькоў, забраў дзяцей з садка, жонку з немаўляткам з радзільні... І тут званок у дзверы; адчыняем — а там незнаёмыя мне людзі віншуюць жонку, уручаюць нейкія падарункі, у кватэру ўлятаюць шарыкі, напоўненыя геліем... Прызнаюся, у мяне тады адбыўся эмацыянальны ступар. Гэтае віншаванне хутка скончылася, аднак я яшчэ нейкі час не мог апрытомнець. А вось мая жонка адрэагавала інакш. Было відаць, што сюрпрыз яе сяброў ёй вельмі спадабаўся. Яна была шчаслівая, а дзеля гэтага я гатовы вытрымаць любое эмацыянальнае напружанне.

Ірына СТАРАСЦІНА, адміністратар сайта mnogodetok.by:

Наш калектыў часта віншуе жанчын з нараджэннем дзіцяці. Звычайна мы робім гэта для тых, каго ўжо добра ведаем, з кім маем адносіны. У нас шматдзетныя маці сустракаюцца не толькі на форумах нашага сайта, але і ў жыцці. Канешне, на белым кані мы яшчэ нікога не сустракалі, аднак заказвалі і скрыпача, і флейтыста... Больш за тое, робім для нашых «фарумчанак» практычныя падарункі, якія спатрэбяцца шматдзетнай маці ці нованароджанаму: гэта можа быць мультыварка, крэсла для немаўляці, сертыфікаты розных крам. Усё залежыць ад патрэб таго, каго мы віншуем. Так, у ліпені адна з нашых «фарумчанак» нарадзіла дзяўчынку, але адразу папярэдзіла, што пасля родаў ёй патрэбны спакой і час, каб трохі адпачыць. Мы ўсё роўна яе павіншавалі, толькі вельмі «ціха». Пасыльны перадаў жанчыне ад нашай кампаніі фотарамку і сертыфікат на фотасесію яе малышкі. Ёй такі варыянт віншавання вельмі спадабаўся, і яна не атрымала ніякіх адмоўных эмоцый. Заразмы з адным татам плануем выпіску яго жонкі. Нараджэнне дзіцяці адбудзецца праз пару тыдняў, і таму ў нас ёсць час падрыхтаваць невялікі флэшмоб. Але мы дакладна ведаем, што такая сустрэча нашу сяброўку парадуе. Мы заўсёды ўлічваем характар і патрэбы будучай маці. Адной падабаюцца яркія шумныя віншаванні, іншая гатова прыняць падарунак, але не любіць пасля родаў ніякай мітусні і шуму... І гэта нармальна, бо ўсе мы розныя. Галоўнае для нас — прынесці радасць.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Ганна ХАРЛАНЧУК-ЮЖАКОВА:

«ДЗЕЦІ — ГЭТА НЕ ЦЯЖАР, А ЎЗНАГАРОДА»

Сям'я збіраецца разам не толькі дома: дзеці выступаюць з Паўлам і Аняй у адным са спектакляў.

Іх шасцёра. Пакуль што шасцёра: Павел, Ганна і дзеці. Філіпу 11 гадоў, Івоне — 7 гадоў. Столькі ж споўнілася Адэлі, а малодшай, Алівіі, — 4. І ўсе з нецярпеннем чакаюць з'яўлення на свет пятага дзіцяці — Паўлінкі.

Вядомы акцёр, рэжысёр Павел Харланчук сёння вельмі запатрабаваны — выступае на сцэнах Купалаўскага тэатра і Тэатра-студыі кінаакцёра, робіць уласныя пастаноўкі, шмат здымаецца ў кіно. Ганна — таксама выпускніца Акадэміі мастацтваў, служыла ў драматычным тэатры імя Максіма Горкага і тэатры Беларускай арміі, але цяпер змяніла акцёрскую прафесію на прафесію мамы і захавальніцы сямейнага агменю. У сям'і ўсе размаўляюць на беларускай — не ў пагоні за трэндам, а таму, што адчуваюць гэта правільным; удзельнічаюць усе разам у навагоднім і калядных пастаноўках. «Тое, што мы ёсць сям'я, — гэта самая галоўная перамога і дасягненне ў маім жыцці», — часта гаворыць у інтэрв'ю Павел, які ў свой час без ваганняў узяў двайное прозвішча ў знак павагі і кахання да жонкі. Карыстаючыся выпадкам, выводзім з ценю і Ганну.

Сям'я — гэта найвялікшая каштоўнасць, і праз яе Бог дае новае жыццё. Таму цаніце гэты час, у які вы разам, вельмі беражыце адно аднаго.

— Аня, вы вельмі моцная і мужная жанчына — з чатырма дзецьмі, у чаканні пятага, сабрацца на конкурс «Сям'я года»… Як асмеліліся на гэта?

— З адміністрацыі Мінскага раёна запыталі, ці згодны мы, — і Паша пагадзіўся. Усё залежала найперш ад яго, бо ён зазвычай вельмі заняты ўлетку. Гэта час актыўных здымак, падчас якіх мы тату дома амаль не бачым… І ўсё адно так атрымалася, што менавіта на дзень правядзення конкурсу Паша быў заняты адразу ў некалькіх здымках, у Расіі і ў Беларусі, таму давялося ехаць без яго. Па шчырасці, прыехаць з чатырма дзецьмі, цяжарнай — гэта ўсё не складана.

—?!

— Насамрэч. Галоўная складанасць — у падрыхтоўцы, калі трэба ўсіх дзяцей «пастроіць», патлумачыць, што за чым неабходна рабіць, адрэпеціраваць конкурснае выступленне. Вось з гэтым — так, давялося папрацаваць.

…У наш час мець чатырох дзяцей і вырашыць нарадзіць пятае — сёння не тое што рэдкасць, а амаль грамадзянскі подзвіг. Але толькі не для Паўла і Ганны, якія адразу, яшчэ больш за 10 гадоў таму, хацелі вялікую сям'ю.

— Мы не адчуваем, быццам гэта цяжар, — круціць галавой Аня, — гэта ж наш свядомы выбар.

— Вы не афішуеце, але і не ўтойваеце, што дваіх дзетак узялі з дзіцячага дома. Няўжо і гэты этап прайшлі бязбольна?

— З імі было складана, канешне. Першы год адаптацыі даваўся няпроста. Філіп ужо быў дарослы і закрываўся ўнутры сябе. Трэба было прыкласці шмат намаганняў, каб ён адкрыўся, даверыўся нам; а маленькая Івона, наадварот, усе эмоцыі выплёсквала вонкі — тату не прызнавала, мужчын наогул не падпускала блізка, вады баялася… Што дапамагло справіцца? Напэўна, вера. Я заўсёды кажу, што без Бога немагчыма мець тую любоў, з якой трэба падыходзіць да гэтай справы. Бо палюбіць чужых дзяцей вельмі складана. Я ведаю сем'і, якія бяруць дзіця і проста змагаюцца з пачуццём уласнай нелюбові, і я іх вельмі разумею. У нас, спадзяюся, атрымалася па-сапраўднаму палюбіць дзяцей, і мы — сям'я. Хоць Філіп і Івона ведаюць, што яны не родныя, але яны — таксама нашы дзеці.

— Ці не бывае часам крыўдна, што давялося фактычна ахвяраваць акцёрскай кар'ерай дзеля выхавання дзяцей?

— Ёсць такі момант, можа быць. Я б сапраўды хацела больш рэалізавацца ў прафесіі, бо дзеля гэтага доўга вучылася, я актрыса, якой цікава іграць у тэатры, здымацца ў кіно… Яшчэ з трыма дзецьмі я працавала — проста брала іх з сабой. Зараз гэта немагчыма. Але я не шкадую, бо разумею: тое, што я цяпер раблю, — нашмат важнейшае, чым мая кар'ера, чым наогул любыя прафесійныя дасягненні. Такое нейкае ўнутранае адчуванне, бачанне вынікаў маёй працы. А мяркую, ніхто не аспрэчыць, што выхоўваць дзяцей — вялікая праца. І яна не тое каб кампенсуе прафесійную недарэалізаванасць — гэта нават немагчыма параўноўваць! Да таго ж мы ездзім з тэатральнымі пастаноўкамі па школах, садках, дзіцячых дамах; 5 гадоў існуе пастаўлены Паўлам цудоўны спектакль «Маё сэрца б'ецца» ў межах праекта «У абарону жыцця» — толькі што зрэдку ён цяпер ідзе. Але, думаю, нешта будзе адбывацца ў гэтым рэчышчы, і я сыграю яшчэ не адну ролю.

— Вы з Паўлам — жывое абвяржэнне тэорыі аб нетрываласці студэнцкіх шлюбаў. І ўсё ж дзве творчыя, эмацыянальныя асобы ў сям'і — спалучэнне няпростае. Як захоўваеце лад у доме?

— У нас ёсць такое правіла, якое падказаў аднойчы мудры чалавек, і мы ім карыстаемся. Без яго ў свой час хто ведае, што было б і як атрымалася… Фармулюецца яно вельмі проста: «хто павінен папрасіць прабачэння, калі вы пакрыўдзіліся адно на аднаго?» Мы, вядома, сталі разважаць: напэўна, той, хто вінаваты. А правільны адказ — «я». У сэнсе, кожны павінен ісці на прымірэнне першым.

— Проста гучыць і не заўжды проста рэалізуецца. Ці атрымліваецца ў вас?

— Атрымліваецца. І ў мяне такое адчуванне, што чым далей, тым яшчэ бліжэй мы робімся, тым нам больш не хапае адно аднаго. Не магу сказаць, быццам у сям'і мы дзве такія эмацыянальныя асобы, паміж якімі непазбежныя канфлікты. Паша прыходзіць дадому, адыграўшы ўсе эмоцыі на пляцоўцы, і хоча простага, спакойнага баўлення часу з блізкімі. І мы яго шораз вельмі чакаем. Тым больш, з улікам таго, што цяпер адбываецца ў свеце, наколькі кожны дзень дарагі і наколькі трэба цаніць адно аднаго — гэтае разуменне ў нашай сям'і вельмі моцнае.

Палюбіць чужых дзяцей вельмі складана. Я ведаю сем'і, якія бяруць дзіця і проста змагаюцца з пачуццём уласнай нелюбові, і я іх вельмі разумею. У нас, спадзяюся, атрымалася па-сапраўднаму палюбіць.

— Прадбачу адказ на пытанне, як вы выхоўваеце дзяцей: у любові.

— Так, у любові, — усміхаецца. — Але і ў строгасці, бо любоў таксама строгая. І калі ты любіш, то ў пэўны момант караеш, накіроўваеш дзіця, засцерагаеш ад памылак. Дзеці ўсё адно маніпулююць, зрушваюць усталяваныя рамкі. Таму трэба іх у пэўны час з любоўю, але і строгасцю, спыніць у чымсьці, пакараць — але пакаранне павінна адпавядаць правіне. І мне здаецца, што ў іх таксама ёсць разуменне, што мы іх любім заўжды і ўсякімі і што наша строгасць — толькі частка вялікай бацькоўскай любові. Прычым яшчэ вельмі важна, што Паша — насамрэч наша падтрымка і апора, і самы моцны тыл, які можна ўявіць; у нас аднолькавыя погляды на выхаванне, і тата для дзяцей стапрацэнтны аўтарытэт.

— Пасля перамогі ў абласным этапе конкурсу вы трапляеце ў рэспубліканскі фінал, які ўбачыць мноства людзей. Магчыма, некага ваш прыклад падштурхне да важных рашэнняў ва ўласнай сям'і. Якую думку хацелася б данесці да іншых сем'яў?

— Што сям'я — гэта найвялікшая каштоўнасць, і праз яе Бог дае новае жыццё. Таму цаніце гэты час, у які вы разам, вельмі беражыце адно аднаго. І яшчэ вельмі хацелася б, каб дзеці не былі для нас цяжарам. Цяпер распаўсюджаны стэрэатып, што дзеці — гэта так складана, так цяжка, «як вы іх пракорміце?»… Усё гэта мы чуем пастаянна. А трэба ўсвядоміць іншае: як сказана ў Біблii, дзіця — гэта ўзнагарода, якая нам даецца звыш. І за пэўны адрэзак часу, даволі кароткі, мы маем шанц укласці ў дзіця ўсё тое, што ўмеем і ведаем самі, і адправіць у жыццё. Калі ўзяць на сябе гэтую адказнасць і несці яе з радасцю, потым вы абавязкова ўбачыце плён сваёй працы і пакінеце, мабыць, самы значны след на зямлі…

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота аўтара і з архіва герояў.

■ Вазьму твой боль…

ЯК Я ПЕРАСТАЛА ТУРБАВАЦЦА

«Як мага хутчэй перазвані мне! Тэрмінова патрэбна дапамога! Гэта пытанне жыцця і смерці!!!» — атрымліваю экспрэсіўнае паведамленне ад Тані, валанцёркі анкахворага падапечнага. Усе праблемы, за якія мы бяромся, — гэта пытанні жыцця і смерці. І ўсе яны тэрміновыя. Што можа быць такім экстранным? Набіраю.

— Усё дрэнна! Сёння прыйшлі вынікі аналізаў Алі. У яго 90 працэнтаў гэтых… забылася, як завуцца… Што рабіць?! Урачы сказалі, лячыць бессэнсоўна. Адпраўляюць дадому! Маці не хоча жыць! Як быць?! Яна званіла мне ў слязах! 90 працэнтаў… Як жа іх?.. Я не ведаю, што рабіць, нават словы забываю! Чым дапамагчы?!

Таня апякае 16-гадовага Алі з Азербайджана. Ён лечыцца ў беларускім Цэнтры дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі ўжо другі раз. Для замежнікаў лячэнне ў нас платнае. Як толькі сын захварэў, бацькі прадалі кватэру ў Баку, каштоўныя ўпрыгажэнні, узялі крэдыты і паехалі ў Беларусь з дзвюма дочкамі і хворым сынам. Тут у іх нарадзілася маленькая Соня — яна павінна стаць донарам ствалавых клетак для Алі. Усе працаздольныя члены сям'і ўладкаваліся на працу. Але грошай не хапіла. Дапамагалі ўсім светам. Перасадку рабіць не сталі, бо Алі выйшаў у рэмісію. Даўгі за лячэнне пагасілі, сям'ю адправілі на радзіму.

Неўзабаве хвароба вярнулася. Маці з сынам зноў прыехалі ў Мінск. Востра паўстала пытанне перасадкі касцявога мозга і вялікай сумы грошай на гэтую аперацыю.

Таня з калегамі актыўна ўзялася збіраць сродкі на лячэнне Алі.

І вось табе гром сярод яснага неба: не будзе перасадкі, не трэба збіраць грошы, лячыць не мае сэнсу — зрабілі, што маглі.

Мне знаёмы яе стан адчаю і бездапаможнасці. Бег на месцы — быццам усё, што ты робіш, марнае, бо нічога ўсё роўна не мяняецца.

Аднойчы я зразумела, што самае марнае ў нашай справе — вось такі стан адчаю, трывожнасць і самаразбурэнне. Ён нічога не дае ні нам, ні нашым падапечным. Толькі забірае сілы і час, патрэбныя для справы.

— Я вырашыла адаслаць дакументы Алі ў замежныя клінікі. Можа, яны возьмуцца лячыць яго далей. А што, калі яны не возьмуцца? А раптам выставяць велізарную суму, якую нам ніколі не сабраць? А ці будуць беларусы дапамагаць азербайджанцу, які лечыцца ў Ізраілі? Што, калі людзі перастануць пералічваць грошы на Алі?

Стоп, Таня! Не вырашай за дактароў, не вырашай за бухгалтараў, не вырашай за ўсіх беларусаў. Гэта іх адказнасць, іх рашэнні, гэта будучыня, якую мы не можам прадказаць. Адказвай толькі за сябе. Ты прыняла рашэнне дапамагаць Алі. Ты гэта робіш. Ты ўзяла на сябе адказнасць збіраць грошы на яго лячэнне. Ты з гэтым спраўляешся. Табе ў галаву прыйшла правільная думка адправіць яго дакументы ў Ізраіль. Зрабі гэта.

Аднойчы я вырашыла несці адказнасць толькі за сябе і за сваю частку работы. Выявілася, што астатняе не залежыць ад мяне, колькі ні перажывай, колькі слёз ні пралівай. Нават калі я спрабавала прадказваць паводзіны іншых людзей, кожны раз мяне чакаў сюрпрыз.

Перыядычна я раблю рассылку пра сваіх падапечных. Адпраўляю па электроннай пошце ці ў сацыяльных сетках інфармацыю пра неабходную дапамогу. Раней выбірала людзей, якія, верагодней за ўсё, могуць адгукнуцца. Дасылала тым, хто, на мой погляд, дапаможа. Траплялiся і тыя, хто «хутчэй за ўсё не, але нехай будзе». Гэтыя людзі заўсёды здзіўлялі. Ад тых, на каго я ўскладала надзеі, і нават сёння няма адказу. А тыя, каго я «забракавала», адгукаліся самі і далучалі сяброў.

Цяпер я не бяруся вырашаць за іншых. Рассылку раблю выпадковым людзям. Не ўскладаючы надзеі на добрых і не пазбаўляючы шанцу ненадзейных.

І няхай не кожны адрасат здолее дапамагчы, але кожнае звяно выконвае важную работу. Адзін заўважае інфармацыю, перадае іншаму, той, у сваю чаргу, расказвае пра яе цэлай кампаніі — у гэтай кампаніі нараджаецца ідэя, як дапамагчы, і толькі адзін чалавек яе рэалізуе. Я не здзіўляюся, калі памочнікам аказваецца сябар брата свата таго адрасата, якому я першапачаткова дасылала просьбу. Кожны з іх зрабіў сваю работу, як і я. Калі адказваць толькі за адну частку задання, можна зрабіць яе максімальна якасна.

Аднойчы я запрашала вядомага беларускага рок-спевака павіншаваць з днём нараджэння Андрэя, пацыента дзіцячага анкацэнтра. Спявак выслухаў, пранікся, адразу пагадзіўся прыехаць. Але з адной умовай: спяваць ён не будзе.

Яшчэ гэтай праблемы мне не хапала! На працы ганяюць, дома сабака не выгулены, да заліку ва ўніверсітэце трэба рыхтавацца. А тут свята не атрымліваецца зладзіць! Камандаваць «зоркай» не магу — пасля званка ўсё яшчэ дрыжаць каленкі, загадаць спяваць не маю права. Нявызначанасць і незавершанасць так турбавалі маю ўнутраную перфекцыяністку, што і працаваць не магла, і да заліку не падрыхтавалася, і на сабаку забылася. Я ўжо вырашыла не ехаць на дзень нараджэння. І тут да мяне дайшло: твая задача маленькая — прыкласці ўсе намаганні, каб арганізаваць міні-канцэрт. Вынік — за спеваком. Але ты павінна пастарацца. Зрабі яшчэ адзін крок. Зрабі ўсё, што можаш. Не хвалюйся за рашэнне — пакінь гэта рокеру. Проста зрабі сваю частку задання.

І я пішу СМС «зорцы». Пра тое, як Андрэй збіраўся на яго канцэрт, але трапіў у рэанімацыю. Пра тое, якой нацягнутай можа быць сустрэча ў палаце і як разрадзіць атмасферу песня. Пра тое, што ў аддзяленні яшчэ мноства аматараў року, і міні-канцэрт парадуе не толькі імянінніка. І пра тое, што гэта можа быць апошні дзень нараджэння Андрэя.

Адказу не прыйшло, але я супакоілася, бо зрабіла ўсё, што ад мяне залежала.

…Назаўтра я сустракала Лявона Вольскага на паркоўцы дзіцячага анкацэнтра. Ён зачыніў за сабой дзверы аўто, падышоў, павітаўся і зноў пайшоў да машыны. З задняга крэсла спявак дастаў… гітару.

Канцэрт сабраў усё аддзяленне. Спявалі хорам, імправізавалі, размаўлялі паміж песнямі, гітару змяняў губны гармонік. Гэта быў апошні дзень нараджэння Андрэя. Рада, што менавіта тады зразумела: я — толькі адно звяно ланцужка і сваю справу павінна выканаць адказна.

— Што ж рабіць?! — у тэлефоне трывожна гучыць голас Тані.

Супакоіцца. І даслаць дакументы ў Ізраіль. Гэта твая частка работы. Астатняе ад нас не залежыць — і няхай яно цябе не турбуе.

Таццяна НЕМЧАНІНАВА,
кіраўнік дабрачыннага руху «Клуб 5000».

■ Фотаздымак з гісторыяй

ПРА МАЦЯРЫНСКАЕ ШЧАСЦЕ І ДОЎГУЮ ПАМЯЦЬ

«Я нарадзіўся і рос у шматдзетнай і дружнай сям'і, — напісаў у сваім лісце **Віктар Несцяровіч з Лагойска,** — але нам усім суджана было перанесці суровыя выпрабаванні. У самым пачатку вайны страцілі бацьку: ён памёр у выніку няшчаснага выпадку. Наша матуля, Ганна Сямёнаўна, жыла паўсядзённымі клопатамі — як пракарміць, захаваць, паставіць на ногі васьмярых дзяцей. Надзейнымі памочніцамі для яе сталі старэйшыя сёстры і брат Павел, які ўзяў на сябе нялёгкую ношу галоўнага мужчыны ў доме. Ды і сам я ў свае 11-12 гадоў стараўся ў меру сіл дапамагаць, вучыўся ўпраўляцца з касой і плугамі, пілаваць і калоць дровы».

Асабліва цяжкімі, прыгадвае Віктар Антонавіч, былі першыя пасляваенныя гады, калі сям'я ледзь зводзіла канцы з канцамі. Аднак дзякуючы ўзаемнай падтрымцы ўсе нягоды перажылі, вывучыліся, атрымалі розныя спецыяльнасці. І нават раз'ехаўшыся з роднага дома, стараліся часцей збірацца разам, наведваць матулю. «Адзін з такіх шчаслівых момантаў якраз і адлюстроўвае фотаздымак, зроблены летам 1964 года, — распавядае наш чытач. — Тады прыязджаў у кароткачасовы водпуск малодшы брат Анатоль, які нёс пагранічную службу па ахове дзяржаўнай мяжы ў Карэліі.

Таму ён, воін-пагранічнік, і займае цэнтральнае месца на гэтым фота, што захоўваецца ў сямейным альбоме. Сур'ёзны, засяроджаны, ён у думках, мабыць, на далёкай заставе з яе суровымі законамі... Пасля звальнення з воінскай службы наш Анатоль быў прыняты на працу ў дарожнае ўпраўленне па атрыманай раней спецыяльнасці грэйдарыста і праявіў сябе як класны спецыяліст, заслужыўшы высокі аўтарытэт. Двойчы ён узнагароджваўся ордэнамі, як рацыяналізатар удзельнічаў ва Усесаюзнай выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі, атрымаў там сярэбраны медаль.

Побач з сынам стаіць матуля, і твар яе свеціцца радасцю і шчасцем. А паміж імі — старэйшы брат Павел. Лёс быў да яго нялітасцівы. Пад самы канец вайны брат толькі цудам пазбег смерці: у яго руках з-за прыкрай неасцярожнасці ўзарвалася толавая шашка. У выніку брат застаўся інвалідам, на ўцалелай левай руцэ меў толькі два пальцы. Але цаной упартасці і вялікіх намаганняў Павел навучыўся пісаць, скончыў школу, затым завочна пединстытут, асвоіў прафесію журналіста і звыш 30 гадоў адпрацаваў у рэдакцыі бярэзінскай раённай газеты.

Першая злева на здымку — старэйшая з маіх сясцёр, светлай памяці Леаніда. За месяц да вызвалення нашай краіны яна была вывезена ў Германію, зведала ўніжэнне і голад, працуючы на авіяцыйным заводзе; вярнулася на радзіму толькі восенню 1945 года. Потым аж да самага выхаду на пенсію працавала ў раённым аддзеле сацыяльнага забеспячэння.

Побач з ёю, злева ад Анатоля, стаіць брат Яўген. У тым самым, 1964-м, ён скончыў філфак БДУ, адпрацаваў два гады дырэктарам сельскай школы на Чэрвеньшчыне. Пераехаўшы ў райцэнтр, працягваў настаўнічаць, шмат гадоў узначальваў педкалектыў адной з гарадскіх школ.

З правага боку здымка — дзве мае сястры. Малодшая, Алена (яе ўжо 10 гадоў няма на свеце) з маленства засталася глуханямой пасля перанесенай хваробы, але скончыла сярэднюю спецшколу, доўгі час працавала на Мінскім тонкасуконным камбінаце.

Сястра Раіса (на здымку яна ў цёмнай сукенцы) з-за матэрыяльных цяжкасцяў змагла скончыць толькі сем класаў. Уладкаваўшыся ў горадзе на пошту, пачынала з дастаўкі тэлеграм, потым асвоіла прафесію тэлефаністкі і працавала на камутатары, пакуль не пайшла на заслужаны адпачынак.

І, нарэшце, у ніжнім радзе на фота злева — сястра Галіна. Яна пад канец 1940-х гадоў уладкавалася ў Мінску. Спачатку была падсобнай работніцай на гарадскіх новабудоўлях, потым асвоіла бухгалтарскую справу і шмат гадоў аддала працы ў будтрэсце. Цяпер жыве ў Мінску. А побач з ёю маладая матчына нявестка, Паўлава жонка Аня. Яе першынца Сашу трымае на руках пляменніца Тамара (дачка старэйшай нашай сястры Леаніды). Наогул, брат Павел стварыў шматдзетную сям'ю, у якой тры сыны і дзве дочкі. Старэйшая з іх разам з мужам з'ехала ў далёкі сібірскі край і цяпер жыве ў Цюменскай вобласці.

Далучыўся да нашых сямейнікаў і трапіў у аб'ектыў фотаапарата і пляменнік Валодзя Маскалькоў. Высокі ростам, ён стаіць справа, побач з сястрой Ленай. Толькі мяне самога няма на здымку: недзе на той час адсутнічаў.

...Ужо больш за 30 гадоў як не стала нашай любай матулі. Пакінула яна светлую, нязгасную памяць пра сябе. Багатую сямейную дынастыю папоўнілі цяпер ужо яе ўнукі і праўнукі. Дарэчы, адзін з унукаў, Яўгенаў сын Уладзімір, адстаўны палкоўнік з дыпломам ваеннага журналіста, узначальвае прэс-цэнтр Міністэрства спорту ў Беларусі».

***

Шаноўныя чытачы! Давайце пагартаем сямейныя альбомы разам! Фотаздымкі з гісторыяй (не больш за тры здымкі) дасылайце на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а, або info@zvyazda.minsk.by. Аўтар найлепшага фота з гісторыяй будзе адзначаны каштоўным прызам.

Увага! Да ўдзелу ў конкурсе НЕ ПРЫМАЮЦЦА вясельныя фотасесіі, леташнія здымкі з курорта і сучасныя фота дзяцей. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца аўтарам.

■

Добрае імя — шчаслівы лёс

Нашы продкі былі перакананы ў тым, што дадзенае чалавеку пры нараджэнні імя (а ў дадатак імя па бацьку, якое абазначае сувязь з родам, з Бацькаўшчынай наогул) шмат у чым вызначае яго лёс. Ва Украіне казалі: «Прыбяры пня, дай яму імя — будзе з яго чалавек!»

1 Забаранялася ў адной сям'і званць адным і тым жа імем трох чалавек, каб не «наклікаць» заўчасную смерць на дзіця ці на яго аднайменнага сваяка: «Адзін звядзе другога са свету».

2 Калі ў родзе часта паміралі малымі дзеці, імкнуліся «ўратаваць» наступнае дзіця. Дзеля гэтага, напрыклад, нованароджанаму давалі імя Адам ці Ева (у гонар першых бацькоў чалавецтва) або нават імёны бацькоў, «вяртаючы» ім нядобрую «эстафету», каб захаваць прадаўжальніка роду.

3 Каб наканаваць немаўляці доўгае жыццё, часам яму давалі імя самага старога чалавека ў акрузе — доўгажыхара.

4 Як верылі на Палессі (Столінскі раён Брэсцкай вобласці), уласцівасцю падаўжаць жыццё дзіцяці валодалі незвычайныя, рэдкія або старадаўнія імёны. Часам яшчэ да зачацця дзіцяці бацькі ўзгадвалі і перабіралі такія даўнія імёны: Яўхім, Яўхім'я, Гардзей...

5 З гэтай жа мэтай пры хрышчэнні дзіцяці часта давалі імя моцных святых-абаронцаў: Мікалая, Андрэя, Марыі.

6 Па славянскіх традыцыях, для абароны немаўляці, якое нарадзілася слабым, звярталіся да выбару імя так званага «першага сустрэчнага», якога таксама запрашалі і пахрысціць гэтае дзіця.

7 Двайнятам імкнуліся даць сугучныя (падобныя) імёны, бо лічылася, што ў іх і лёс падобны.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

5 КНІГ для чытання разам з дзецьмі:

Валянціна ВЕРАМ'ЁВА, настаўніца беларускай мовы і літаратуры, г.Полацк:

1. «Біблія для дзяцей». Гэта зборнік маленькіх павучальных гісторый, адаптаваных для дзіцячага ўспрымання. З яе дапамогай можна закласці духоўныя асновы, якія неабходна фарміраваць у дзетках да 5-гадовага ўзросту.

2. Казкі. Усякія — і рускія, і беларускія, і народаў свету, і аўтарскія. Яны ў даступнай форме распавядаюць, як дабрыня, справядлівасць, працавітасць перамагаюць складаныя жыццёвыя абставіны. Калі гаварыць пра беларускія народныя казкі, ёсць цудоўны зборнік «З рогу ўсяго многа». У ім, апроч казак, змешчаны і пацешкі, і загадкі.

3. Кнігі Эдуарда Успенскага — на ўласны выбар: вершы, казкі, аповесці. У маім дзяцінстве любімых кніг гэтага аўтара было вельмі шмат. Пачаць знаёмства можна з любімых некалькімі пакаленнямі гісторый пра Чабурашку і кракадзіла Гену ці пра дзядзьку Фёдара і яго сяброў.

4. Уладзімір Мазго, «Загадкавая азбука». Кніга для малодшага школьнага ўзросту, якая дазваляе вывучыць беларускі алфавіт і зрабіць гэта цікавым, а не прымусовым заняткам, што сёння даволі актуальна.

5. Для чытання і абмеркавання з падлеткамі параю кнігу **Яўгена Хвалея «Прынцэса тусоўкі».** Гэта кніга насамрэч «чаплеляе» і яшчэ доўга не адпускае, бо яна пра сучасных падлеткаў і сучасную страшную праблему — наркаманію. Мы потым абмяркоўваем яе на занятках, і з года ў год дзеці адназначна адабраюць такое «пазакласнае чытанне», якое можа шмат чаму навучыць і дапамагае пазбегчы пэўных памылак. А для старэйшых падлеткаў, на маю думку, больш падыдуць кнігі таксама сучасных беларускіх аўтараў **Людмілы Рублеўскай і Раісы Баравіковай.** У іх ёсць што прачытаць і пра прыгоды, і пра каханне, і пра ўзаемаадносіны з сябрамі...

5 ФІЛЬМАЎ для сямейнага прагляду

Аляксандра РАМЯНЧУК, прыватны прадпрымальнік:

На пачатку восені ва ўсіх бацькоў, хто мае дзяцей школьнага ўзросту, думкі пра школу. Таму і паглядзець раю фільмы адпаведнай тэматыкі.

1. «Гары Потэр і філасофскі камень». Акрамя таго, што гэтая казачная гісторыя сама па сабе яркая і захапляльная, фільм, на маю думку, можа дапамагчы ў адаптацыі да школы. Калі ваша дзіця закапрызіць, што яму надакучыла вучыць урокі, рана ўставаць, рашаць задачкі і г.д., можна як бы між іншым нагадаць, што нават чараўнікам, калі яны жадаюць чагосьці дасягнуць, даводзіцца шмат вучыцца…

2. «Чучала». Той самы савецкі фільм пра дзіцячыя (а ад таго яшчэ больш выразныя і кантрасныя) жорсткасць і мужнасць, вернасць і здраду, які асабіста мне ў падлеткавым узросце дапамог расставіць вельмі многія жыццёвыя арыенціры. Трэба ведаць, што школа — гэта не толькі разумнае, добрае, вечнае. У ёй бываюць і непрыемныя, і, здаецца, бязвыхадныя сітуацыі, праз якія зможа прайсці толькі па-сапраўднаму моцны чалавек.

3. «Прыгоды Пятрова і Васечкіна, звычайныя і неверагодныя». Раю глядзець абавязкова ўсім разам. Можна колькі заўгодна разважаць аб тым, што дзеці, і тым больш падлеткі, цяпер «не тыя», больш прагматычныя, інфантыльныя, зацікаўленыя інтэрнэтам і камп'ютарамі, а не гульнямі з сябрамі. Але калі вы ўбачыце, як ззяюць вочы дзяцей пасля прагляду, як яны прымяраюць потым на сябе гэтыя ролі, то ўжо не будзеце такімі катэгарычнымі.

4. «Дажывём да панядзелка». Фільм пра тое, што аўтарытэт педагога — рэч не безумоўная. Яе неабходна заслужыць і апраўдаць, як і любоў і давер сваіх вучняў. Ён вельмі падыходзіць як глеба для ўспамінаў і абмеркаванняў, наколькі моцна змяніліся школы з савецкіх часоў.

5. «10 прычын маёй нянавісці». Зусім не глыбокая, досыць смешная і «абсалютна амерыканская» кінастужка, якая, як мне здаецца, тым не менш, можа быць карыснай. Каб дзеці ўбачылі, «а як у іх», і зразумелі, што наогул не важна, якога колеру школьная форма, ці шмат задаюць урокаў на дом і ці строгія або дэмакратычныя настаўнікі вядуць заняткі. Ёсць пытанні стасункаў, якія аднолькава хвалююць падлеткаў ва ўсім свеце.

■ Пясочніца

Я не скнара

Шасцігадовая Ліза есць шакаладную цукерку. Дзядуля робіць заўвагу: «Пачастуй сястрычку, не будзь скнарай». Ліза працягвае малодшай двухгадовай сястры спэцканую ў шакаладзе руку: «На, аблізвай».

Вырашальны аргумент

У краме дзяўчынка цягне тату за руку:

— Глядзі, які мішка! Тата, ты мне яго купіш?

— А ён табе патрэбны? — з сумневам у голасе перапытвае бацька.

— Так, — упэўнена адказвае дзяўчо, — як табе новая машына!

Вуснамі немаўляці

Дзімка з мамай вяртаюцца з дзіцячага садка. Толькі ўваходзяць у кватэру, як недзе за сцяной «заспяваў» дрыль. Хлопчык, абурана:

Фота Анатоля КПЕШЧУКА.

— Што за дурны дзядзька! Тут, між іншым, людзі стомленыя прыйшлі з дарослай працы і з дзіцячай працы, а ён рамонт задумаў!

Ніяк не

— Тата, а ты ў парк са мной пойдзеш? — пытаецца пяцігадовы Сашка.

— Так.

— А на машынах катацца?

— Пайду.

— А ў армію са мной пойдзеш?

— Не.

— Што, без мяне?!

Кожнаму сваё

На дачы ўся сям'я снедае на тэрасе. Мама ў задуменні кажа:

— Газон пакасіць трэба.

Шасцігадовая Віка:

— Мульцік паглядзець трэба.

Трохгадовая Паліна, сумна:

— Кашу даесці трэба…

■

Адказная за выпуск Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

ДВА СУСВЕТЫ МІШЫ ЧОРНАГА

У паэзіі для калмыка Міхаіла Хонінава, якога адразу пасля вызвалення Беларусі адправілі больш як на дзесяць гадоў у Сібір, існавалі два архетыпы — беларускія хвоі і калмыцкія цюльпаны. Чаму ж такая любоў да ўсяго беларускага была ў легендарнага партызана, якога на Магілёўшчыне і Міншчыне ведалі як Мішу Чорнага? Пра гэта нам расказала дачка героя вайны і народнага героя Калмыкіі. Рыма ХАНІНАВА — вучоны-літаратуразнавец, кандыдат філалагічных навук, загадчык кафедры на філалагічным факультэце Калмыцкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Паэт. Перакладчык. Піша на рускай і калмыцкай мовах.

— Рыма, імя Міхаіла Хонінава вядома ў Беларусі... Як партызана, як пісьменніка, які сябраваў з беларускімі калегамі, як паэта, якога досыць часта перакладалі на беларускую мову...

— Перш-наперш хачу падзякаваць беларускім сябрам за ўвагу да жыцця і творчасці Міхаіла Хонінава. Трыццаць тры гады яго няма з намі. Гэта, па канцэпцыі Веліміра Хлебнікава, змена аднаго пакалення. Таго пакалення, якое асабіста ведала майго бацьку, сябравала з ім, стасавалася ў творчасці, а ў час Вялікай Айчыннай вайны ваявала супраць фашызма плячом да пляча, дало яму легендарнае імя Міша Чорны.

Паняцці Міхаіл Хонінаў — Міша Чорны — Беларусь складаюць непадзельную трыяду. У нас, у Калмыкіі, Міхаіл Хонінаў і Беларусь звязаны перш за ўсё з ваенным перыядам, а таксама з беларускай тэмай у творчасці бацькі.

Калі ў Элісце выйшаў зборнік «Маці мая, Беларусь», побач з вершамі беларускіх паэтаў былі і вершы бацькі. Знакаміты верш «Маці з Беразіны», прысвечаны Праскоўі Андрэеўне Віліткевіч з вёскі Месціна, якая выратавала бацьку, што вырваўся з акружэння пад Смаленскам, чытаўся заўсёды ім на кожнай сустрэчы з чытачамі. У верасні 1944 года, пасля вызвалення Беларусі, ён быў дэмабілізаваны з арміі ў званні лейтэнанта і прабыў трынаццаць гадоў у Сібіры. У перыяд сталінскіх рэпрэсій, калі калмыцкі народ быў несправядліва дэпартаваны. У 1957 годзе пасля вяртання на радзіму ўзнавіліся яго кантакты з беларусамі. З 1960 года і да канца жыцця ён часта бываў на беларускай зямлі, сустракаўся з баявымі таварышамі, калегамі, браў з сабою жонку і малодшага сына. У сямейным архіве беражліва захоўваюцца перыёдыка з яго інтэрв'ю, успамінамі, вершамі і прозай у перакладах на рускую і беларускую мовы. Асабліва цікавымі падаюцца заметкі і нарысы пра сустрэчы Мішы Чорнага са сваімі вернымі пабрацімамі і жыхарамі тых вёсак, якія ён выратаваў ад гібелі і адпраўкі на чужбіну і якія вельмі дапамагалі партызанам. Здымкі перадаюць радасць і шчасце агульных стасункаў, яны занатавалі душэўную атмасферу. Здаецца, што чуеш галасы скрозь час. Гэта не пастановачна арганізаваныя кадры, а само жыццё — шчырае, адкрытае, напоўненае ўзаемнай павагай і любоўю. Дарэчы, шмат нумароў «Звязды»...

Бацька вельмі ганарыўся двума мінскімі зборнікамі, якія складзены з перакладаў яго вершаў сябрамі-паэтамі. Сярод іх, напрыклад, Максім Танк, Сяргей Грахоўскі, Рыгор Барадулін, Аляксей Пысін. Калі «Хвоі і цюльпаны» пераклаў дзясятак паэтаў, то «Журавы над стэпам» — адзін Аляксей Пысін. Бацька пайшоў з жыцця 22 верасня, а яшчэ летам, калі даведаўся пра смерць гэтага сябра, быў вельмі азмрочаны.

У «Магілёўскай праўдзе» ў скарачэнні друкаваўся пераклад дакументальнай аповесці Хонінава «Міша Чорны — гэта я!» Меркавалася зрабіць асобнае кніжнае выданне гэтага твора. Але пры жыцці бацькі аповесць у Беларусі не выдалі. І гэта яго засмуціла. Размова ж у аповесці не толькі пра бацьку, але і пра яго партызанскіх паплечнікаў — Аляксандра Дзямідава, Міхаіла Альшэўскага, Рамана Шчарбакова, Пятра Казлова і іншых. Гэтая кніга на рускай мове ў 1976 годзе выйшла ў «Бібліятэчцы часопіса «Огонёк»і выклікала вялікі рэзананс.

— Лёс Хонінава ваенных гадоў наклаў своеасаблівы адбітак на яго творчасць, на ўсё наступнае жыццё. Чым увогуле была Беларусь для вашага бацькі? Як часта ён успамінаў партызанскія гады ў нашай старонцы?

— Лёс Міхаіла Хонінава, як пісаў яму Максім Танк, калі звязаць яго з лёсам народа, больш грандыёзны, чым многія сусветныя эпапеі. Мяркуйце самі. З васьмі дзяцей у яго сям'і выжыла пяцёра, ён быў малодшым. Разам са старэйшым братам Ліджы яны вучыліся ў Калмыцкім тэхнікуме мастацтваў у Астрахані на акцёрскім аддзяленні, сталі першаадкрывальнікамі Калмыцкага драматычнага тэатра, абодва пісалі вершы, Ліджы быў прызваны ў войска ў 1938-м, бацька — у 1939 годзе. З вайны з чатырох братоў вярнуліся двое, астатнія загінулі. З кастрычніка 1939 года бацька служыў у Забайкальскай ваеннай акрузе, быў камандзірам снайперскага ўзвода. Малодшым лейтэнантам сустрэў вестку пра вайну ў Ташкенце. Яго полк перадыслацыравалі на Захад. Ужо 10 ліпеня 1941 года ён удзельнічаў у баях. Пасля акружэння ваяваў у партызанскіх атрадах на смаленскай і беларускай зямлі. Яго роту фашысты называлі «дзікай дывізіяй», а за яго галаву давалі 10 тысяч акупацыйных марак. Ён ваяваў на Міншчыне і Магілёўшчыне. Пасля вайны стаў ганаровым грамадзянінам горада Беразіно.

Ён не быў дома шэсць гадоў, а вярнуўся ў Сібір, дзе тады знаходзілася яго сям'я. У верасні 1944 года ён піша пісьмо пад назвай «Бывай, родны стэп!», у якім спрабуе разабрацца ў прычынах сталінскага генацыду, імкнецца заступіцца за праўду. Гэта пісьмо зараз знаходзіцца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Калмыкія. Захоўваў той ліст усю ссылку, нягледзячы на магчымыя суровыя наступствы. Тэме дэпартацыі бацька прысвяціў забароненую паэму «Мой шлях», якую ўжо я надрукавала як вернуты да жыцця твор, а затым пераклала на рускую мову. Вялікае месца ў паэме займае ваенная тэма, звязаная з Беларуссю. Як я ўжо гаварыла, бацька вершы пісаў да вайны, яго літаратурны дэбют адбыўся ў 1935 годзе. Але, зразумела, сапраўдным пісьменнікам яго зрабіла вайна. Міхаіл Матусоўскі назваў яго калмыцкім Дзянісам Давыдавым. Міхаіл Хонінаў лічыў сваім абавязкам адлюстраваць гісторыю ў тварах і падзеях, каб не паўтарылася трагедыя, каб помнілі тых, хто пайшоў з жыцця, баронячы Айчыну. У Калмыкіі такая пазіцыя іншымі рэцівымі дзеячамі ад улады і літаратуры была ўспрынята як самаўсхваленне, яго абвінавачвалі ў нясціпласці, аўтабіяграфічнасці твораў і іншых «грахах». Спрачаючыся з такімі ацэнкамі, ён і аповесці пра партызанскія гады даў такую дэманстратыўную назву. А ў яго рамане «Памятаеш, зямля смаленская...» героя завуць Мутул Хоніеў. У рамане ёсць і старонкі беларускага перыяду. Пасля таго, як бацька пайшоў у іншы свет, надрукавалі яго дакументальную аповесць «Бітва працягваецца», і ў гэтым творы гучыць беларуская тэма. Пра Беларусь — не толькі вершы, не толькі паэмы, прысвечаныя мінулай вайне, — «Званы Хатыні», «Мой райкам», а таксама вершаваная аповесць «Не страляйце ў радзіму маю», не перакладзеная на рускую мову паэма «Ніна Рак — беларуска», але і апавяданні, як, напрыклад, «Як я быў канакрадам», нарысы. Ён нам, дзецям, шмат расказваў пра Беларусь, мы завочна палюбілі вашу старонку. Чыталі кнігі беларускіх аўтараў, якія і зараз захоўваем. Разглядвалі здымкі з бацькоўскіх паездак па Беларусі. Слухалі і спявалі беларускія песні. Любімым ансамблем бацькі былі «Песняры». У нас і зараз захоўваюцца падараваныя бацьку беларускім майстрам выразаныя з дрэва шахматы. Прычым усе фігуркі там у нацыянальных касцюмах.

У беларускай вёсцы, 1976 г.

Беларусь сапраўды стала другой радзімай Міхаілу Хонінаву. Ён заўсёды прыязджаў ад вас як быццам насычаны, падсілкаваны любоўю і павагай дарагіх яму людзей. Мне здаецца, што больш за ўсё ў жыцці ён шанаваў гэтую повязь. У сябе, на радзіме, ён часта сутыкаўся з нядобразычлівасцю, праследваннямі, даносамі...

— У пасляваенныя гады неаднойчы прадпрымаліся крокі па прысваенні Міхаілу Хонінаву звання Героя Савецкага Саюза. Раскажыце, калі ласка, пра гэта больш падрабязна...

— Бацька заўсёды даражыў тым, што яго ведаюць не толькі як Міхаіла Хонінава, але і як Мішу Чорнага. У 1957 годзе яго былыя партызанскія камандзіры Сідарэнка, Віліткевіч, Шчарбакоў звярнуліся ў Калмыцкі абкам КПСС з хадайніцтвам аб прысваенні Хонінаву звання Героя Савецкага Саюза. Да свайго пісьмовага звароту прыклалі баявыя характарыстыкі. Падкрэсліваю, адразу пасля вяртання на радзіму калмыцкага народа, які быў абвінавачаны ў здрадзе ў гады мінулай вайны, сасланы навечна. Гэта ж як трэба было верыць у гістарычную справядлівасць і ў дачыненні да народа, і ў дачыненні да яго прадстаўніка! Якую трэба было мець уласную грамадзянскую і патрыятычную пазіцыю! Дык вось дакументам, якія не пайшлі ў Маскву, было перакрыта «зялёнае святло» з-за складаных адносін бацькі з партыйнай наменклатурай. Другі раз, да 20-годдзя Перамогі, ужо Праўленне Саюза пісьменнікаў Калмыкіі на чале з Давідам Кугульцінавым хадайнічала пра высокае званне Міхаілу Хонінаву. Тады працэдуру мясцовая ўлада, верагодна, наўмысна зацягнула. Ва ўсялякім выпадку, адпаведныя дакументы патрапілі ў Маскву позна, дата прайшла. А вось другога калмыка, які партызаніў на Браншчыне, тады ж узнагародзілі.

Землякі ж лічаць Міхаіла Хонінава народным героем...

— Паэма Міхаіла Хонінава пра Хатынь... Наколькі значнай яна ўяўляецца ў кантэксце ўсёй яго творчасці?..

— Паэму пра Хатынь Міхаіл Хонінаў задумаў даўно. У 1969 годзе ён разам з жонкай быў запрошаны на адкрыццё мемарыяла ў Хатыні. Тады ж у адным інтэрв'ю расказаў пра сваю творчую задумку. У бацькі быў, кажучы сучаснай мовай, творчы праект — трыпціх пра спаленыя вёскі Лідзіцу, Сонгмі, Хатынь. У 1975 годзе ён пабываў у В'етнаме. Але створана была толькі першая частка — «Званы Хатыні». У сваім творы ён піша пра тое, што быў знаёмы з жыхарамі гэтай беларускай вёскі... У мяне ёсць артыкул на тэму Хатыні ў творчасці Міхаіла Хонінава і Давіда Кугульцінава, які прысвяціў гэтай трагедыі верш «Хатынь».

— Архіў Міхаіла Хонінава... Наколькі ў ім прадстаўлены беларускія інтарэсы вашага бацькі?

— Архіў бацькі вельмі вялікі, поўнасцю не разабраны. У ім — вельмі шмат беларускіх газет, часопісаў за розныя гады. Ёсць вялікая перапіска з пісьменнікамі. Ёсць аўтографы Петруся Броўкі, Максіма Танка, Васіля Быкава, Івана Шамякіна, Аляксея Пысіна і іншых сяброў.

— Міхаіл Хонінаў вядомы як перакладчык беларускай паэзіі. Выдаў кнігу Купалы на калмыцкай мове. Ці былі ў яго іншыя перакладчыцкія планы ў дачыненні да прадстаўлення беларускай паэзіі на калмыцкай мове?

— Так, Міхаіл Ванькаевіч высока цаніў беларускую класіку — пераклаў вершы Янкі Купалы і Якуба Коласа. А таксама пераклаў творы Петруся Броўкі, Аркадзя Куляшова, Максіма Танка, Эдзі Агняцвет і шмат яшчэ каго. Частка з перакладаў была надрукавана ў калмыцкім літаратурным часопісе і ў газеце «Калмыцкая праўда». Невялікая кніга перакладаў з паэзіі Купалы пабачыла свет у 1962 годзе, да юбілею паэта. Хонінаў меркаваў уключыць раздзел з перакладамі ў першую сваю кнігу — яна выйшла ў 1960 годзе. Але рэдактар зборніка чамусьці зняў пераклады. Пасля бацька хацеў зрабіць асобны зборнік перакладаў беларускай паэзіі. Але і гэта яму не ўдалося ажыццявіць. Заяўку выключылі з тэматычнага плана выдавецтва. Хачу ўсё ж такі ажыццявіць бацькаву мару і асобным раздзелам уключыць пераклады ў яго новую кнігу.

Гутарыў Павел АЛЬСОВЫ

Георгій КАНДРАЦЬЕЎ:

«БУДУ РАБІЦЬ ВЫНІК»

У панядзелак, 8 верасня, наша нацыянальная футбольная дружына стартуе ў новым адборы — да Еўра-2016. А 4 верасня на полі «Барысаў-Арэны» правядзе апошні таварыскі матч перад стартам — супраць зборнай Таджыкістана. Напярэдадні галоўны трэнер нацыянальнай зборнай дружыны Георгій Кандрацьеў падзяліўся з журналістамі сваімі меркаваннямі аб маючых адбыцца стартах. У прыватнасці, расказаў аб тым, чаму не выклікаў у склад зборнай Віталя Радзівонава, чаго чакаць у гэтым цыкле ад матчаў з камандай Украіны і чаму цяперашні склад нашай каманды можа дамагчыся таго, чаго не ўдавалася ў папярэдніх розыгрышах.

— Георгій Пятровіч, па вашай ініцыятыве ў трэнерскі штаб нацыянальнай каманды ўвайшоў былы член зборнай Аляксандр Кульчы — гулец, які мае самы багаты вопыт падобных выступленняў. З чым была звязана гэтая ваша ініцыятыва і якія ў яго будуць функцыянальныя абавязкі ў калектыве?

— Па-першае, я вельмі рад, што Саша цяпер уваходзіць у трэнерскі штаб зборнай Беларусі. Каб была мая воля, я даўно падцягнуў бы яго да каманды, але Кульчы яшчэ вырашыў пагуляць у Казахстане. Думаю, яму вельмі карысна будзе паварыцца ў нашым соку, тым больш, што Саша ўсіх тут ведае, з гульцамі ў добрым кантакце. Гэта і ёсць яго функцыя ў зборнай — стаць правадніком трэнерскіх ідэй для футбалістаў. Да таго ж у Кульчыя каласальны вопыт — ён сам можа падказаць, як лепш гуляць у тых жа апорных зонах.

— Атрымаў траўму Павел Савіцкі. Ці была ідэя выклікаць замест яго Рэнана Брэсана?

— Рэнан усяго дзве гульні згуляў за новы клуб, забіў гол. Дай Бог, каб ён і далей такімі ж тэмпамі аднаўляў свае ранейшыя гульнявыя кандыцыі. Вы ведаеце, як я да яго цёпла стаўлюся і вельмі чакаю яго ў камандзе. Пільна сачу за яго выступленнямі ў чэмпіянаце Партугаліі.

— Ці былі варыянты таварыскага спарынгу, акрамя Таджыкістана?

— Мы даўно дамовіліся з гэтай зборнай і больш нікога не шукалі. Навошта? Для мадэлявання матча з Люксембургам сапернік нас цалкам задавальняе.

— Георгій Пятровіч, пасля таго, як вы не выклікалі на збор Віталя Радзівонава, Анатоль Капскі, думаецца, на эмоцыях сказаў, што лепш было б, калі б форвард БАТЭ завяршыў бы на гэтым выступленні за зборную Беларусі.

— Ну, вы ж самі сказалі — на эмоцыях. Яшчэ раз паўтару, мы за ўсімі гульцамі вельмі ўважліва сочым. Я асабіста бачыў, як цяжка даюцца Віталю матчы. Менавіта таму цяпер у Радзівонава мікратраўмы. Калі б мы выклікалі яго і, не дай Бог, ён пагоршыць свой фізічны стан, зламаецца — ні нам карысці, ні БАТЭ. Вырашылі, няхай лепш футбаліст адновіцца, калі ў нас усяго адна адборачная гульня з не самым моцным супернікам. Былі б спараныя матчы — прыйшлося б выклікаць Радзівонава.

— Як ставіцеся да пераходу Сяргея Крыўца ў французскі «Мец»?

— Толькі станоўча. Паглядзеў яго першую гульню — поўны стадыён, выдатны антураж паядынку чэмпіянату Францыі. Было відаць, што Сяргей дзейнічаў з вялікім жаданнем, і ў зборную Крывец прыехаў з велізарным жаданнем. Так што дай Бог яму замацавацца ў французскім клубе.

— Вас не хвалюе той факт, што агульны ўдзел нашых варатароў у матчах зборнай складае ўсяго 7 гульняў?

— Ніколькі. Варатары — гэта наогул асобная катэгорыя людзей, іншая псіхалогія. Найвопытнейшы галкіпер Акінфееў грубейшым чынам памыліўся на чэмпіянаце свету. Пройдзе час, будзе ў нашых варатароў добры стаж і практыка. А хлопцы добрыя, але пакуль нестабільныя. У варатарскім мастацтве клас прыйдзе толькі з узростам. Вось Юра Курбыка: у мінскім «Дынама» ніяк не мог зайграць за плячыма Вергіенкі, а як стукнула 35 гадоў, стаў адным з лепшых гульцоў клуба.

— БАТЭ і «Дынама» чакае напружаная еўракубкавая футбольная восень. Гэта новы фактар у планаванні падрыхтоўкі зборнай. Як ён можа адбіцца на справах нацыянальнай каманды?

— Безумоўна, неяк адаб'ецца. Можа, у тым ліку і ў адмоўным сэнсе — у плане траўмаў, перанапружання футбалістаў. Але гэта — нашы праблемы, як падвесці вядучых гульцоў гэтых клубаў да матчаў зборнай. А для краіны, для беларускага футбола поспех барысаўчан і мінчан — гэта адназначны плюс.

— Як будзем пачынаць? Чаго чакаеце ад матча супраць Люксембурга?

— З наскоку яго не возьмеш. Моцны апанент у плане выканання стандартаў. Моцная каманда, высакарослая. Добра кантралюе мяч. Недзе, магчыма, будзем «падціскаць», дзесьці аддадзім тэрыторыю. У нас у Беларусі мала хто з каманд гуляе ў пазіцыйным нападзенні. Таму што мала хто ўмее. Паспрабуем «накрываць» Люксембург, прэсінгаваць. Неабходна выйграваць. Пастараемся падабраць ключыкі.

— Адчуваеце павышаную адказнасць за вынік у новым адборачным цыкле?

— Па ўзроўні адказнасці цыклы мінулы і гэты нічым не адрозніваюцца. Іншая справа, што ў гэтым цыкле адказнасць за вынік будзе значна вышэй. Але не трэба шукаць тут нейкіх падводных камянёў. Гуляць будуць усе самыя моцныя. А то вы пішаце пра любімых маіх гульцоў, потым яны аказваюцца не любімымі. Я буду рабіць вынік, і хлопцы будуць рабіць вынік. Усё будзе накіравана на яго. Магчыма, прыйдзецца звярнуцца да непапулярных мер (якія вы будзеце крытыкаваць), каб выціснуць максімум з гэтай нацыянальнай зборнай.

— У задачах каманды на адборачны цыкл значыцца другое месца і выхад на Еўра-2016 напрамую. Чаму ў гэтай зборнай павінна атрымацца тое, што не выйшла ў ранейшых скліканняў?

— Ну, хоць бы таму, што цяпер у нашай адборачнай групе няма дзвюх такіх зборных, як Іспанія і Францыя. Першапачаткова непад'ёмных. З іншымі калектывамі — украінцамі, славакамі — цалкам можна згуляць на вынік. Іспанцам, хутчэй за ўсё, прыйдзецца ўступіць першае месца, а за другое — пазмагацца. Плюс ёсць яшчэ трэцяе месца для выхаду ў плэй-оф адборачнага турніру.

— Лёс звёў нас з прадстаўнікамі Украіны: нацыянальная зборная, данецкі «Шахцёр» — у еўракубку. Вы, напэўна, сочыце зараз за сітуацыяй у нашых паўднёвых суседзяў. Што нам чакаць ад гэтых матчаў?

— Не толькі сачыў за сітуацыяй, але і з'ездзіў ва Украіну — Мішу Сівакова глядзеў у Адэсе. Назіраў сітуацыю на стадыёнах, бачыў сітуацыю ў краіне. Калі хто-небудзь думае, што гэты хаос ва Украіне нам дапаможа ў футболе, ён глыбока памыляецца. Футбол там згуртаваў людзей проста шалёна. Я гэта сам бачыў. Вось паглядзіце, украінскія футбалісты будуць змагацца ў адборачным турніры да смерці, будуць аддаваць апошнія сілы барацьбе. Гэтая сітуацыя вакол Украіны, асабліва ў футбольным плане, для нас адмоўны фактар. Зараз яе зборная згуляе яшчэ мацней, чым магла б у іншым жыцці.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

■ Тым часам...

ВЫХАВАНЕЦ ПСЖ — У МІНСКІМ «ДЫНАМА»!

Клуб падпісаў кантракт з французскім форвардам Франкам Джа Джэджэ.

Футбаліст пачынаў спартыўную кар'еру ў ПСЖ (2003-2007 гг.), але за каманду правёў літаральна некалькі матчаў. Увесь астатні час здаваўся ў арэнду клубам з другой лігі французскага чэмпіянату. Апошняя «прапіска» Джэджэ — нарвежскі «Сарпсбарг-08» з вышэйшай лігі. За каманду форвард згуляў 14 матчаў і забіў два мячы. Адзначым таксама, што ў 2008 годзе выхадзец з Афрыкі выступаў у складзе нацыянальнай зборнай Кот-д'Івуара на Алімпійскіх гульнях у Пекіне. Апошнія набыткі «бела-сініх» — Чыгозі Удоджы і Умара Бангура — добра асвоіліся ў камандзе. Что прадэманструе Джэджэ?

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ

■ Гучная справа

НАРАДЗІЎСЯ Ў КАШУЛІ

Дарожнае здарэнне з магілёўскім матацыклістам, які пасля сутыкнення з машынай, што рухалася напарадзе, вылецеў з сядзення, перавярнуўся ў паветры і стаў нагамі на дах гэтага ж аўто, адбылося з месяц таму, але ролік з відэарэгістратара і зараз б'е ўсе рэкорды па праглядзе на YouTube.

Дарожную аварыю зафіксаваў відэарэгістратар аднаго з відавочцаў здарэння.

— Матацыкліст на вялікай хуткасці рухаўся паміж палосамі і не паспеў зрэагаваць, калі BMW перастроіўся ў другі рад, — нагадаў падрабязнасці той гісторыі **старшы інспектар ДАІ Магілёўскага аблвыканкама Андрэй КАЛЕСНІК.** — Як высветлілася пры праверцы, кіроўца ўмудрыўся парушыць адразу некалькі пунктаў правілаў — перавысіў хуткасць, сеў на матацыкл не маючы вадзіцельскага пасведчання, ды яшчэ не зарэгістраваў свой транспартны сродак. У выніку ён прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці па ч.2 артыкула 18.19 і па сукупнасці правапарушэнняў аштрафаваны на 20 базавых велічынь. Штраф мог быць яшчэ большым, але кіроўца пацярпелага аўто папрасіў не караць парушальніка за само ДТЗ. Маўляў, ён і так пацярпеў. Добра яшчэ, што застаўся жывы.

Нэлі ЗІГУЛЯ

ИЗВЕЩЕНИЕ

Государственное производственное объединение «Минскстрой»

ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ЗАИНТЕРЕСОВАННЫХ ЛИЦ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ ЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ

объекта «Многоэтажный жилой дом неповышенной комфортности № 26 (по генплану) в микрорайоне «Каменная горка-3» (жилой дом), *опубликованную в газете «Звязда» от 10 мая 2013 года № 85 (27450):*

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений №№ 148, 177, 188, 208, 226, 246, 248 без учета выполнения внутренних отделочных работ для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий: 2-комнатные квартиры – 1450 долларов США, 1-комнатные квартиры – 1500 долларов США.

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади 1-комнатной квартиры № 144 без учета выполнения внутренних отделочных работ для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий: - 1450 долларов США.

Стоимость 1 кв. метра общей площади фиксируется в долларовом США эквиваленте и остается неизменной в долларовом США эквиваленте до окончания действия договора создания объекта долевого строительства. Оплата производится в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату зачисления денежных средств на специальный и расчетный счет застройщика.

При единовременной уплате всей суммы по договору создания объекта долевого строительства в течение 10 (десяти) банковских дней со дня регистрации договора в Мингорисполкоме стоимость 1 кв.м общей площади уменьшается на сумму, эквивалентную 50 долларам США.

Заявления о долевом строительстве квартир будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящих изменений в проектную декларацию в кабинете 105, по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ГПО «Минскстрой» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим претендентом.

Генеральный директор *Н.В.Милошевский*

УНП 100071325

ИЗВЕЩЕНИЕ

Государственное производственное объединение «Минскстрой»

ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ЗАИНТЕРЕСОВАННЫХ ЛИЦ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ ЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ

объекта «Строительство многоквартирных жилых домов типовых потребительских качеств №№ 9, 11 (по генплану) со встроенно-пристроенными помещениями в жилом квартале в границах ул. Янковского – ул. Горецкого – ул. Проектируемой». Жилой дом № 11 по генплану» в г. Минске, *опубликованную в газете «Звязда» 4 октября 2013 года:*

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилого помещения № 92 с учетом выполнения внутренних отделочных работ для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, составляет 1 350 долларов США.

Стоимость 1 кв. метра общей площади фиксируется в долларовом США эквиваленте и остается неизменной в долларовом США эквиваленте до окончания действия договора создания объекта долевого строительства.

Оплата производится в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату зачисления денежных средств на специальный и расчетный счет застройщика.

При единовременной уплате всей суммы по договору создания объекта долевого строительства в течение 10 (десяти) банковских дней со дня регистрации договора в Мингорисполкоме стоимость 1 кв.м общей площади уменьшается на сумму, эквивалентную 50 долларам США.

Заявления о долевом строительстве квартир будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящих изменений в проектную декларацию в кабинете 105, по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ГПО «Минскстрой» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим претендентом.

Генеральный директор *Н.В.Милошевский*

УНП 100071325

ИЗВЕЩЕНИЕ

Государственное производственное объединение «Минскстрой»

ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ЗАИНТЕРЕСОВАННЫХ ЛИЦ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ НЕЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ

объекта «Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-6. Жилой дом № 17 по генплану» в г. Минске, опубликованную в газете «Звязда» 7 декабря 2012 года:

Ожидаемый ввод нежилого помещения общественно-бытового назначения № 2 в эксплуатацию – 1 декабря 2014 года.

Генеральный директор *Н.В.Милошевский*

УНП 100071325

■ Экслібрыс «Звязды»

ЗМЯСТОЎНАСЦЬ ПАЭТЫЧНАЙ ФОРМЫ

Змітрок Марозаў. Вачыма сэрца. — Мінск: Чатыры чвэрці, 2014. — 290 с.

У выдавецтвах заходнееўрапейскіх краін рыхтаваць да выпуску кнігі паэзіі лічыцца справай рызыкоўнай і непрыбытковай. Зборнікі вершаў сучасных паэтаў там выходзяць надзвычай маленькімі накладамі і загадзя прапісваюцца ў бюджэце выдавецтва як праекты, выдаткі на падрыхтоўку якіх павінны кампенсавацца са звышпрыбытку, атрыманага ад продажу бестселераў. Тамтэйшы рынак патрабуе раманаў. Ці на крайні выпадак — класічных вершаў, выдадзеных у падарункавым варыянце з вытанчаным афармленнем.

Іншае становішча назіраем у Беларусі. Тут выдаўцы не адмаўляюцца ад вершаў, а наклады паэтычных зборнікаў амаль роўныя накладам прозы. Нездарма ж нашу зямлю называюць краінай паэтаў. Тут людзі любяць чытаць (і часта пісаць) вершы. Выхад новай кнігі паэта Змітрака Марозава — выдатная нагода гэта яшчэ раз пацвердзіць. Дарэчы, тыраж выдання — 1000 асобнікаў. Пагадзіцеся, прыстойная лічба. Але думаецца, нашы выдаўцы робяць стаўку не толькі на любоў беларусаў да паэзіі — гэта было б надта рызыкоўна. Можна назваць, напэўна, адну аб'ектыўную і некалькі суб'ектыўных прычын для такога смелага кроку. Пачну з аб'ектыўнай.

Імя Змітрака Марозава назаўсёды будзе ўпісана ў гісторыю сусветнай паэзіі. Гэта не проста гучныя словы. Справа ў тым, што паэт першым у славянскім свеце ў 1989—1990 гг. напісаў і надрукаваў вянок вянкоў санетаў «Апакаліпсіс душы». Гэта надзвычай складаны паэтычны жанр, які патрабуе не проста ўмелага абыходжання з формай санета, выдатнага майстэрства пісаць вершы, але і здольнасці засяроджвацца і вытрымліваць ідэйную і зместавую цэласнасць усяго вянка вянкоў.

Крыху патлумачу. Думаю, многія ведаюць адметнасці такой паэтычнай формы, як санет. Гэта верш, які складаецца з чатырнаццаці радкоў (зазвычай двух чатырохрадкоўяў і двух трохрадкоўяў). Санеты могуць аб'ядноўвацца ў больш складаную форму — вянок санетаў. Ён складаецца з 15 вершаў. Санеты ў ім нібыта злучаюцца ў кола: апошні радок першага з'яўляецца першым радком наступнага, а апошні, пятнаццаты санет, што называецца «магістральным», павінен утварацца з апошніх радкоў кожнага з санетаў.

Па такім жа прынцыпе чатырнаццаць асобных вянкоў санетаў могуць аб'ядноўвацца ў вянок вянкоў. Да іх дадаецца пятнаццаты вянок — «магістральны». Кожны наступны вянок санетаў пачынаецца радком папярэдняга, а «Вянок магістральны» складаецца з першых радкоў усіх папярэдніх 210 санетаў. Такім чынам, агульная колькасць санетаў у вянку вянкоў — 225. Вось такая паэтычная матэматыка.

Пры гэтым варта памятаць, што паэту трэба не проста напісаць 225 санетаў, якія ўтваралі б адмысловую мазаіку, але і захоўваць іх ідэйнае адзінства па працягу ўсяго вянка вянкоў. На такую складаную працу можа спатрэбіцца не адзін год, а таксама шмат ведаў і цярпення. Напэўна, таму ва ўсёй сусветнай паэзіі набярэцца ўсяго некалькі «вянкоў вянкоў», і адзін з іх — аўтарства беларускага паэта Змітрака Марозава.

Варта падкрэсліць і тое, што Змітрок Марозаў не мае спецыяльнай літаратурнай ці філалагічнай адукацыі (ён скончыў аграномічны факультэт Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках). Ды нельга сцвярджаць, што паэту бракуе ведаў: адметнасці паэтычнай навукі ён асвоіў самастойна. Так, у новы зборнік «Вачыма сэрца» ўвайшоў знакаміты вянок вянкоў санетаў «Апакаліпсіс душы», іншыя вянкі і асобныя санеты паэта. «Санетная» частка займае дзве трэція часткі аб'ёму ўсёй кнігі. Уражвае!

Варта звярнуць увагу і на ўмелае абыходжанне аўтара з жанрам санета. Яшчэ ў пачатку XX стагоддзя многія паэты лічылі санет (як і іншыя традыцыйныя паэтычныя жанры) мёртвай і старой формай, няздольнай даць магчымасць сучаснаму аўтару выказаць уласныя думкі і перажыванні. Змітрок Марозаў паказвае нам, што гэта не зусім так. Нават у пачатку XXI стагоддзя санет мае права на жыццё, яго форма можа быць не цвёрдай, але гнуткай, пластычнай.

Ды не толькі з-за санетаў варта ўзяць у рукі зборнік вершаў Змітрака Марозава. У кнізе сабраны паэтычныя творы, напісаныя аўтарам на працягу апошніх гадоў. Гэта яго развагі пра жыццё і смерць, адзіноту і сяброўства, пра каханне і радзіму, пра маці, вечнасць, прыроду... Здаецца, паэтычная душа аўтара не пакідае па-за ўвагай ніводнай драбніцы, амаль на ўсё адгукаецца добрым традыцыйным вершам. Напрыклад, вось такім:

Што будзе заўтра — не гадаю,
Па днях пражытых не тужу...
Дзень сённяшні я дачытаю,
Радком у сэрцы прапішу.

Марына ВЕСЯЛУХА

СУЧАСНАЯ ІТАЛЬЯНСКАЯ ПРОЗА — НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Пасольства Італіі ў Мінску сумесна з літаратурнай «Прэміяй Стрэга» і парталам www.booksinitaly.it запрашае беларусаў паўдзельнічаць у перакладзе твораў сучасных італьянскіх аўтараў — для знаёмства з імі беларускіх чытачоў.

У рамках праекта «Хто добра пачне...: выберы лепшы пачатак» арганізатары ўсім удзельнікам прадастаўляюць урыўкі з кніг — фіналістаў 2014 года, якія могуць быць загружаны на адпаведнай электроннай старонцы, размешчанай па адрасе www.premiostrega.it/download.htm.

Да ўдзелу ў праекце запрашаюцца выкладчыкі італьянскай мовы і літаратуры кафедраў раманскіх моў беларускіх універсітэтаў, члены грамадскага аб'яднання выкладчыкаў італьянскай мовы «Дантэ», а таксама настаўнікі, якія працуюць у дзяржаўных або прыватных школах замежных моў. Працэдура перакладу наступная: выкладчыкі прадастаўляюць вучням фрагменты пачатку кніг для азнаямленчага чытання. Затым кожны клас ці група студэнтаў выбіраюць урывак, які ім падаецца найбольш удачным і захапляльным, і з дапамогай выкладчыка перакладаюць яго на беларускую ці рускую мовы. Пасля завяршэння калектыўнай работы выкладчыкі адпраўляюць фінальны варыянт перакладу на электронны адрас прэс-службы Пасольства Італіі ў Мінску minsk.stampa@esteri.it. Апошні тэрмін падачы перакладаў — 30 верасня гэтага года.

Пасольства Італіі ў Мінску накіруе літаратурныя пераклады на партал www.booksinitaly.it, які апублікуе электронную кнігу, даступную для ўсіх. Дэмаверсія электроннай кнігі з'явіцца на сайце ў час адкрыцця Сусветнага тыдня італьянскай мовы, які пройдзе ў кастрычніку. Чакаецца, што канчаткова адрэдагаванае выданне перакладаў будзе даступна з 1 снежня 2014 года.

Для даведкі. «Прэмія Стрэга», заснаваная ў Рыме ў 1947 годзе, спрыяла культурнаму адраджэнню Італіі пасля Другой сусветнай вайны. Штогод 400 прадстаўнікоў культуры выбіраюць лепшы твор празаічнага жанру, апублікаваны паміж 1 красавіка папярэдняга года і 31 сакавіка гэтага. Інтэрнэт-партал www.booksinitaly.it — першы сайт, які прасоўвае прадукцыю італьянскіх выдавецтваў, італьянскую мову і культуру ў свеце. Аўтары партала звяртаюцца да сваёй аўдыторыі — літаратурных агентаў, перакладчыкаў, спецыялістаў у галіне раманскіх моў, інстытутаў італьянскай культуры і італьянцаў, якія жывуць за мяжой, на дзвюх мовах — італьянскай і англійскай. Інфармацыйную падтрымку парталу аказваюць Міністэрства замежных спраў Італіі, Міністэрства культуры і турызму, Цэнтр кнігі і чытання, Італьянская асацыяцыя выдаўцоў, Сусветная выстава «ЭКСПО Мілан-2015», рэгіён Ламбардзія, камуна Мілана і Фонд Карыпла.

Надзея НІКАЛАЕВА.

«СОНЕЧНЫ СВЕТ ДЛЯ ЎСІХ»

Віцебскі абласны краязнаўчы музей арганізуе абласное свята-конкурс мастацкага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва для людзей з абмежаванымі магчымасцямі «Сонечны свет для ўсіх». Мерапрыемства пройдзе 5 верасня.

— Галоўная мэта — даць магчымасць стаць бліжэй да мастацтва маладым людзям з абмежаванымі магчымасцямі, іх сацыяльная адаптацыя. Дарэчы, многія з іх займаюцца творчасцю. Прычым некаторыя работы выкананы настолькі прафесійна, што не верыцца ў абмежаваныя фізічныя магчымасці аўтараў. На выставе (яна адкрылася ў будынку віцебскай ратушы), якая будзе прэзентавана ў рамках свята, прадстаўлена больш за 400 творчых работ. Яны выкананыя ў розных тэхніках. Гледачы ўбачаць графіку і жывапіс, драўляную і керамічную скульптуру, мяккую цацку, керамікі, вышыўку, вязанне, вырабы з бісеру, саломкі... Безумоўна, вялікі інтарэс выклікае калекцыя дызайнерскага адзення, — паведамілі «Звяздзе» ў музейнай установе.

Віцебскі конкурс становіцца традыцыйнай акцыяй абласнога ўзроўню. Праграма свята ў гэтым годзе больш разнастайная і цікавая. У канцэртнай зале «Віцебск», дзе сярод іншага праводзяцца і канцэрты міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», пройдзе ўзнагароджанне пераможцаў і ўдзельнікаў конкурсу дыпломамі і памятнымі падарункамі. А творчыя калектывы Цэнтра культуры «Віцебск» пакажуць канцэрт.

У музеі-сядзібе Рэпіна «Здраўнёва» людзей з абмежаванымі магчымасцямі чакаюць тэатралізаваныя экскурсіі, спартыўнае мерапрыемства... А яшчэ, што вельмі цікава, усе ахвотныя змогуць «прымераць» на сябе вобразы персанажаў рэпінскіх карцін, напісаных у Здраўнёве. У рэпінскім садзе (да нашых дзён там захаваліся дрэвы, якія высадзіў мастак. — **А.П.**) арганізуюць чаяванне з дэгустацыяй прадукцыі віцебскіх прадпрыемстваў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

■ Крэатыў

НАСТАЎНІК БУДУЧЫНІ. ЯКІ ЁН?

Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт аб'яўляе конкурс на лепшае сачыненне пра настаўніка, прысвечанае 100-годдзю БДПУ.

Навучэнцам 10-11-х класаў прапануецца выбраць адну з чатырох тэм: «Ёсць такая прафесія — «сеяць разумнае, добрае, вечнае...»; «Настаўнік будучыні: які ён?»; «Настаўнік-мужчына: за і супраць» і «Калі пойдзем са школьнага двара...»: школа ў маім жыцці».

Сачыненне, напісанае на беларускай ці рускай мове, не павінна перавышаць 4 старонкі друкаванага або рукапіснага тэксту. Першы этап конкурсу — з 10 верасня па 1 кастрычніка. Аўтары дваццаці лепшых работ, адабраных журы па вынікаў першага этапу, удзельнічаюць у конкурсе сачыненняў, які праводзіцца непасрэдна ў БДПУ.

Галоўныя крытэрыі ацэнкі конкурсных работ — уменне сфармуляваць сваю аўтарскую пазіцыю, самастойнасць меркаванняў аўтара, арыгінальнасць і нестандартны падыход да раскрыцця тэмы, шчырасць і эмацыянальнасць выкладання, кампазіцыйная стройнасць, паслядоўнасць выкладання матэрыялу і мастацкі густ.

Аўтары сачыненняў, якія зоймуць першае, другое і трэцяе месцы, будуць узнагароджаны ноўтбукамі і планшэтамі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ У кадры

«ЮНЕСКА. БЕЛАРУСКІ СПІС»

Фільмам з такой назвай тэлеканал АНТ адкрыў новы сезон. Стужку можна было паглядзець у межах праекта «Зваротны адлік». Аўтар сцэнарыя — Наталля Голубева, рэжысёр — Таццяна Краўчанка. Нагадаем, 2014 год у нашай краіне праходзіць пад знакам 60-годдзя супрацоўніцтва з ЮНЕСКА.

Сёння з гэтай арганізацыяй у Беларусі шмат плённых культурных кантактаў, сумесныя праекты. Аднак так было далёка не заўсёды. Шлях наладжвання стасункаў з ЮНЕСКА быў цярністым... На міжнародную канферэнцыю ў Лондане па стварэнні ЮНЕСКА, якую склікалі 16 лістапада 1945 года, прыехалі прадстаўнікі больш як 50 краін. Савецкі Саюз ад удзелу адмовіўся, прычым у досыць ультыматыўнай форме. Афіцыйнае паведамленне пра гэта савецкі пасол у Вялікабрытаніі Фёдар Гусеў асабіста ўручыў англійскаму ўраду. Абгрунтаванні такога стаўлення былі зусім фармальнымі.

Фільм вядзе сваё расследаванне прычын адмовы СССР ад удзелу ў міжнароднай арганізацыі. Стваральнікі карціны імкнуцца высветліць, чаму ў савецкага кіраўніцтва была такая жорсткая негатыўная пазіцыя ў дачыненні да аб'яднання, якое не ставіла перад сабой пэўных палітычных задач? Чаму Сталін быў супраць і настойваў на стварэнні ў супрацьвагу ААН Еўрапейскай і Азіяцкай ААН і нават вёў перамовы з кіраўніком урада КНР Чжоў Эньлаем?

Дарэчы, прадстаўнік афіцыйнай Беларусі, першы міністр замежных спраў Кузьма Кісялёў выказаў савецкаму кіраўніцтву супрацьлеглае меркаванне адносна супрацоўніцтва з ЮНЕСКА. У лютым 1947 годзе ён афіцыйна накіраваў у МЗС СССР зварот, у якім даказваў мэтазгоднасць і карысць для рэспублікі ўдзелу ў гэтай арганізацыі. Заўважым, у 1947 годзе рэпрэсіі ў краіне Саветаў яшчэ працягваліся — трэба было мець асаблівую смеласць, каб выказаць іншае меркаванне. І якой была рэакцыя Молатава і Вышынскага на пазіцыю беларускага міністра? Пра ўсё гэта распавядаецца ў фільме.

Статут ЮНЕСКА ў англійскай сталіцы падпісалі прадстаўнікі 37 дзяржаў. У іх ліку аказаліся і саюзнікі СССР — Польшча, Венгрыя, Чэхаславакія, Югаславія. 4 лістапада 1946 года Статут арганізацыі, пасля яго ратыфікацыі дзяржавамі, уступіў у сілу. Гэтая дата і лічыцца днём стварэння ЮНЕСКА. 14 снежня 1946 года статус ЮНЕСКА як спецыялізаванай установы зацвердзіла Генасамблея ААН. Новая міжнародная арганізацыя пачала сваю дзейнасць.

СССР стаў членам арганізацыі толькі пасля смерці Сталіна. У красавіку 1954 года членам ЮНЕСКА стала і Беларусь. Вядома, свой патэнцыял у супрацоўніцтве з гэтай арганізацыяй наша рэспубліка раскрыла толькі ў перыяд незалежнай дзяржавы. Але і тут усё складвалася няпроста. У 1992 годзе заяўку Беларусі аб уключэнні Мірскага замка ў спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА нават не разглядалі, адклалі пад падставай неабходнасці вывучэння аналагічных замкаў абароннага тыпу ў Еўропе. А Нясвіжскі замак і зусім прызналі бесперспектыўным аб'ектам, які не можа прэтэндаваць на высокі статус сусветнай культурнай каштоўнасці. Што прыйшлося пераадолець маладой беларускай дзяржаве, каб заявіць пра сябе ў свеце праз унікальную культурную спадчыну, таксама адлюстравана ў фільме «ЮНЕСКА. Беларускі спіс».

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ

ИЗВЕЩЕНИЕ

Государственное производственное объединение «Минскстрой»

ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ЗАИНТЕРЕСОВАННЫХ ЛИЦ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ ЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ

объекта «Комплексный проект застройки жилой территории в границах улиц Притыцкого, Скрипникова, Одинцова, Лобанка (микрорайон № 3)». Жилой дом № 36 по генплану в г. Минске, опубликованную в газете «Звязда» 31 декабря 2013 года:

УНП 100071325

Стоимость строительства 1 кв. метра общей площади жилых помещений № 127, № 143 с учетом выполнения внутренних отделочных работ для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий: 3-комнатные квартиры – 1330 долларов США.

Стоимость 1 кв. метра общей площади фиксируется в долларах США и остается неизменной в долларах США до окончания действия договора создания объекта долевого строительства. Оплата производится в белорусских рублях по курсу Национального банка Республики Беларусь на дату оплаты денежных средств на специальный и расчетный счет застройщика.

При единовременной уплате всей суммы по договору создания объекта долевого строительства в течение 10 (десяти) банковских дней со дня регистрации договора в Мингорисполкоме стоимость 1 кв.м общей площади уменьшается на сумму, эквивалентную 50 долларам США, и составит 1280 долларов США.

Заявления о долевом строительстве квартир будут приниматься (регистрироваться) через 5 календарных дней, а договоры создания объекта долевого строительства будут заключаться через 7 календарных дней после опубликования настоящих изменений в проектную декларацию в кабинете 105, по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А непосредственно с гражданами, подавшими заявления, либо с их представителями, действующими на основании доверенности, оформленной в установленном законодательством порядке.

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и ГПО «Минскстрой» оставляет за собой право заключить договор на заявленную квартиру с другим претендентом.

Генеральный директор *Н.В.Милошевский*

ОБЪЯВЛЕНИЕ
о проведении аукциона по продаже в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов

1. Дата, время, место проведения аукциона	**08 октября 2014 года в 14.00 в здании Великодолецкого сельского Дома культуры, ул. Лесная, 2 А**
2. Адрес участка	**д. Ветче, 22, Великодолецкого сельсовета, Ушачского района, возле озера Ветче**
3. Площадь участка	**0,250**
4. Кадастровый номер	**224980702601000028**
5. Начальная цена	**15 000 000 руб.**
6. Шаг аукциона	**2 000 000 руб.**
7. Место, дата, время начала и окончания приема заявлений и прилагаемых к ним документов: **Ушачский район, аг. Великие Дольцы, ул. Центральная, 1 Б, в рабочие дни с 9.00 до 16.00 с 04.09.2014 по 03.10.2014 включительно.** 8. Размер задатка: **2 000 000 рублей вносится на расчетный счет: Великодолецкий сельский исполнительный комитет 3641328011094 в ф-ле № 216 ОАО «СБ «Беларусбанк» г. Полоцк, код 150801648, УНП 300007086, ОКПО 28677750.** 9. Адрес и номер контактного телефона: **Ушачский район, аг. Великие Дольцы, ул. Центральная, 1 Б, Великодолецкий сельисполком, 8-02158-23323, 23338, 1830923 (Velcom) в рабочие дни с 8.00 до 16.00.**	

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
по продаже земельных участков в частную собственность

Дата, время и место проведения аукциона, организатор торгов	**Аукцион состоится 18 сентября 2014 г. в 11.00 по адресу: г. Жлобин, ул. Петровского, 45 (подъезд 2, этаж 1) КУП «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью»**					
Номер лота	**1**	**2**	**3**	**4**	**5**	**6**
Адрес земельного участка	Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. 60 лет Победы, д. 26	Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, пер. Свободы 1-й, 15	Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, пер. Свободы 4-й, д. 15	Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Казакова, д. 10	Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Казакова, д. 8	Гомельская область, Жлобинский район, г. Жлобин, ул. Казакова, д. 6
Кадастровый номер участка	321850100003003660	321850100003003544	321850100001001338	321850100001001757	321850100001001758	321850100001001759
Площадь, га	0,0868	0,1111	0,0875	0,0999	0,1001	0,1000
Целевое назначение	для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (размещение объектов усадебной застройки)					
Условия и ограничения	1. победителю либо единственному участнику несостоявшегося аукциона в течение 10 рабочих дней с даты утверждения протокола результатов аукциона: - внести плату за земельный участок (часть платы в случае предоставления рассрочки ее внесения в установленном порядке); - возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документов, необходимых для его проведения, формированием земельного участка, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого участка; 2. после совершения победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона действий, названных в п. 1, в двухмесячный срок осуществить государственную регистрацию земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него в установленном порядке; 3. получить в установленном порядке техническую документацию и разрешение Жлобинского районного исполнительного комитета на строительство одноквартирного жилого дома; 4. приступить к строительству одноквартирного жилого дома в течение одного года, со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного жилого дома; 5. снять на занимаемом земельном участке плодородный слой почвы и использовать его согласно проектной документации; 6. завершить строительство объекта в сроки, определенные законодательством; 7. по мере изменения фактического состояния и характера использования земель обратиться в райисполком для внесения сведений об изменении видов земель в государственный земельный кадастр.					
Начальная стоимость, рублей	21 522 060	27 325 600	21 521 062	16 746 936	16 780 464	16 763 700
Сумма задатка, рублей	2 100 000	2 700 000	2 100 000	1 600 000	1 600 000	1 600 000
Затраты по изг. зем. документации, рублей	4 943 693	50 000	50 000	1 997 991	2 004 045	2 130 123
Стоимость расходов по орг. и проведению аукциона (ориент.), рублей	1 000 000	1 000 000	1 000 000	1 000 000	1 000 000	1 000 000
Характеристика территории и расположенных на участке инженерных коммуникаций; строений и сооружений; инженерно-геологические условия: Участки свободны от застройки (инженерно-геологические условия будут определены на стадии производства проектно-изыскательских работ)						
Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории: общие сети и сооружения инженерной инфраструктуры отсутствуют						

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь 26.03.2008 г. № 462.

Организатор торгов – КУП «Жлобинский центр управления районной коммунальной собственностью». Контактные телефоны: 8 (02334) 3 14 08, 2 18 18.

Документы принимаются по адресу: г. Жлобин, ул. Петровского, 45 (подъезд 2, 1 этаж) по 15 сентября 2014 года (с 9.00 до 17.00).

Перечисление суммы задатка осуществляется на расчетный счет Организатора аукциона № 3012006530013 в филиале № 312 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Жлобин, код МФО 151501673, УНН 490317354, сумма задатка победителя аукциона засчитывается при оплате им стоимости предмета аукциона.

Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) подает необходимые документы для участия в аукционе.

Всем желающим представляется возможность предварительно ознакомиться с документами по объекту и с объектом в натуре.

Объявления о проведении предыдущих аукционов были опубликованы в газете «Звязда» № 205 (27570) от 30.10.2013 года и № 59 (27669) от 01.04.2014 года, № 103 (27713) от 05.06.2014 года.

Полный текст извещения о проведении аукциона размещен на сайте Жлобинского райисполкома gisp.gov.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА 06.10.2014 в 11.00 по адресу: 230015, г. Гродно, ул. Горького, 87 А, каб. №204, по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества сроком на пять лет для производственных целей (за исключением вредных производств), размещения офисов, складских помещений, оказания услуг.

Организатор аукциона – РУП «Белтелеком» в лице Гродненского филиала, 230015, г. Гродно, ул. Горького, 87 А.

Адрес арендуемого имущества	№ Лота	Площадь, кв.м	Коэффициент от 0,5 до 3,0	Начальная цена продажи, базовые арендные величины*	Размер задатка, базовые арендные величины*	Характеристика
Капитальное строение, здание гаража (принадлежность здания АТС-2), 1-й этаж, помещение, Гродненская область, Лидский район, г. Лида, б-р князя Гедимина, д. 3	1	64,6	3,0	16,15 *	1,615 *	Помещение находится на первом этаже одноэтажного кирпичного здания в центральной части города. В помещении есть естественное освещение, электроснабжение, центральное отопление. В здании имеется канализация, водоснабжение. Помещение является проходным. Помещение находится в удовлетворительном состоянии.
Капитальное строение, здание гаража (принадлежность здания АТС-2), 1-й этаж, помещение, Гродненская область, Лидский район, г. Лида, б-р князя Гедимина, д. 3	2	15,8	3,0	3,95 *	0,395 *	Помещение находится на первом этаже одноэтажного кирпичного здания в центральной части города. В помещении есть естественное освещение, электроснабжение, центральное отопление. В здании имеется канализация, водоснабжение. Вход в помещение осуществляется через помещение площадью 64,6 кв.м. Помещение находится в удовлетворительном состоянии.
Капитальное строение АТС-2, 3-й этаж, помещение, Гродненская область, Лидский район, г. Лида, б-р князя Гедимина, д. 3	3	41,2	2,5	10,3 *	1,03 *	Помещение находится на третьем этаже четырехэтажного кирпичного здания в центральной части города. Здание имеет удобные подъездные пути. В помещении имеется естественное освещение, электроснабжение, центральное отопление, телефонизировано. В здании имеется канализация, водоснабжение. Помещение находится в удовлетворительном состоянии.
Капитальное строение АТС-2, 3-й этаж, помещение, Гродненская область, Лидский район, г. Лида, б-р князя Гедимина, д. 3	4	70,4	1,5	17,6 *	1,76 *	Помещение находится на третьем этаже четырехэтажного кирпичного здания в центральной части города. Здание имеет удобные подъездные пути. В помещении имеется естественное освещение, электроснабжение, центральное отопление, телефонизировано. В здании имеется канализация, водоснабжение. Помещение находится в удовлетворительном состоянии.
Капитальное строение АТС-2, 1-й этаж, помещение, Гродненская область, Лидский район, г. Лида, б-р князя Гедимина, д. 3	5	79,8 в т.ч. 74,9 4,9	3,0	19,95 *	1,995 *	Помещения находятся на первом этаже четырехэтажного здания в центральной части города. В помещениях имеется электроснабжение, центральное отопление, телефонизировано. В помещении 74,9 кв.м. имеется естественное освещение, в помещении 4,9 кв.м – отсутствует. В здании имеется канализация, водоснабжение. Помещения находятся в удовлетворительном состоянии.
Капитальное строение АТС-2, 1-й этаж, помещение, Гродненская область, Лидский район, г. Лида, б-р князя Гедимина, д. 3	6	4,1	3,0	1,025 *	0,1025 *	Помещение находится на первом этаже четырехэтажного здания в центральной части города. В помещении имеется электроснабжение, центральное отопление, телефонизировано. Естественное освещение, отсутствует. Вход в помещение осуществляется через проходное помещение площадью 33,3 кв.м. В здании имеется канализация, водоснабжение. Помещение находится в удовлетворительном состоянии.

** Оплата в белорусских рублях, исходя из размера базовой арендной величины, установленной в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь на день оплаты.*

Порядок проведения и оформления участия в аукционе определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машиномест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 № 1049 (в ред. постановлений Совмина от 21.06.2012 № 570, от 08.01.2013 № 16, от 12.07.2013 № 607).

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, предоставившие организатору следующие документы: представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет организатору аукциона оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица), документ, удостоверяющий личность, заявление на участие в аукционе, заявление об ознакомлении с документами, порядком проведения аукциона, соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, заверенную банком копию платежного документа, о перечислении задатка на текущий (расчетный) счет организатора аукциона, документ, удостоверяющий личность (для физических лиц, для представителей физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица), доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) (для представителей физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица), копию свидетельства о государственной регистрации (для индивидуальных предпринимателей и юридических лиц – резидентов Республики Беларусь), легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения (для юридических лиц – нерезидентов Республики Беларусь). Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Задаток перечисляется на субсчет 3012000040071 в филиале № 400 ГОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код 752, УНП 500826567 Гродненский филиал РУП «Белтелеком».

Участники аукциона уплачивают штраф в случаях, предусмотренных частью второй пункта 14 Положения о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в республиканской собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 №1049 (в ред. постановлений Совмина от 21.06.2012 № 570, от 08.01.2013 № 16, от 12.07.2013 № 607), в размере 30 базовых величин.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) в течение 3 рабочих дней со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на субсчет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение. Договор аренды по результатам аукциона заключается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

Прием документов на участие в аукционе осуществляется по адресу: 230015, г. Гродно, ул. Горького, 87 А, каб. 407 с 04.09.2014 по 03.10.2014 включительно в рабочие дни (с 9.00 до 16.00). Документы, поданные после 16.00 03.10.2014, не рассматриваются.

Информация о ранее проведенных аукционах была размещена в газете «Звязда» № 216 от 16.11.2013, № 35 от 25.02.2014, № 87 от 14.05.2014, № 93 от 22.05.2014.

Телефоны для справок (0152) 606805, (0152) 606801, факс (0152) 72 02 07.

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ.

СПОСАБЫ ЎБОРКІ ЎРАДЖАЮ АБЛЯПІХІ

Плоданашэнне абляпіхі пачынаецца на трэці—чацвёрты год пасля пасадкі. Калі вашы дрэўцы развіваюцца дрэнна, магчыма, вы перашчыравалі з апрацоўкай глебы і пашкодзілі карэньчыкі, якія залягаюць блізка да паверхні. Каб не нашкодзіць сваёй абляпіне, рыхліце глебу вакол дрэва не глыбей за 5 см!

Абляпіха атрымала назву за сваё багатае плоданашэнне: галінка літаральна аблеплена ягадамі, якія шчыльна сядзяць. Але, як часта гэта бывае, у высокай прадуктыўнасці ёсць і адваротны бок: ягады растуць у такой вялізнай колькасці і настолькі шчыльна прылягаюць да галінкі, што збор пладоў голымі рукамі ператвараецца ў стомны працэс. Да таго ж кароткая пладаножка і калючкі на галінках становяцца сур'ёзнай перашкодай у бітве за ўраджай.

Па-першае, шыпы досыць балюча колюцца, а мяккія ягады пры спробе адлучыць іх ад расліны лёгка расціскацца ў руках, выдзяляючы сок, які бязлітасна шчыпле скуру.

ЮВЕЛІРНАЯ ПРАЦА

Збор абляпіхі ўручную альбо з дапамогай нажніц шырока прымяняецца звычайна тады, калі дрэў на ўчастку нямат. Галоўным мінусам гэтага спосабу з'яўляюцца вялікія праца- і часазатраты. Але, нягледзячы на істотныя недахопы, ёсць у яго і сур'ёзная перавага: так вы не пашкодзіце ні ягаду, ні дрэва.

ДЛЯ ЛЯНІВЫХ

Некаторыя садоўнікі збіраюць ураджай абляпіхі пасля першых замаразкаў. Замарожаныя ягады лёгка абсыпаюцца на папярэдне разасланыя брызент або плёнку ад лёгкіх удараў па ствале або прутамі па галінах. Аднак гэты спосаб недасканалы, бо плады, пакінутыя на галінках, пераспяваюць, псуюцца ад дажджоў і пашкоджваюцца птушкамі. Да таго ж зіма ў нас надыходзіць павольна, маразы чаргуюцца з адлігамі: тады скурка ягад таксама адтае і пры абтрасанні можа аддзяліцца ад мякаці, якая застаецца на галінах.

ПРАВІЛЫ ЗБОРУ АБЛЯПІХІ

Каб палегчыць цяжкі і працаёмкі працэс збору ягад, прытрымлівайцеся трох простых правілаў:

- Вырашыўшы вырошчваць абляпіху ў сябе на ўчастку, аддайце перавагу гатункам з буйнымі ягадамі і сухім адрывам.
- Збірайце ягады ў пачатку паспявання, калі яны ўжо набылі жоўтую або чырвона-аранжавую афарбоўку, але яшчэ не страцілі пругкасці. Пераспеўшы, яны становяцца мяккімі і пры зрыванні расціскаюцца.
- Выкарыстоўвайце прыстасаванні і прылады для хуткага збору пладоў у выглядзе грабянцоў для счэсвання, пяцелек, U-падобных шпілек і т. п.

«СЛЯПЫ» АДБОР

Самы просты і «грубы» спосаб — акуратна зрэзаць з дрэва пладовыя галінкі, каб затым без клопатаў дома абабраць па ягадцы ўручную. Аднак, нягледзячы на ўсе складанасці ўборкі абляпіхі, абломваць галіны ні ў якім разе нельга, за выключэннем зрэзкі сляпых пачаткаў і галін з пладамі, якія растуць унутры кроны. На гэтых кароткіх галінках, якія не маюць прыростаў на верхавіне і амаль цалкам пакрыты пладамі, у асобных гатункаў знаходзіцца да 30% ураджаю. Іх зразаюць секатарам і ўкладваюць у латок, а затым уручную абіраюць плады.

ЯК ПРАВІЛЬНА ЗДЫМАЦЬ ЯБЛЫКІ І ГРУШЫ?

Не паспелі азірнуцца, а час пачынаць збор яблыкаў і груш. Пры гэтым адразу паўстае пытанне: як зрабіць так, каб сабраны ўраджай захаваў свае смакавыя якасці на працяглы час? Для гэтага дастаткова ўсяго толькі правільна яго сабраць...

Усім вядома, што спелы плод у момант яго здымання з пладовай галінкі разам з пладаножкай павінен лёгка аддзяляцца, а насенне мець цёмна-буры колер. Гэта факт. Таму шмат хто перакананы ў тым, што гэтага дастаткова для збору яблыкаў і груш і іх якаснага захоўвання. Аднак гэта крыху не так.

Існуе некалькі правілаў зняцця ўраджаю для наступнага захоўвання.

- Яблыкі і грушы неабходна збіраць вельмі акуратна, не даўшы ўпасці плоду на зямлю. Пашкоджаны фрукт будзе дрэнна захоўвацца.
- Ёсць зусім нескладаная тэхніка збору. Плод бяруць усёй далонню, пасля чаго націскаюць на пладаножку зверху ўказальным пальцам (у месцы яе прымацавання да пладовай галінкі), а затым падымаюць яго ўверх. Калі плод спелы, то ён свабодна аддзеліцца. Пры гэтым яго не варта тузаць або пакручваць — так вы можаце пашкодзіць галінку.
- Варта пачынаць збор пладоў з ніжніх галінак, пакрысе прасоўваючыся да сярэдніх і верхніх. Прычым гэта лепш рабіць пасля сходу расы.
- Для збору ўраджаю лепш за ўсё выкарыстоўваць разнастайныя падстаўкі або лесвіцы. Складваць яблыкі і грушы пажадана ў мяккія кошыкі, звужаныя ўнізе, ёмістасцю да 10 кг і вышынёй каля 35—40 см. Усярэдзіне кошык лепш заслаць тонкім пластом папер або стружкай, а для большага эфекту — абшыць мешкавінай.
- Месца для захоўвання ўраджаю трэба падбіраць згодна з тэмпературна-паветраным рэжымам. Гэта значыць, яблыкі летніх гатункаў лепш за ўсё захоўваюцца пры тэмпературы 1 °С і вільготнасці 80—90%. Напрыклад, пры выкананні вышэй названага рэжыму, ваш ураджай будзе захоўвацца больш за месяц, у адваротным выпадку — не больш за два тыдні.
- Для яблыкаў і груш летніх гатункаў характэрна ападанне пладоў, што вядзе да з'яўлення велізарнай колькасці шкоднікаў, якія назапашваюцца ў ападзе. Таму не лянуйцеся і своечасова збірайце і выносьце з саду ўсе гнілыя і сапсаваныя плады. Гэта лепш рабіць вечарам, не пакідаючы на раніцу, бо пладажэркі вусеня з чарвівых пладоў ноччу перапаўзуць у шчыліны пабудоў і там акукляцца на зімоўку.
- Не зацягвайце са зборам ураджаю, паколькі плады, якія доўгі час знаходзяцца пад сонечным святлом, могуць атрымаць апёкі, якія выклічуць парушэнне скуркі, што пазней адаб'ецца на якасці пладоў і, як вынік, зменшыць час захоўвання.

ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ «У ЦЁПЛУЮ ЗІМУ СА «ЗВЯЗДОЮ»

I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Рэкламная гульня пад назвай «У цёплую зіму са «Звяздою» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі ў тэрмін з 6 верасня па 31 снежня 2014 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на чацвёрты квартал і другое паўгоддзе 2014 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — установа), месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, УНП 100155376.

II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «У цёплую зіму са «Звяздою» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» і складаецца з наступных рэчаў:

№ п/п	Назва	Колькасць (шт.)	Цана за шт. з ПДВ (руб.)	Усяго з ПДВ (руб.)
1.	Хлебапеч Oursson BM1000JY\SS, Кітай	1	1 483 000	1 483 000
2.	Цеплавентылятар Electrolux EFH\C-2115, РФ	7	416 000	2 912 000
УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «У цёплую зіму са «Звяздою» складае 4 395 000 (чатыры мільёны трыста дзевяноста пяць тысяч) беларускіх рублёў.				

III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ

4. Рэкламная гульня «У цёплую зіму са «Звяздою» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на чацвёрты квартал і другое паўгоддзе 2014 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які афарміў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на чацвёрты квартал або другое паўгоддзе 2014 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас установы ў перыяд з 6 верасня па 9 кастрычніка 2014 года выразаная з газеты або з укладыша ў газету запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая змяшчаецца ў газеце не менш чым раз на тыдзень у перыяд з 6 верасня па 4 кастрычніка 2014 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксераканіраваныя або тыя, якія былі дасланы пасля 9 кастрычніка 2014 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ

9. Для правядзення Гульні ўстанова стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні «У цёплую зіму са «Звяздою» (далей — Камісія) у наступным складзе:

Крачава Наталля Ільінічна — намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — старшыня Камісіі;

Члены Камісіі:

Чычко Аксана Мікалаеўна — начальнік упраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта»;

Міхайлічэнка Алена Віктараўна — загадчык аддзела падпіскі і перспектыўных праектаў рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Доўнар Валянціна Аркадзьеўна — рэдактар аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Сянько Аляксандр Анатольевіч — спецыяліст 1 катэгорыі адміністрацыйна-гаспадарчага сектара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда».

10. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ

11. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 14 кастрычніка 2014 года ў 12 гадзін у памяшканні ўстановы па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

12. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

13. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываюцца па адным цеплавентылятары.

Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз — хлебапеч.

14. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні або прадстаўнікоў незалежных арганізацый. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца выйграны прыз і распісваюцца члены Камісіі.

15. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 24 кастрычніка 2014 года ўключна ў газеце «Звязда».

Установа ў тэрмін да 24 кастрычніка 2014 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ

16. Умовай выдачы прызоў з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на 4 квартал або другое паўгоддзе 2014 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на 4 квартал або другое паўгоддзе 2014 года.

17. Адсутнасць у пераможца, які выйграў прыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на 4 квартал або другое паўгоддзе 2014 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

18. Прызы выдаюцца пераможцам у тэрмін па 31 снежня 2014 года ў памяшканні ўстановы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, з 9:00 да 13:00 і з 14:00 да 17:00, за выключэннем выхадных і святочных дзён. Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў, каб атрымаць прыз, установа не аплачвае.

19. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

20. Пасля 31 снежня 2014 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

21. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

22. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, прозвішчы, імёны па бацьку, фатаграфіі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны ўстановай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць установе.

23. Правілы правядзення рэкламнай гульні «У цёплую зіму са «Звяздою» да пачатку рэкламнай гульні будуць апублікаваны сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

24. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефоне (017) 287 18 38.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі рэкламнай гульні №2422 ад 01.09.2014 г., выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

«СПЕЛЫ ВЕРАСЕНЬ З МЁДАМ І ХЛЕБАМ ІДЗЕ»



Па гарызанталі: **1**. «Чырванеюць рабіны над новымі хатамі,\\Спелы ... з мёдам і хлебам ідзе». З верша С. Грахоўскага «Верасень». **4**. «Нібы не верасень, а жнівеньскі той час,\\Калі ... у поўнай яшчэ сіле». З верша Я. Коласа «У вераснёўскі вечар». **8**. Хоць ... грэе, але душа млее (прык.). **9**. У верасні адна ... — ды і тая горкая рабіна (прык.). **11**. Тое, што і памідор. **13**. Вокіс натрыю. **15**. «Як калянае лісце калін,\\Вераснёўскі плыве ...». З верша А. Канапелькі «Восень едзе на рабым кані». **16**. ... у верасні прадвесціць цёплую восень (прыкм.). **17**. За пчолкай — у ..., за жуком — у гной (прык.). **18**. «І восень сумную люблю я,\\І першы ... сярпоў і кос». З верша К. Буйло «Люблю». **19**. Прахаладжальны салодкі напітак. **20**. Умоўнае абазначэнне невядомай асобы. **22**. Сіні колер. **24**. Адступленне ад галоўнай тэмы для высвятлення пабочнага пытання. **28**. Шчасце ... не ходзіць, бяду за сабой водзіць (прык.). **32**. Драўляная пасудзіна з клёпак, з двума вушкамі. **33**. «... раптам пажаўцела,\\Гарыць толькі кроў рабін». З верша С. Брандта «Верасень, як верасень». **34**. «У беларусаў ... працы ёсць,\\Названае калісьці Асянінай». З верша В. Гардзея «Асяніна». **35**. «Зноў верасень -\\Запаслівы ... -\\Шчыруе па імшыстых баравінах». З верша А. Грачанікава «Верасень». **36**. «Хлеб трэба сеяць, мужыкі,\\Без хлеба — дрэнь ...». З верша Л. Галубовіча «Палітыка».

Па вертыкалі: **1**. «Пад шэрую ..., пад верасень месяц,\\Задумаў жаніцца мядзведзь у цёмным лесе». З вершаванай казкі М.Танка «Казка пра мядзведзя». **2**. Гатунак каштоўнай паўднёвай яблыні. **3**. Прыйшоў ... — пайшло лета ад нас (прык.). **5**. Верасень чырвонае ... выпраўляе, восень залатую сустракае (прык.). **6**. Якая-небудзь задума. **7**. У верасні мужыка не ... грэе, а цэп (прык.). **9**. Хлеб ды вада — маладзецкая ... (прык.). **10**. Насякомае. **12**. Як настаў верасень, дык ... кожны дзень (прык.). **14**. Раздажджыцца верасень — на ... мужыку (прык.). **16**. Тое, што і газоўка. **19**. Верасень ... халодны, але сыты (прык.). **21**. «Вераснёвае сонейка промнямі лашчыць зямлю,\\ Размалёўвае ў чырвань і ... соннае лісце». З верша Т. Дзям'янавай «Вераснёвае сонейка промнямі лашчыць зямлю». **23**. Друкарскія літары, што перадаюць які-небудзь тэкст. **25**. «Запахла бульбаю пячонай,\\Туман дыміцца ля ракі.\\Пакінуць ... свой улюблёны\\Не хочуць, раяцца шпакі». З верша П. Броўкі «Верасень». **26**. Што сяло, то нораў, што ..., то абычай (прык.). **27**. Тое, што і іржа. **29**. Беларускае свята, звязанае з памінаннем продкаў. **30**. Як кусок сала, то і ... патрава (прык.). **31**. Кармушка для жывёлы.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ.

г. Дзяржынск.

Праверце, калі ласка, адказы:

Па гарызанталі: 1. Верасень. 4. Цяплынь. 8. Сонца. 9. Ягада. 11. Тамат. 13. Натр. 15. Зарапад. 16. Гром. 17. Мёд. 18. Звон. 19. Морс. 20. Ікс. 22. Сінь. 24. Экскурс. 28. Адно. 32. Цэбар. 33. Трава. 34. Свята. 35. Грыбнік. 36. Палітыка.

Па вертыкалі: 1. Восень. 2. Ранет. 3. Спас. 5. Лета. 6. Намер. 7. Хата. 9. Яда. 10. Аса. 12. Туман. 14. Радасць. 16. Газніца. 19. Месяц. 21. Золата. 23. Набор. 25. Кут. 26. Край. 27. Ржа. 29. Дзяды. 30. Грыб. 31. Яслі.

СЁННЯ

Сонца	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	6.22	19.53	13.31
Віцебск —	6.10	19.45	13.35
Магілёў —	6.13	19.44	13.31
Гомель —	6.12	19.38	13.26
Гродна —	6.38	20.08	13.30
Брэст —	6.41	20.06	13.25

Месяц

Першая квадра 2 верасня. Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *Аляксея, Васілія, Івана, Макара, Міхаіла, Фёдара.* ***К.*** *Ліліяны, Разаліі, Ружы, Майсея.*

Фота Алесі ВАРАБ'ЁВАЙ.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Яна закахалася ў яго, таму што ён быў стройны і маўклівы.

А ён проста фізічна не мог гаварыць і ўцягваць жывот адначасова...

Жанчына скардзіцца сяброўцы:

— Цэлы тыдзень прымушала мужа пачаць рамонт у прыбіральні!

— І што?

— У суботу ён павесіў на ёй аб'яву «Прыбіральня зачынена на рамонт» і пайшоў у гараж!

Жанчыне прыходзіць ад мужа СМС: «Смецце вынес, у краму схадзіў, суп зварыў, дзяцей спаць паклаў». Тая ў шоку. Піша адказ: «ТЫ ТАМ ТОЛЬКІ бігудзі МАЕ не чапай!»

Дзеці — кветкі жыцця :)

Сяджу на дыеце. Сын корміць ката. Чую, кажа яму:

— Ты альбо еш, альбо хавай міску... Наша мамка на дыеце, і я ўначы за яе не адказваю...

Карова, якая вельмі хацела жыць, давала не толькі малако, але і яйкі!

caricatura.ru

Даты Падзеі Людзі

1563 год — у Брэсцкай друкарні выйшла Радзівілаўская Біблія. Першая друкарня на тэрыторыі сучаснай Беларусі з'явілася ў Брэсце. Менавіта тут у 1563-м і ўбачыла свет Біблія, якая да XVIII стагоддзя была самым вялікім па аб'ёме друкаваным выданнем у гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Брэсцкая Біблія, якую называюць яшчэ Радзівілаўскай, — гэта поўны пераклад кніг Біблії на польскую мову. Гравюры-ілюстрацыі выкананы невядомым высакакласным майстрам. Да выдання прыкладаўся таксама прадметны паказальнік. Гэта было ўпершыню ў беларускім кнігадрукаванні. У свеце захавалася ўсяго некалькі асобнікаў гэтага шэдэўра паліграфічнага мастацтва эпохі Рэнесансу.

1781 год — група іспанскіх каланістаў заснавала першае паселішча на тым месцы, дзе сёння стаіць Лос-Анджэлес. Сваё паселішча яны назвалі «горад Маці Божай, каралевы анёлаў» — Эль-Пуэбло-дэ-Лос-Анхелес. Калі ў 1835 годзе горад стаў уладаннем Мексікі, назва скарацілася да Лос-Анхелес. У 1846 годзе пачалася вайна з Мексікай, і праз два гады Мексіка была вымушана аддаць горад у рукі англамоўнага насельніцтва. З тых часоў Лос-Анхелес сталі называць у адпаведнасці з англійскім вымаўленнем — Лос-Анджэлес, а ў 1850 годзе (гэта здарылася за некалькі месяцаў да ўваходжання Каліфорніі ў склад ЗША ў якасці штата) Лос-Анджэлес атрымаў статус горада. У той час у ім было 1600 жыхароў. Лос-Анджэлес размешчаны на ўзбярэжжы Ціхага акіяна каля падножжа гор Сан-Габрыэль, на раўніне з пальмавымі і апельсінавымі гаямі. Гэтую раўніну, разразаючы горад, перасякае з захаду на ўсход хрыбет Санта-Моніка. Сёння Лос-Анджэлес — найбуйнейшы горад Каліфорніі і другі па колькасці насельніцтва ў ЗША (тут пражывае больш за 15 мільёнаў чалавек). Па сутнасці, Лос-Анджэлес складаецца з мноства невялікіх гарадкоў і раёнаў — ад фешэнебельных Санта-Монікі і Беверлі Хілз да недагледжаных трушчоб ва ўсходняй частцы. Гэты раён Каліфорніі характарызуецца павышанай сейсмічнай актыўнасцю, таму гмахі пабудаваны толькі ў цэнтры горада. Адлегласці ў Лос-Анджэлесе настолькі вялікія, што яго яшчэ называюць «горадам дарог». Асноўныя славутасці Лос-Анджэлеса — гэта цэнтр амерыканскай кінематаграфіі, вечная «фабрыка мрояў» Галівуд і вядомы на ўвесь свет дзіцячы парк Дыснэйлэнд.

1859 год — нарадзіўся (былы фальварак Будзькаўшчына, цяпер Полацкі раён) Браніслаў Ігнатавіч Эпімах-Шыпіла, беларускі выдавец, мовазнаўца, кандыдат гісторыка-філалагічных навук (1887), сапраўдны член Інбелкульта (1924). У 1885 годзе скончыў Пецярбургскі ўніверсітэт. З 1891-га працаваў у бібліятэцы ўніверсітэта, адначасова выкладаў у вышэйшых і сярэдніх навучальных установах Пецярбурга. З 1925-га — рэдактар, у 1927—1929 гг. — старшыня камісіі Інбелкульта па складанні слоўніка беларускай мовы. Збіраў матэрыялы па гісторыі, этнаграфіі, фальклоры Беларусі. Ініцыятар стварэння, адзін з кіраўнікоў беларускага легальнага выдавецкага таварыства «Загляне сонца і ў наша аконца» (1906—1914), студэнцкага Беларускага навукова-літаратурнага гуртка (1912—1917), Беларускага таварыства ў Петраградзе па аказанні дапамогі пацярпелым ад вайны (1916). Укладальнік рукапіснай «Беларускай хрэстаматыі», у якой сабраны асобныя творы В. Дуніна-Марцінкевіча, Я. Лучыны, У. Сыракомлі, Цёткі, Ф. Тапчэўскага і іншых. Садзейнічаў творчаму станаўленню Я. Купалы, быў рэдактарам яго першага зборніка «Жалейка», захаваў неапублікаваныя творы пецярбургскага перыяду (захоўваюцца ў Літаратурным музеі Янкі Купалы ў Мінску). Памёр у 1934 годзе.

Было сказана

Мікалай ГАЛАДЗЕД, дзяржаўны дзеяч:

«Калі мудрасць адасоблена ад любові, то яна прычыняе чалавеку боль і перастае быць мудрасцю».

НАРОДЖАНЫЯ 4 верасня

Гэта дзень вынаходніка. Таму народжаныя ў гэты дзень валодаюць яскравымі тэхнічнымі здольнасцямі, бліскуча плануюць і генерыруюць ідэі, часта прапануюць неардынарныя рашэнні разнастайных праблем. Ім важна, каб жыццё было паспяховым і прыемным. Чым бы ні займаліся па жыцці, яны першапачаткова пралічваюць усе магчымыя нечаканасці, каб з гонарам выйсці з любога становішча. Народжаныя ў гэты дзень лічаць, што ад старога неабходна адракацца, каб пракласці шлях новаму, цікаваму. Яны занадта шмат часу аддаюць працы, ускладаюць на сябе празмерна вялікую адказнасць, таму ім неабходна быць даволі асцярожнымі і крыху паслабіць разумовую дзейнасць і напружанне.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар—галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.049. Індэкс 63850. Зак. № 3545.

Нумар падпісаны ў 19.30 3 верасня 2014 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12